Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці

Кафедра філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| Мажэйка М. А._________ФИО | Варановіч І. М.________ФИО |
| «___»______________ 2018 г. | «___»__________ 2018 г. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ФІЛАСОФСКАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

для ўсіх спецыяльнасцей

Складальнік:
Белакурскі Валерый Міхайлавіч дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт

Разгледжана і зацверджана
на паседжанні Прэзідыума Навукова-метадычнага савета
(пратакол № 2 ад 23.10.2018)

Складальнік:
*В.М.Белакурскі, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*

Рецэнзенты:
*А.А.Крыштаносава, дацэнт кафедры культуралогіі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры и мастацтваў», кандыдат культуралогіі*
*Я.І.Дзмітрыеў, дэкан ФПК і П ДУА "РІВШ", кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт*

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацверджання:
*Кафедрай філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (*пратакол № ___ ад «__» _______ 2018 г.*);*

*Саветам факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці*
*(*пратакол № ___ ад «__» _______ 2018 г.*)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змест

1. Тлумачальная запіска…………………………………………………………

2. Тэарэтычны раздзел

2.1. Канспект лекцый

3. Практычны раздзел

3.1. Тэмы семінарскіх заняткаў. Пытанні да семінарскіх заняткаў

3.2. Метадычныя матэрыялы да семінарскіх заняткаў

4. Раздзел кантролю ведаў

4.1. Прыкладныя тэмы рэфератаў

4.2. Пытанні да заліку

4.3. Метадычныя парады да самастойнай працы студэнтаў……………………

5. Дапаможны раздзел

5.1. Вучэбная праграма

5.2. Вучэбна-метадычная карта для дзённай формы навучання

5.3. Вучэбна-метадычная карта для завочнай формы навучання

5.4. Спіс асноўнай літаратуры

5.5. Спіс дадатковай літаратуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

*Мэты курса:*

- аваладанне філасофскімі асновамі айчыннай культуры ў працэсе вывучэння гісторыі беларускай думкі ад часоў Кіева-Полацкай Русі да сённяшніх дзён;
- азнаямленне студэнтаў з праблемным полем і даследчыцкім апаратам філасофскай думкі Беларусі;
- перыядызацыя яе развіцця і вызначэнне месца ў кантэксце сусветнай культуры.

*Задачы курса:*

- разгледзіць генезіс нацыянальнай самасвядомасці і фарміраванне першых філасафем протабеларусаў перыяду Кіева-Полацкай Русі;
- паказаць развіццё філасофіі ў эпоху беларускага Адраджэння і Рэфармацыі;
- раскрыць асаблівасці філасофскай думкі і стан нацыянальнай самасвядомасці беларусаў у часы Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі;
- выявіць напрамкі развіцця філасофіі Беларусі ў перыяд СССР і на сучасным этапе;
- сфарміраваць у студэнтаў неабходныя кваліфікаваныя веды аб важнейшых праблемах, якія ўздымаліся ў беларускай філасофіі, аб яе месцы ў кантэксце сусветнай філасофскай думкі;
- прадставіць структуру гісторыка-філасофскіх ведаў у Беларусі;
- навучыць сучасным метадам навуковага даследавання.

Фарміраванне прадметных філасофскіх кампетэнцый здзяйсняецца ў цеснай сувязі з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта “Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін” РД РБ 02100.5.227-2006, які прадуглежвае, што ў выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны выпускнік павінен *ведаць*:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- асноўныя праблемы філасофіі, сутнасць найбольш важных філасофскіх вучэнняў;

- ключавыя ідэі і катэгорыі філасофскага аналізу;

- галоўныя падыходы да філасофскай інтэрпрэтацыі існасці;

- фундаментальныя кампаненты філасофскай тэорыі чалавека;

- базавыя каштоўнасці сучаснай культуры;

- філасофска-светапоглядныя асновы чалавечай жыццядзейнасці (у тым ліку прафесійнай);

- асноўныя характэрыстыкі пазнавальнай дзейнасці, важнейшыя філасофскія метады і рэгулятывы навуковага даследавання;

- асноўныя канцэпцыі функцыянавання і развіцця грамадства;

- сэнс і змест глабальных праблем сучаснасці, асноўныя стратэгіі і перспектывы іх вырашэння.

Студэнт павінен *умець:*

- чытаць філасофскі тэкст, аналізаваць яго, бачыць кантэкст у якім ён быў створаны і ў якім працягвае існаваць;

- фармуляваць і аргументаваць асноўныя ідэі, выпрацаваныя беларускай філасофскай думкай;

- у кантэксце філасофскіх ідэй і каштоўнасцей нацыянальнай культуры вызначаць сэнс, мэты, задачы і гуманістычныя параметры сваёй грамадскай і прафесійнай дзейнасці;

- прымяняць філасофскія ідэі і катэгорыі пад час аналізу сацыякультурных і прафесійных праблем;

- характэрызаваць выдучыя ідэі філасофскай карціны свету;

- аналізаваць розныя версіі адказаў на фундаментальныя пытанні аб сэнсе чалавечай існасці, абаснаваныя беларускімі філосафамі.

Студэнт павінен *валодаць:*

- базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

- сістэмным і параўнальным аналізам;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- міждысцыплінарным падыходам для вырашэння праблем.

*Метады выкладання*:

- гістарычны – дазваляе раскрыць гісторыю станаўлення і развіцця філасофскай думкі Беларусі ад часоў Кіева-Полацкай Русі да сённяшніх дзён;

- кампаратыўны – дапамагае супаставіць дамінуючыя дыскурсы і асобныя філасофскія канцэпцыі беларускіх мысліцеляў;

- сістэмны – накіроўвае студэнта на аналіз цэласных філасофскіх канструкцый, а таксама іх структурных элементаў.

Прадстаўленая вучэбная праграма “Станаўленне і развіццё філасофскай думкі Беларусі” накіравана на паглыбленне ведаў студэнтаў у галіне нацыянальнай філасофіі, больш пашыранае засваенне адпаведных тэм у курсах культуралогіі, гісторыі Беларусі, паліталогіі і інш., на міжпрадметнае ўзаемадзеянне ў навучальным працэсе з дысцыплінай “Філасофія”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1. Канспект лекцый

### Тэма 1.Уводзіны. Асаблівасці філасофскай культуры Беларусі

План

1. Месца філасофіі ў айчыннай культуры. Складанасці рэканструкцыі гісторыі філасофскай думкі Беларусі.
2. Філасофская думка Беларусі ў кантэксце еўрапейскай філасофіі.
3. Праблема гістарычных крыніц беларускай філасофскай думкі.

### 1.1. Месца філасофіі ў айчыннай культуры. Складанасці рэканструкцыі гісторыі філасофскай думкі Беларусі

Філасофская думка беларускага народа – адна з найважнейшых частак айчыннай культуры. У ёй знайшлі ўвасабленне творчыя пошукі беларускага народа на працягу цэлага шэрагу стагоддзяў, праявіліся своеасаблівыя рысы менталітэту, нацыянальнага характару і мыслення.

Вывучэнне беларускай нацыянальнай культуры ў дакастрычніцкі перыяд 1917 г. у значнай ступені стрымлівалася тым, што на працягу доўгага часу ў Беларусі не было філасофскіх і іншых навукова-даследчых цэнтраў, якія б маглі распрацоўваць праблемы філасофіі. У такіх умовах важнай формай развіцця грамадскай думкі стала мастацкая культура – літаратура, публіцыстыка, вусная народная творчасць і іншыя віды мастацтва.

Сістэматызаваныя навуковыя даследаванні па гісторыі філасофскага, грамадска-палітычнага і духоўнага жыцця беларускага народа пачаліся ў 20-я гады XX ст. Трэба адзначыць, што ў савецкі час было значна завужана даследчае поле беларускай культуры. Існавалі тэмы, даследаванні па якіх не заахвочваліся і нават забараняліся. Ідэалагічная ангажаванасць, вузкая метадалагічная база гісторыка-філасофскіх даследаванняў абумовілі недастатковую прадстаўленасць духоўнай спадчыны Беларусі ў еўрапейскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сусветнай культурнай прасторы, яе невыразную канцэптуальную афармленасць.

Сёння беларускія вучоныя засяродзілі ўвагу на стварэнні шматтомнай гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Вынікі, якія мяркуецца атрымаць, дапамогуць удакладніць спецыфіку гістарычнага духоўна-культурнага і сацыяльнага развіцця беларускага народа, яго гістарычны выбар на рубяжы XX-XXI ст., адпаведны не толькі сучасным патрэбам і інтэрэсам грамадства, але і далёкай стратэгічнай перспектыве.

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі актуальнымі накірункамі гісторыка-філасофскіх даследаванняў з’яўляюцца наступныя:

- выяўленне маладаследаваных або новых абласцей нацыянальнай філасофіі;
- рэкансрукцыя цэласных карцін асобных эпох;
- правядзенне параўнальных даследаванняў, а таксама спробы разгляду нацыянальнай філасофіі ў яе суадносінах з агульнаеўрапейскім кантэкстам;
- цэласныя даследаванні агульнай дынамікі развіцця нацыянальнай філасофіі;
- стварэнне абагульняючых прац па гісторыі беларускай філасофскай думкі.

## 1.2. Філасофская думка Беларусі ў кантэксце еўрапейскай філасофіі

У гісторыі беларускай культуры даволі выразна бачацца тыпы філасофскай думкі, характэрныя для развіцця ўсёй еўрапейскай філасофіі.

Міфалагічны светапогляд, дахрысціянскага перыяду вызначаецца ўніверсальным сінкрэтызмам, адінствам іманентнага і трансцэндэнтнага. У часы хрысціянізацыі Кіеўскай Русі, а пазней беларускіх зямель Вялікага княства Літоўскага, як падкрэслівае У.М. Конан, “міфы паслужылі архетыпамі сінкрэтычнай народнай культуры, якая сфарміравалася пад духоўным уплывам хрысціянства” [1, 29].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філасофія беларускага Сярэднявечча (X-XI стст.) развівалася не толькі пад уплывам Візантыі, але і заходнееўрапейскай філасофіі. Яна заявіла аб сабе як своеасаблівы хрысціянскі сінтэз Платона і Арыстоцеля з вучэннямі айцоў царквы.

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі, у яе гісторыю тэндыцыйна пачала ўключацца гісторыя Беларусі. Яна, як і расійская, стала падзяляцца на першабытны перыяд (да прыняцця хрысціянства), старажытную Русь (да канца XVII ст.) і Новую гісторыю, пачатак якой звязваўся з рэформамі Пятра I і, адпаведна, з еўрапейскім накірункам шляху развіцця Расіі. Такі падыход пярэчыў гістарычным рэаліям, бо беларускія землі ў часы Вялікага княства Літоўскага, а пазней і Рэчы Паспалітай да яе падзелаў (1772-1795 гг.), не адносіліся да еўраазіяцкай тэрыторыі, а ўваходзілі ў Цэнтральную і Заходнюю Еўропу. Заўважым таксама, што гэта расіяцэнтрысцкая пазіцыя перадалася і беларускай савецкай гісторыяграфіі. Таму для большасці даследчыкаў беларуская культура X-XVII стст. выступала як своеасаблівы варыянт старажытнарускай культуры. Толькі ў 1972 г. у манаграфіі Э.К. Дарашэвіча і У.М. Конана “Нарысы гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі” упершыню была асобна выдзелена эпоха Сярэднявечча і ў ёй акрэслены тры адносна самастойныя тыпы: народная культура, сярэднявечная пісьменнасць і сярэднявечнае прафесійнае мастацтва. У далейшых публікацыях беларускіх даследчыкаў перыядызацыя ўдакладнялася і набліжалася да агульнаеўрапейскіх гістарычных тыпаў культуры.

### 1.3. Праблема гістарычных крыніц беларускай філасофскай думкі

Да першакрыніц па гісторыі беларускай грамадска-палітычнай і філасофскай думкі можна аднесці фальклор, старажытныя летапісы, помнікі рэлігійна-палемічнай літаратуры, эпісталярную спадчыну, літаратурныя, палітычныя, філасофскія творы дзеячаў беларускай культуры розных часоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фальклорная памяць беларускага народа заяўляе аб сабе значнай глыбінёй. Гэта адзначалі шматлікія навукоўцы, якія даследавалі беларускую культуру. Шырокае ўжыванне сучаснымі вучонымі метадаў кампаратывістыкі, структурна-семіятычных метадаў аналізу фактаў традыцыйнай культуры і адпаведных фальклорных тэкстаў, яшчэ больш узмацняе гэта перакананне.

Найкаштоўнейшай крыніцай рэканструкцыі фрагментаў старажытнага светапогляду беларусаў выступае сама мова, якая ў сваім лексічным складзе дагэтуль утрымлівае сведчанні аб асаблівасцях мінулай існасці. Мова змяняецца як у выніку дзеяння у розныя эпохі ўнутрысістэмных заканамернасцей, так і ў выніку культурных уздзеянняў з боку суседніх народаў. Гэта істотная рыса мовы дала падставу Ю.М. Лотману характэрызаваць яе з семіятычнага пункту погляду як своеасаблівы “код, плюс яго гісторыя”. У адрозненне ад іншых крыніц, мова можа шмат што паведаміць пра яе колішніх носьбітаў.

Літаратурныя помнікі па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі шматмоўныя: яны створаны на царкоўнаславянскай, старабеларускай, лацінскай, польскай, рускай і беларускай мовах. Асэнсаванне гэтага велізарнага матэрыялу дазволіць новым пакаленням беларускіх навукоўцаў больш аб’ёмна прадставіць не толькі гісторыю духоўнай культуры Беларусі, але і яе найбліжэйшых суседзяў – Літвы, Украіны, Польшчы і іншых краін.

Першыя абагульняючыя працы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі з’явіліся ў 30-х гадах XX ст. З гэтымі даследаваннямі выступілі А. Луцкевіч, Ф. Турук, А. Цвікевіч. У пасляваенныя гады гісторыка-філасофская навука ўзбагацілася працамі І.М. Лушчыцкага, А.А. Біралы, А.С. Майхровіча, У.М. Конана, С.А. Падокшына, Э.К. Дарашэвіча, В.Ф. Шалькевіча і іншых аўтараў.

З 90-х гадоў XX ст. у суверэннай Беларусі разгарнулася навуковае выданне славутых помнікаў нацыянальнай духоўнай культуры. Былі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перавыдадзены “Кніга жыцій і хаджэнняў” (Мінск, 1994), “Беларускія летапісы і хронікі” (Мінск, 1997), “Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI-першая палова XVIIIстст.” (Мінск, 2003), “Старажытная беларуская літаратура XII-XVII стст.” (Мінск, 2007). Убачылі свет перавыданні творчай спадчыны Ф. Скарыны, С. Полацкага, К. Каліноўскага, а таксама факсімільныя выданні газет “Наша ніва” і “Наша доля”. У 2008г. Інстытутам філасофіі НАН Беларусі пачалося выданне фундаментальнай шматтомнай “Гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі”. Да гэтага часу выйшлі чатыры тамы, якія ахопліваюць філасофскі працэс на беларускай зямлі ад эпохі Сярэднявечча да Асветніцтва.

## Тэма 2. Філасофскія і грамадска-палітычныя погляды Сярэднявечча

План

1. Язычніцтва як рэлігійна-міфалагічны светапогляд.
2. Прыняцце хрысціянства. Розум і вера. Асаблівасці развіцця філасофскай думкі.
3. Філасофскія погляды Клімента Смаляціча і Кірылы Тураўскага.
4. Перадумовы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

### 2.1. Язычніцтва як рэлігійна-міфалагічны светапогляд

У дахрысціянскі перыяд светапогляд протабеларусаў характарызаваўся шматлікімі элементамі, найбольш важкімі з якіх былі элементы пантэізму, анімізму, антрапамарфізму, татэмізму, фетышызму. Традыцыйнаму светапогляду нашых продкаў быў уласцівы касмалагізм і міфалагізм.

Паводле сведчанняў антычных крыніц, славяне лічылі ўладаром свету аднаго бога – творцу грома і маланкі, якому прыносілі ахвяры, але аддавалі пашану і менш значным міфалагічным персанажам. Ахвяры ўскладалі таксама. духам рэк, азёр, дрэвам, камяням і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свядомасць тагачасных людзей была сінкрэтычнай і дыфузнай, мысленне характарызавалася метафарычнасцю і дамінаваннем бінарных апазіцый: белае – чорнае; мужчынскае – жаночае; правае – левае і г.д.

Язычніцтва зазнала шматлікія змены, трансфармацыі і наслаенні. Важныя звесткі аб ім даюць нам сёння этнаграфія, фальклор, народнае выяўленчае мастацтва, мова. Гэтыя звесткі дазваляюць пад наносным пластом больш позніх хрысціянскіх уяўленняў адшукаць рэшткі язычніцкага светапогляду нашых продкаў, а таксама магічна-абрадавай практыкі - святкаванне дзядоў, радаўніцы і інш. У шматлікіх паданнях і песнях, якія дайшлі да нас, з пазіцый язычніцка-міфалагічнай карціны свету тлумачыцца паходжанне аб'ектаў жывой і нежывой прыроды, грамадства, чалавека, яго прызначэння і сэнсу жыцця.

## 2.2. Прыняцце хрысціянства. Розум і вера. Асаблівасці развіцця філасофскай думкі. Еўфрасіння Полацкая

З 988 году пачынаецца хрысціянізацыя Кіева-Полацкай Русі. Першая на беларускай зямлі епархія з'явілася ў Полацку прыкладна ў 992 г. пры князе Ізяславе. Затым узнікае епархія ў Тураве, заснаваная ў 1005 г.

У большасці раннесярэднявечных дзяржаў Еўропы філасофія "імпартавалася" як гатовая форма разам з уключэннем гэтых дзяржаў у кантэкст хрысціянскай цывілізацыі. Хрысціянства выцясняла вешчуноў, чарадзеяў і іншых прадстаўнікоў дахрысціянскай традыцыі. Усталёўвалася якасна новая культура, заснаваная на хрысціянскіх канонах і прынцыпах. Кнігі Старога і Новага Запаветаў прадставілі той светапоглядны комплекс, які прыйшоў на змену язычніцка-міфалагічнаму.

Філасофскія ідэі і прыродазнаўчыя звесткі, якія змяшчаліся ў творах візантыйскіх багасловаў, сталі тым падмуркам на якім з цягам часу пачала ўсталёўвацца філасофская культура нашых продкаў. У сваю чаргу, гэтыя творы выступалі своеасаблівым транслятарам на Кіева-Полацкую глебу элементаў антычнай культуры. Візантыйскія аўтары Васілій Вялікі, Епіфаній



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кіпрскі, патрыярх Фоцій, Міхаіл Псёл добра ведалі і шмат цытавалі антычных філосафаў, выказвалі сваё стаўленне да іх поглядаў.

Пераймальнасць ідэй, ведаў, уяўленняў на Кіева-Полацкую зямлю Д. Ліхачоў і Л. Гумілёў назвалі “трансплантацыяй” – перасадкай. Гэты працэс засваення праходзіў даволі інтэнсіўна. Так, Кіеўскі мітрапаліт Іларыён у творы “Слова аб законе і міласці” (30-40 гг. XI ст.) ужо паказвае сябе сталым аўтарам у рэчышчы хрысціянскай філасофіі. Ён разгортвае велічную карціну станаўлення сусветнай гісторыі, якая прадстае як гісторыя хрысціянскай веры. Гэты працэс задуманы і зададзены Богам, задоўга да яго здзяйснення. Сама гісторыя мае чатыры стадыі: ідальская цемра; закон; хрышчэнне; будучы век. Сучасная Іларыёну рэчаіснасць ператвараецца ў своеасаблівы “залаты век”.

Полацкае княства ў другой палове XI – першай палове XII ст. было самастойным і моцным палітыка-дзяржаўным і эканамічным утварэннем. Пачатак XII ст можна назваць нараджэннем філасофіі на беларускай зямлі, бо ў духоўна культурным жыцці Полацкага і іншых беларускіх княстваў умацоўваецца хрысціянская ідэалогія. Старажытнабеларуская філасофія – гэта багаслоўская філасофія з выразнай маральнай скіраванасцю. Усе праблемы вырашаюцца ў тэалагічным рэчышчы. з выкарыстаннем ідэі вышэйшага абсалюту.

Важная роля ў дадзеным працэсе належыць *Еўфрасінні Полацкай* (каля 1100 – 1173). Звесткі дайшлі да нас, дзякуючы прысвечанаму ёй твору, створанаму пасля смерці. “Жыціе Еўфрасінні Полацкай” услаўляла самаадданае служэнне вышэйшым ідэалам, сцвярджала магчымасць дасягнення ў зямным жыцці высокіх маральных узораў. Гэта садзейнічала ўзнікненню прынцыпова новай мадэлі і формы існавання індывіда, якая несла ўніверсальны характар. У жыціі даваўся абагульнены вобраз сапраўднага чалавека з пункту гледжання хрысціянства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.3. Філасофскія погляды Клімента Смаляціча і Кірылы Тураўскага

*Клімент Смаляціч* нарадзіўся ў Смаленску у першай палове XII ст. Быў манахам кляштара ў горадзе Зарубе на смаленскай зямлі. У народзе быў празваны словам “філосаф”. Захаваўся змест толькі аднаго яго твора “Ліст да прэсвітэра Фамы”. У ім аўтар абгрунтоўвае тэзу аб неабходнасці спалучэння ў манаскім жыцці маральнага ўдасканалення шляхам паслушэнства і ўстрымання ад цялесных жарсцяў з дбайным вывучэннем Святога Пісання. Веды ён параўноўвае з агнём, які ачышчае золата ад прымешкаў. У творы К. Смаляціча няма згадак аб ірацыянальным спасціжэнні абсалюту. Яго канцэпцыя надзяляе чалавека больш значнай роляй у зямным жыцці, пашырае магчымасці розуму ў пазнанні таямніц існасці.

*Кірыла Тураўскі* (прыкладна 1130 – 1180). Удругой палове XII ст. Тураўскае княства вяло даволі актыўнае сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё. Пэўныя крыніцы сведчаць аб тым, што ў той час у Тураве жыла грэчаская князёўна, якая ўступіла ў шлюб з тураўскім князем. Магчыма ў грэчаскіх манахаў набываў веды і малады Кірыла. Выгадаваны ў манаскім асяроддзі, Кірыла не мог пазбегнуць уплыву аскетычнага светапогляду. Ён пераконаны ў тым, што пры паступленні ў кляштар чалавек павінен усведамляць тыя ахвяры, якія ён павінен будзе прынесці Богу.

Месца і роля чалавека ў сістэме ўніверсуму разглядаецца Кірылам у розных прытчах. Адна з іх пабудавана на біблейскім сужэце пра сляпога і кульгавага. Кульгавы – цела чалавека. Бо яно без душы, сляпы – чалавечая душа. У прытчы пра добрага цара і мудрага дарадчыка Тураўскі разважае аб прыродзе чалавечай свядомасці. Значнае месца ў творах Тураўскага займаюць пытанні гнасеалогіі. Ён падкрэслівае каштоўнасць ведаў, заклікае дбайна чытаць і разумець божыя кнігі. Такім чынам на гнасеалогію распаўсюджваецца прынцып падначаленасці чалавека Богу, што вызначае межы пазнання, за якія смяротнаму нельга пераступіць.

У творах Тураўскага ўпершыню ў старажытнабеларускай літаратуры актыўна выкарыстоўваецца філасофская тэрміналогія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.4. Перадумовы фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў

Нацыянальная самасвядомасць – адзін з найважнейшых кампанентаў духоўнай культуры народа. На беларускіх землях з Кіева-Полацкіх часоў паступова складваліся ўяўленні рэгіянальна-тэрытарыяльнага, палітычнага, духоўна-культурнага кшталту. Асабліва выразна гэта бачыцца ў палітычнай гісторыі Полаччыны. Самасвядомасць выяўлялася ва ўсведамленні людзьмі агульнасці іх паходжання, мовы, тэрыторыі, светапогляду, ладу жыцця, звычаяў, абрадаў і інш. Субэтнасы, якія групаваліся вакол палітычных цэнтраў, набывалі уласную, адносна незалежную самасвядомасць. Аб гэтым сведчаць летапісы. Адным з паказчыкаў этнічнай самасвядомасці таксама служаць паняцці "палачане", "тураўцы", "віцебляне", "берасцяне" і г. д. Любоў да родных мясцін (горада, вёскі, хаты) супрацьпастаўлялася пачуццю адчужанасці ў знешнім свеце ("чужая старонка – мачаха"). У беларускім фальклоры нават сёння можна сустрэць атаесамленне такіх паняццяў як "Радзіма" і "родны кут".

Барацьба за палітычную перавагу з князямі іншых земляў Кіеўскай Русі, станавілася асноўным зместам палітычнай гісторыі беларускіх княстваў. Іх імкненне да самастойнасці спрыяла ўсведамленню значнай часткай насельніцтва сваёй тэрытарыяльна-палітычнай і духоўнай адметнасці.

Важным этна – і культураўтваральным фактарам для протабеларусаў стала распаўсюджванне хрысціянства. Хрысціянская вера фарміравала імкненне спрыяць духоўна-маральнаму аб'яднанню людзей.

Такім чынам, на працягу Сярэднявечча фарміраваліся перадумовы, закладваліся характэрныя рысы і асаблівасці нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Галоўным вынікам гэтых працэсаў стала імкненне да дзяржаўнай незалежнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 3. Філасофская думка эпохі Адраджэння і Рэфармацыі

План

1. Культура Адраджэння ў Заходняй Еўропе і Беларусі.
2. Філасофска-этычныя погляды Ф. Скарыны.
3. Філасофскі скептыцызм С. Буднага.
4. Філасофска-прававыя ідэі Л. Сапегі і А. Волана.
5. Вальнадумства і тэалагічная дактрына ў Беларусі.

### 3.1. Культура Адраджэння ў Заходняй Еўропе і Беларусі

Адраджэнне XIV-XVI ст. было абумоўлена прагрэсіўнымі якаснымі зменамі ў эканамічным і сацыяльна-палітычным стане шэрагу краін Заходняй Еўропы: развіццём гарадоў і таварна-грашовых адносін, зараджэннем буржуазных элементаў, фарміраваннем нацыянальных дзяржаў і абсалютных манархій, актывізацыяй антыфеадальных рухаў і рэлігійнпй барацьбы, секулярызацыяй духоўнага жыцця грамадства. Характэрная асаблівасць Адраджэння – зварот да антычнай культуры і яе ўзораў. Імкненне “адрадзіць” антычную спадчыну было зыходным пунктам фарміравання новай, пераважна свецкай еўрапейскай культуры. Яе трывалай асновай становяцца гарады, выразнікамі – прадстаўнікі новай інтэлігенцыі (мастакі, паэты, філосафы, палітыкі, вучоныя). У іх асяроддзі фарміруецца адметны ад сярэднявечнага светапогляд, які атрымае назву рэнесансна-гуманістычнага. Новы светапогляд адлюстроўвае істотныя змены ў адносінах да Бога, прыроды, грамадства, чалавека. Аснову ўзнікаючага светапогляду складалі тры прынцыпы: вучэнне пра свабоду чалавека ў адносінах да свету, пазнання, творчасці; уяўленне пра самакаштоўнасць чалавечага жыцця (рэнесансны антрапацэнтрызм); натуралізм, як пераважны спосаб інтэрпрэтацыі прыродна-сацыяльнай рэчаіснасці.

У асобных краінах эпоха Адраджэння не супадала храналагічна і тыпалагічна. Так, у Германіі, скандынаўскіх краінах, Англіі характэрнымі праявамі Адраджэння выступалі: цесная сувязь з рэлігійнымі і нацыянальна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнымі рухамі; сувязь з Рэфармацыяй; кампраміс з сярэднявечнымі традыцыямі. Да дадзенага тыпу адносіцца і ўсходнееўрапейскае Адраджэнне (Беларусь, Літва, Украïна).

У перыяд Адраджэння адбывалася інтэнсіўнае станаўленне нацыянальнай самасвядомасці і на гэтым грунце – нацыянальнай культуры. Заяўляюць аб сабе літаратуры на родных мовах, мастацтва, архітэктура, прыродазнаўства, філасофія. Побач з развіццём новага мастацтва фарміравалася новая філасофія мастацкай творчасці – рэнесансная эстэтыка, з яе рэабілітацыяй почуццёва-цялеснай прыгажосці. Мастацкая творчасць пачала разглядацца як самастойны від дзейнасці. Мастацкае пазнанне сінтэзавалася з навуковым, даследаваліся пытанні перспектывы, прапорцыі, светаценю. Жывапіс, скульптура, графіка псіхалагічна паглыбляліся, выяўлялі жыццялюбства і грамадзянскасць асобы. У літэратуры сцвярджаўся ідэал свабоднай, усебакова развітой асобы.

Філасофія Адраджэння процістаяла схаластыцы, хоць і не парывала з сярэднявечнай традыцыяй. Вылучаліся тры лініі: этыка-гуманістычная, неаплатанічная, натурфіласофская. Да першай належылі Калуча Салутаці, ларэнца Вала, Піка дэла Мірандала, Эразм Ратэрдамскі, Францыск Скарына, Мішэль Мантэнь. Характэрныя асаблівасці гэтай лініі: цікавасць да праблем чалавека, яго прызначэння, ўнутранага свету, свабоды. Пры гэтым выкарыстоўваліся сацыяльна-этычныя ідэі памяркоўнага стаіцызму і эпікурэізму.

Для прадстаўнікоў Паўночнага Адраджэння характэрна спроба перапрацоўкі хрысціянскай этыкі (Э. Ратэрдамскі, Ф. Скарына). Развіваецца новая палітычная думка (Н. Макіявелі, Ж. Бадэн, А. Волан). У ёй гісторыя трактавалася як пераважна вынік мэтанакіраванай дзейнасці людзей. Дзяржаўная палітыка аддзялялася ад рэлігіі і нават ад маралі (Н. Макіявелі), або шчыльна звязвалася з імі (Ж. Кальвін, А. Волан).

Сацыяльна-палітычная філасофія Адраджэння зыходзіла з пераканання ў неабходнасці ўдасканалення існуючага грамадства, дзяржавы, царквы,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нораваў. Рэнесансныя ідэі адлюстроўваліся ў рэфармацыйных вучэннях, у якіх сцвярджалася суверэннасць індывідуальнай рэлігійна-маральнай свядомасці чалавека (М. Лютэр, Ф. Скарына).

У Вялікім княстве Літоўскім у XV–першай палове XVII ст. склаліся пэўныя перадумовы для развіцця культуры Адраджэння: эканамічнае і сацыяльна-палітычнае ўзмацненне гарадоў, актывізацыя магнацка-шляхецкага рэфармісцкага руху, аграрная, ваенная, судовая рэформа 50–80 гадоў XVI ст. Вынікам гэтага сталі: палітычная цэнтралізацыя, дзяржаўна-прававая стабілізацыя, узмацненне аўтарытэту дзяржавы, актывізацыя працэсу фарміравання беларускай народнасці з яе адметнай самасвядомасцю. Працягваўся гуманістычныі рэфармацыйны рух. Адбывалася інтэнсіўная секулярызацыя духоўнага жыцця грамадства, якая праяўлялася ў развіцці адукацыі, кнігадрукавання і ўзнікненні гуманістычных цэнтраў пры дварах буйных феадалаў (Радзівілы, Хадкевічы, Кішкі і інш.).

Адраджэнне ў Беларусі мела свае спецыфічныя рысы: меншая ўдзельная вага свецкага пачатку; сутыкненне ўсходніх і заходніх рэлігійна-царкоўных і духоўна-культурных тэндэнцый; станаўленне беларускай культуры ў складаных умовах поліэтнічнага і розканфесійнага дзяржаўнага ўтварэння – Вялікага княства Літоўскага, а потым Рэчы Паспалітай; наяўнасць адноснай рэлігійнай талерантнасці; узаемапранікненне рэнесанснага гуманізму і рэфармацыйных ідэй; спазненне развіцця айчыннай рэнесанснай культуры ў параўнанні з культурай Заходняй Еўропы; функцыянаванне рэнесанснай культуры Вялікага княства Літоўскага ва ўмовах каталіцкай экспансіі і контррэфармацыі (канец XVI-першая палова XVII ст.); абмежаванне ідэі індывідуальнай свабоды інтарэсамі агульнага дабра (што тлумачылася больш нізкім узроўнем раннебуржуазнага развіцця і рэлігійна-праваслаўнай саборнай традыцыяй).

Айчынны рэнесансны гуманізм часцей за ўсё прымаў форму хрысціянскага гуманізму, г. зн., светапогляду, які не парываючы з асноўнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпамі хрысціянства, імкнуўся рэвізаваць некаторыя яго традыцыйна-сярэднявечныя ўяўленні і паняцці.

У развіцці айчыннай думкі эпохі Адраджэння можна вылучыць тры перыяды:

Першы перыяд – філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі эпохі ранняга Адраджэння (1500-1550 гады. Ад Скарыны да Рэфармацыі).

Другі перыяд – сярэдзіна-канец XVI ст. Сінтэз рэфармацыйна-гуманістычнай тэорыі з сацыяльна-дзяржаўнай практыкай.

Трэці перыяд – канец XVI – першая палова XVII ст. Рацыяналізацыя і філасафізацыя рэнесансна-гуманістычнай думкі.

У галіне анталогіі, гносеалогіі і метадалогіі новыя ідэі выяўляліся пераважна ў рэлігійна-тэалагічнай форме (рэлігійны рацыяналізм С. Буднага). Існаваў і ўласна філасофскі спосаб фармулёўкі асноўных уяўленняў (С. Лован, К. Лышчынскі). Закраналіся пытанні структуры Бога, натуры Хрыста (антытрынітарыі). Вызначаліся суадносіны веры і розуму, ідэальнага і матэрыяльнага, тэалогіі і філасофіі.

Маральнае вучэнне беларускіх філосафаў было заснавана на даверы да натуры чалавека, перакананні ў магчымасці яе ўдасканалення праз індывідуальныя яго намаганні. Адраджаліся філасофска-этычныя вучэнні стоікаў, Цыцэрона, эпікурэйцаў, платонаўскае і арыстоцелеўскае вучэнні пра мараль. У рамках праблемы чалавека, яго суадносін з Богам і прыродай абмяркоўваліся праблемы шчасця і сэнсу жыцця, індывідуальнага і агульнага дабра, маральнай свабоды, выбару, адказнасці, грамадзянскага абавязку і інш. (Ф. Скарына, М. Гусоўскі, М. Літвін, А. Волан і інш.).

Асноўная праблема сацыяльна-палітычнай і прававой думкі айчыннага Адраджэння – удасканаленне грамадства і дзяржавы, сацыяльных, палітычных і юрыдычных інстытутаў (Ф. Скарына, С. Будны, Л. Сапега, А. Волан).

У беларускай грамадска-палітычнай думцы эпохі Адраджэння знайшоў адлюстраванне працэс станаўлення нацыянальнай самасвядомасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самасвядомасць секулярызуецца, гуманізуецца и рацыяналізуецца. Яе змест выражаецца ідэямі патрыятызму, свабоды,суверэнітэту, вяршэнства закону, правоў чалавека, талерантнасці, рэлігійна-царкоўнага і культурнага кампрамісу, каштоўнасці нацыянальнай культуры і роднай мовы.

## 3.2. Філасофска-этычныя погляды Ф. Скарыны

Светапогляд *Ф. Скарыны* – узор пераважна каштоўнаснага, духоўна-практычнага асваення рэчаіснасці. У ім прысутнічае даволі прыкметная філасофска-тэарэтычная тэндэнцыя, звязаная з навуковымі ўяўленнямі эпохі Адраджэння. Галоўным прынцыпам светапогляду Скарыны з'яўляецца адраджэнскі антрапацэнтрызм. Скарына значна пашырыў межы духоўна-маральнай свабоды чалавека, адстойваючы права на на адносна незалежнае тлумачэнне біблейскіх тэкстаў.Ён лічыў, што чалавек здольны дасягнуць ідэалу пры дапамозе індывідуальных намаганняў, пастуляваў неабмежнае права чалавека на пазнанне і творчасць. Мысляр сцвярджаў неабходнасць актыўных адносін чалавека да грамадскай рэальнасці. Разам з тым ідэю духоўнай свабоды Скарына не даводзіць да крайняга індывідуалізму, а суадносіць з ідэяй агульнага дабра. У якасці светапогляднай установкі вылучаецца натуралістычная тэндэнцыя. Скарына не праціпастаўляе "маральнае" і "боскае", а спрабуе іх прымірыць. Трэба асобна адзначыць дэмакратызм светапогляду Скарыны, які арыентаваны на "люд просты, паспаліты". Мысляр перакананы ў яго здольнасці далучыцца да высокіх каштоўнасцей духоўнай культуры. Вялікую ролю ў светапоглядзе Скарыны адыгрывае прынцып адзінства дабрачыннасці, прыгажосці і ісціны.

Скарына з'яўляецца выразнікам ідэалогіі прагрэсіўна настроеных гараджан Беларусі.

У цэнтры ўвагі Скарыны знаходзіцца праблема чалавека і грамадства: пытанні прызначэння чалавека, сэнсу яго жыцця, духоўнага свету, паходжання маральных ўяўленняў, духоўна-маральнай свабоды, агульнага і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

індывідуальнага дабра, грамадзянскай актыўнасці і г. д. Гэтыя праблемы разглядаюцца ў прадмовах да “Прытчаў Саламона”, “Прамудрасці Ісуса, Сына Сірахава”, “Эклесіяста” і інш.

У *прадмове* да “Прытчаў Саламона” Скарына сцвярджае, што галоўнае прадвызначэнне чалавека заключаецца ў дасканалым зямным жыцці. У каментарыях да “Эклесіяста” разважае аб розных жыццёвых пазіцыях рэальнага чалавека, звязаных з яго каштоўнаснымі арыентацыямі. Пільную ўвагу Скарыны выклікае духоўнае ўдасканаленне чалавека. Ён лічыць, што ад гэтага залежыць удасканаленне ўсяго грамадскага жыцця. Ідэалам для Скарыны з’яўляецца чалавек, які спалучае ў сабе біблейскую і філасофскую мудрасць. У яго ўяўленні “мудрасць” – гэта, галоўным чынам, веды: “Мудрость якобы моць в драгом камені, і яко злато в землі, і ядро у вореху…”. Адукацыя, культура, меркаваў ён, паказваюць чалавеку шлях да індывідуальнага і агульнага дабра.

Паходжанне маральных законаў Скарына тлумачыць дваістай асновай – індывідуальным розумам і боскім адкрыццём. Асноўны пастулат натуральнага маральнага закону фармулюецца наступным чынам: “То чініті іным всем, что самому любо ест от іных всех, і того не чініті іным всем, чего сам не хочеші от іных іметь”. Пісьмовай крыніцай маральных запаветаў, на думку Скарыны, з’яўляецца Біблія. З рэлігійна-этычнага вучэння Скарыны выцякае, што чалавек самастойна, без царкоўнага пасрэдніцтва можа разабрацца ў тэкстах Бібліі і дасягнуць маральнага ўдасканалення. Для скарынінскай этыкі характэрна сцвярджэнне прымату агульнага дабра перад індывідуальным. Толькі ў грамадстве жыццё напаўняецца сапраўдным сэнсам, таму людзі павінны навучыцца “вкупе жіті”.ідэя патрыятызму ў вучэнні Скарыны – вынік канкрэтызацыі думкі пра “агульнае дабро”.

У сваіх прадмовах да Бібліі Скарына сфармуляваў своеасаблівы ідэал нацыянальнана жыцця, падставай якога павінны быць: вера і высокая маральнасць чалавека, гуманізм у рэчышчы хрысціянскай этыкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

законапавага, чалавечая годнасць, грамадзянскасць, клопат аб роднай мове і развіцці айчыннай культуры.

Філасофска-этычныя погляды Скарыны сведчаць аб тым, што ён імкнуўся спалучыць раннехрысціянскае, евангельскае этычнае вучэнне з некаторымі ідэямі антычнай і рэнесансна-гуманістычнай этыкі. Тыпалагічна гэтыя погляды накіраваны ў рэчышча той ідэйна-філасофскай плыні эпохі Адраджэння, якая знаёма нам пад назвай "хрысціянскі гуманізм".

**3.3. Філасофскі скептыцызм С. Буднага**

Першая дакументальная звестка пра *С. Буднага* – запіс у метрыцы Кракаўскага ўніверсітэта ад 19 кастрычніка 1544 г. Нарадзіўся філосаф прыкладна ў 1530 г. Гістарычныя крыніцы сведчаць аб тым, што ў 1588 г. Будны распачынае дзейнасць у Вільні. Там ён выкладаў асновы тэалогіі ў адным з пратэстанцкіх збораў. Каля 1560 г. Будны пераехаў у Клецк. Летам 1562 г. у Нясвіжы выдаў "Катэхізіс" і свой арыгінальны твор "Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам".

Прыкладна з сярэдзіны 1563 г. Будны адмаўляецца ад дагмата Тройцы і пераходзіць на пазіцыі антытрынітарыяў. Выданы ім у Нясвіжы "Катэхізіс" на польскай мове (1563 – 1564) змяшчае раздзелы з крытыкай ідэі траістасці. Неўзабаве пасля гэтага праваслаўныя і каталіцкія дзеячы абвінавацілі яго ў сувязях са "старазапаветнікамі", вучэнне якіх было своеасаблівай мадыфікацыяй іудаізму. Каб адмежавацца развеяць папрокі, Будны бярэцца за пераклад на польскую мову раннехрысціянскага апалагета Юстына "Размовы святога Юстына, філосафа і пакутніка, з Трыфанам-жыдам", у якім выкрывалася іудзейскае вучэнне.

У 1565 г. памёр Мікалай Радзівіл Чорны. Рэфармацыйны рух Беларусі пазбавіўся сваёй галоўнай апоры. У канцы 1565 г. Будны пераязджае ў Хоўтава, куды яго запрасіла Ганна Кішчына, віцебская ваяводзіна. Будны бярэцца за ўласны пераклад Бібліі. Акрамя гэтага ён прымае актыўны ўдзел у хрысталагічных дыскусіях на пратэстанцкіх сінодах Вынікам стала з'яўленне каля 1569 г. твора "Аб зачацці Сына Божага". У чэрвені 1570 г. Будны

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

надрукаваў Брэсце брашуру на лаціне “Аб асноўных догматах веры”, а ў канцы таго ж года, у Нясвіжы выйшаў пераклад Новага запавету і апокрыфаў з прадмовай Буднага. Каля 1571 г. філосаф пераехаў у Заслаўе да менскага кашталяна Яна Глябовіча. Тут ён завяршыў працу над перакладамі кніг Старога запавету.

Плённая пара творчасці Буднага – перыяд з 1573 да 1583 г., калі ён жыў у Лоску, у доме беларускага магната Яна Кішкі. У 1574 г. Будны надрукаваў Новы запавет, а таксама прысвячэнне і “Эпіграму на герб Яна Кішкі”.

Імя Буднага набывае вядомасць не толькі ў Беларусі, але і ў Заходняй Еўропе. Аб гэтым сведчыць перапіска з англійскім гісторыкам Іаганам Фоксам. Ліст Буднага ад 4 мая 1574 г. захоўваецца ў бібліятэцы Оксфарда.

Хрысталагічныя погляды Буднага, выказаныя ў творы “Кароткі доказ таго, што Хрыстос не з’яўляецца такім жа Богам, як Бог Айцец”, крытыкавалі еўрапейскія апаненты беларускага асветніка. На іх крытыку Будны ў 1574 г. адказаў палемічным трактатам на лацінскай мове “Да аргументаў Сімлера і некаторых іншых аб дзвюх прыродах Хрыста”.

У жніўні 1576 г. Будны надрукаваў у Лоску свой найважнейшы трактат “Аб асноўных артыкулах хрысціянскай веры”, які выклікаў рэзкую крытыку з боку такіх вядомых яго апанентаў, як П. Скарга і Я Віганд.

У 70-я гады XVI ст., калі на землях Вялікага княства Літоўскага ўзнікалі вострыя дыскусіі аб прызначэнні дзяржавы, сутнасці ўрада і г. д., Будны надрукаваў твор “Абвяржэнне Чаховіца, які лічыць, ўто хрысціяніну нельга займаць дзяржаўную пасаду”. Меркаванні Буднага знайшлі падтрымку шэрагу дзеячаў Вялікага княства Літоўскага,але гэта не здолела абараніць яго ад нападкаў. У выніку Ян Кішка адмовіў яму ў падтрымцы і пазбавіў Буднага ранейшага месца ў Лоску. Але філосаф працягваў свае тэарэтычныя намаганні. У студзені 1583 г. убачыла свет яго кніга “Аб свецкай уладзе”. У канцы 80-х гг. Будны ўдзельнічаў у дыспуце з польскімі іезуітамі. Памёр асветнік у 1593 г. у мястэчку Вішнева ў доме шляхціча-пратэстанта Лявона Моклака.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць Буднага насіла выразную гуманістычную і сацыяльную накіраванасць. Будны лічыў сябе прыхільнікам дыялектыкі, спасылаючыся на Хрыста і апосталаў, якія ўжывалі дыялектычны метад. Асветнік адмоўна адносіўся да сафістыкі, паколькі быў перакананы ў тым, што яна належыць да памылковай сістэмы разважанняў. Пры правільным карыстанні ў дыялектыцы няма здрады. "Сапраўдная" дыялектыка, згодна Буднаму, заяўляе аб сабе тады, калі падмацоўваецца Словам Божым. Таму асновай для ўсялякага пазнання служыць Біблія.

Будны не прымаў антычнай філасофіі і культуры з-за іх язычніцкага зместу. Час Хрыста і апосталаў ён бачыў як сапраўдны ідэал для чалавека. Божыя законы ў параўнанні з чалавечымі асветнік лічыў больш высокімі, бо яны прадугледжваюць пакаранне не толькі за справы.але і за думкі. Разважаючы пра найвышэйшы маральны закон падкрэсліваў, што выканаць яго нават часткова не ў стане аніводны чалавек, апрача Ісуса Хрыста. Запаведзь "не забі" адносіў да вышэйшага маральнага закону. Разам з тым Будны лічыў, што хрысціянін абавязаны супрацьстаяць рабаўнікам і калі ён заб'е крыўдзіцеля,то не павінен лічыцца злачынцам і ўлады не могуць караць яго як забойцу. Прыкметна, што да дрэнных учынкаў Будны адносіў таксама ныдобрыя задумы, "плюгавыя" словы, брыдкія песні,язычніцкія пагарды і скокі, здраду мужа жонцы і наадварот. Асветнік крытыкаваў заклікі каталіцкіх і праваслаўных тэолагаў да захавання цнатлівасці, якую яны лічылі праявай служэння Хрысту.

У палітыка-прававых пытаннях Будны выступаў супраць несправядлівых войнаў. Ён падкрэсліваў непазбежнасць сацыяльнай іерархіі ў грамадстве, крытыкаваў тых падданых, якія паўставалі на са зброяй на сваіх гаспадароў, лічыў што ўсякая ўлада і ўрад паходзяць ад Бога. Прызначэнне ўсякай улады філосаф бачыў ў дасягненні дзяржаўнага спакою, захаванні правоў усіх грамадзян, абароне інтэрэсаў кожнай асобы і ўсяго грамадства. Усе прадстаўнікі ўлады, згодна перакананням Буднага, з'яўляліся божымі абраннікамі. Шляхціч а ні пры якіх абставінах не павінен паўставаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супраць улад, нават калі тыя – тыраны. Абавязак грамадзян – прасіць за сваіх урадоўцаў і гаспадароў, нават калі яны не хрысціяне. Да найвышэйшых павіннасцей хрысціянскага манарха Будны адносіў клопат пра пашырэнне хрысціянскай веры, памнажэнне хвалы Бога і яго сына Ісуса Хрыста. Ідэал найвышэйшага гаспадара – адукаваны манарх, які шмат чытае і ведае.

Будны актыўна выступаў у абарону свабоды думкі і слова. Разам з тым ён раіў шукаць грамадскай згоды, бо чалавек – галоўная каштоўнасць на зямлі. Асветнік лічыў прыроду чалавека дваістай – грэшнае цела і вечная душа. Пры гэтым ён адмаўляў актыўнае замагільнае жыццё душ. Сцвярджаў, што кожны вернік можа размаўляць з Богам без пасрэднікаў.

### 3.4. Філасофска-прававыя ідэі Л. Сапегі і А. Волана

Першым з роду Сапегаў, чыё імя зафіксавана ў актах і хроніках – Сямён Сапега – пісар караля Казіміра Ягелончыка, які жыў у першай палове XV ст.

Нарадзіўся *Леў Сапега* ў Астроўні (сёння Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці). У дзіцячым узросце ён быў узяты на выхаванне ў сям’ю Мікалая Радзівіла Чорнага. Вучыўся ў Нясвіжы ў пратэстанцкай школе. Калі яму споўнілася 13-ць год, быў адпраўлены на вучобу ў Лейпцыгскі ўніверсітэт. У 1580 г. прызначаецца на пасаду сакратара Вялікага княства Літоўскага, а ў 1586 г. становіцца падканцлерам.

Сапега актыўна працуе па ўмацаванню палітычнай і эканамічнай незалежнасці Вялікага княства Літоўскага. Вынікам гэтага стала адмена некаторых рашэнняў Люблінскай уніі (1569), якая дазволіла Вялікаму княству Літоўскаму праводзіць свае сеймы, мець свой асобны Статут, адпаведна якому вялося судовае справаводства. Усё гэта ператварала Рэч Паспалітую ў канфедэратыўную дзяржаву.

Асноўная ідэя Статута – ідэя вяршэнства закону. Статут змяшчаў акт Варшаўскай канфедэрацыі аб свабодзе ўсіх хрысціянскіх веравызнанняў Рэчы Паспалітай. У 1588 г. Сапега пад уплывам П. Скаргі пераходзіць у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каталіцызм, пакінуўшы пратэстантызм. У красавіку 1589 г. прызначаецца каралём Рэчы Паспалітай на пасаду канцлера Вялікага княства Літоўскага.

Сапега з'яўляўся прадстаўніком памяркоўна-гуманістычнай плыні айчыннай думкі. Лічыў, што асноўная задача кожнага грамадства – гарантаваць чалавеку бяспечнае матэрыяльнае і духоўнае жыццё, абарону маёмасці згодна з саслоўным статусам. Гэта магчыма там, дзе ўсё падпарадкоўваецца закону. Дадзеная ідэя з'яўляецца вызначальнай ў трох прадмовах Сапегі да Статутаў (хоць пад першай і стаіць подпіс караля). Кароль у ёй публічна заяўляе, што лічыць сваім абавязкам права вольнасці і свабоды не толькі не парушаць, але і прымнажаць. У другой прадмове выкладзена канцэпцыя прававой дзяржавы. Шчаслівае і цывілізаванае жыццё, лічыць ён, магчыма толькі на аснове законапраўя. Так, разбурэнне правапарадку старажытнарымскай рэспублікі выклікала яе пагібель. Трэцяя прадмова Статута 1588 г. прысвячаецца не толькі магнатам і шляхце, але і "люду простаму, паспалітаму". Аўтар адзначае, што нічога не можа быць даражэй свабоды. Таму аберагаючы яе людзі не шкадавалі не толькі маёмасці, але і ўласнага жыцця. Толькі там, дзе вяршэнствуе права, захоўваецца годнасць, бяспека, маёмасць і наогул свабода чалавека. Сапега таксама ставіць праблему правасвядомасці чалавека. Сорамна не ведаць сваіх законаў, падкрэслівае ён, "бо не іншым якім, а сваім власным языком яны напісаны".

У пісьме да ўніяцкага архіепіскапа І. Кунцэвіча Сапега сцвярджаў, што свабодны рэлігійны выбар з'яўляецца неад'емным правам кожнага чалавека. Рэлігійная ж талерантнасць ёсць падмурак усякага цывілізаванага грамадства. У грамадстве павінны быць строга акрэслены кампетэнцыі свецкай і духоўнай улады. Прыярытэт павінен належыць свецкай уладзе. Царква як рэлігійна-ідэалагічная ўстанова падпарадкоўвае сваю дзейнасць больш высокім мэтам грамадства – інтарэсам агульнага дабра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глыбокія ідэі Льва Сапегі апярэджвалі *свой* час і рабілі гонар беларускай філасофскай і грамадска-палітычнай думцы. Яны з'яўляліся яскравым сведчаннем прынцыпова новага мыслення ў нашай айчыне.

*Андрэй Волан* (1530 – 1610) адукацыю атрымаў ва ўніверсітэтах Франкфурта на Одэры і Кёнісберга. Быў сакратаром Вялікага княства Літоўскага і караля Польшчы Жыгімонта ІІ Аўгуста. У творах Волана выразна адлюстравана ідэя прававой дзяржавы. Яна заключаецца ў разуменні свабоды чалавека, як пераважна свабоды прававой. Асноўным яе зместам з'яўляецца абарона асабістых і маёмасных правоў, як гарантаваных законам. Волан быў выразнікам поглядаў той часткі адукаванай і гуманістычна настроенай шляхты, якая турбавалася аб інтарэсах грамадства. Галоўным яго творам з'яўляецца трактат "Аб палітычнай або грамадзянскай свабодзе" (1572). Сацыяльна-палітычныя ідэі выкладзены аўтарам у творы "Аб гасудары і яго асабістых дабрачыннасцях".

Згодна Волану, мэта ўсякага грамадства заключаецца ў тым, каб людзі, пазбаўленыя ад грамадзянскага разладу і вольныя ад страху перад ворагам маглі весці вольнае і спакойнае жыццё. Свабода больш за ўсё адпавядае чалавечай прыродзе. Яна – неабходная перадумова развіцця разумовых і фізічных намаганняў чалавека, яго грамадзянскай актыўнасці, маральных дабрачыннасцей, навук і мастацтваў. Самая вялікая пагроза свабодзе зыходзіць ад самога чалавека, яго "фанабэрыстасці і дзікай разбэшчанай пажадлівасці". Грамадская справядлівасць ва ўяўленні Волана – справядлівасць дыстрыбутыўная, г. зн., не адзіная для ўсіх сацыяльных груп, а размеркаваная ў залежнасці ад саслоўна-класавага становішча таго ці іншага слоя грамадства. Справядлівасць, якую Волан называў камутатыўнай, не змяняе свайго зместу ў залежнасці ад сацыяльнага дастатку, аднолькавая для ўсіх саслоўяў і класаў грамадства – гэта справядлівасць прававая. Палітычным ідэалам Волана выступае манархія, якая кіруе і правіць з дапамогай законаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэне Андрэя Волана было істотным дасягненнем умерана-гуманістычнай думкі Беларусі. Цэлы шэраг праблем, якія вылучаліся яго папярэднікамі, у Волана атрымалі аргументаванае выражэнне ў духу вядучых філасофскіх тэндэнцый эпохі Адраджэння.

### 3.5. Вальнадумства і тэалагічная дактрына ў Беларусі

Ужо ў творчасці Скарыны, як дзеяча на мяжы культур Сярэднявечча і Адраджэння спалучаюцца хрысціянскі традыцыянілізм і вальнадумскі мадэрнізм. Біблія Скарыны – першае ў айчыннай культуры свецкае выданне Святога пісання, ажыццёўленае, як адзначаюць даследчыкі, без аглядкі на царкоўную цэнзуру. Скарына дапускаў шматлікія “вольнасці”: адыходзіў ад кананічнага парадку біблейскіх кніг, па-гуманістычнаму тлумачыў біблейскія сюжэты, вольна абыходзіўся з тэкстам, прапускаючы ці перастаўляючы цэлыя фрагменты. Ужо ў XVI ст. царкоўныя артадоксы абвінавачвалі яго ў “ерытызме”. Прыхільнік кансерватыўнай царкоўна-славянскай традыцыі А. Курбскі бачыў у перакладах Скарыны уплыў ерасі “жыдоўствуючых” і лютэранства.

У пачатку XV ст. на тэрыторыю Беларусі пранікаюць ідэі Я. Гуса, які таксама дазваляў сабе вольную трактоўку Святога Пісання. Чэшскі рэфарматар меркаваў, што кожны вернік мае права на ўласнае разуменне Бібліі. У Скарыны і Гуса можна знайсці вельмі блізкія па духу ідэі – пра значэнне роднай мовы ў асвеце народа, пра магчымасць самастойнага вывучэння Бібліі.

Асабліва ярка вальнадумства Скарыны праяўляецца пры супрацьпастаўленні дзвюх Біблій – беларускага першадрукара і нямецкага пратэстанта М, Лютэра. Як вядома, Лютэр хацеў абнавіць каталіцкую дактрыну з мэтай прыстасавання хрысціянства да новых запатрабаванняў буржуазнага ладу жыцця. Згодна айчынным даследчыкам, матывы Скарыны былі і рэлігійнымі і свецкімі адначасова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вальнадумства ў грамадска-філасофскай думцы беларускага народа ранняга Рэнесансу атрымала адлюстраванне ў творчасці сучасніка Скарыны – *М. Гусоўскага.* У славутай паэме "Песня пра зубра" аўтар разыходзіцца *з* рэлігійнай артадоксіяй ў разуменні прыроды. Важным прадстае яе спазнанне, дзе прыроднае асяроддзе з'яўляецца не толькі боскай, але эстэтычнай і гаспадарча-эканамічнай каштоўнасцю. Гусоўскі не прымае рэлігійнага фанатызму, пратэстуе таксама супраць сярэднявечных забабонаў, існуючых у народнай свядомасці.

Матэрыялістычна-атэістычны кірунак у беларускай рэнесансна-гуманістычнай думцы XVI ст. быў прадстаўлены *Стэфанам Лованам* і *Каспарам Бекешам*. Ідэйнымі крыніцамі гэтага кірунку з'явіліся айчынная натуралістычная традыцыя, матэрыялістычныя і атэістычныя ідэі эпохі Адраджэння, якія прыйшлі ў Беларусь з Заходней Еўропы.

Беларускі філосаф-эпікурэец С. Лован лічыў, што не існуе іншай існасці, акрамя матэрыяльнага свету, таму адмаўляў боскае ўмяшанне ў чалавечае жыццё. Ён таксама аспрэчваў існаванне душы, сцвярджаў, што няма ні раю, ні пекла. У 1591 г. Лован быў выкліканы каралём Рэчы Паспалітай Жыгімонтам III на суд галоўнага трыбунала ў сувязі з узнікшым прэцэдэнтам. Сутнасць апошняга заключалася ў тым, што судовую пасаду (Лован быў земскім суддзёй Мазырскага павета) мог займаць толькі чалавек хрысціянскага веравызнання. Даследчыкі мяркуюць, што Лована не толькі не прыцягнулі да адказнасці, але і пакінулі на ранейшай пасадзе, паколькі атэістычныя погляды ў XVI ст. яшчэ не лічыліся крыміналам.

Сваім светапоглядам далучаўся да Лована і гародзенскі атэіст Каспар Бекеш (1520-1579). Ён адмаўляў існаванне Бога і неўміручасць душы, лічыў, што душа памірае разам з целам.

*Казімір Лышчынскі* (1634-1689), адукацыю атрымаў у Бярэсці ў іезуіцкім кляштары.Затым працягваў вучобу ў Кракаве і Вільні. Шляхта Берасцейскага ваяводства неаднаразова выбірала яго дэпутатам на Варшаўскі сейм, а кароль Ян III Сабескі назначыў на пасаду падсудка Берасцейскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лышчынскі напісаў на лацінскай мове твор “Аб неіснаванні Бога”. У ім ён сабраў доказы тэолагаў і паслядоўна іх абвяргаў. Праца займала 530 старонак. Лышчынскі адмаўляў акт тварэння свету Богам, прызнаваў бясконцай матэрыю, абвяргаў замагільнае жыццё і бессмяротнасць душы. Зрабіў высновы, што рэлігія прыдумана людзьмі няверуючымі, каб ім прыносілі пашану. Рэлігійная вера, падкрэсліваў Лышчынскі, ўведзена бязбожнікамі. Страх божы царкоўнікі ўнушаюць дзеля таго, каб іх баяліся. Вера, якую лічаць свяшчэннай – гэта гісторыя чалавецтва.

Па даносе былога таварыша па вучобе ў іезуіцкім кляштары, які пазычыў у Лышчыскага сто тысяч талераў, ён быў абвінавачаны ў атэізме і адлучаны ад царквы. Суд прыгаварыў яго да спалення на кастры. Але кароль Рэчы Паспалітай аказаў сваю “міласць”, адправіўшы ў беларускага філосафа-матэрыяліста ў бессмяроцце праз адсячэнне галавы. Пакаранне адбылося 30 сакавіка 1689 г. у Варшаве на плошчы Стары рынак.

Хаця Лышчынскага можна аднесці да ліку першых атэістаў Новага часу, несумненнай з’яўляецца сувязь яго светапогляду з ідэалогіяй Рэнесансу.

## Тэма 4. Філасофскія ідэі эпохі Новага часу ў Беларусі (XVII – сярэдзіна XVIII ст.)

План

1. Распаўсюджванне новаеўрапейскай філасофіі. Асноўныя тэндэнцыі ў беларускай філасофскай думцы (Л. Зізаній, А. Белабоцкі, С. Полацкі).
2. Капернікіянства ў Беларусі.
3. Эклектычная філасофія. Вучэнні А. Скарульскага і С. Шадурскага.
4. Філасофскія погляды Б. Дабшэвіча.
5. Вучэнне Г. Каніскага.

### 4.1. Распаўсюджванне новаеўрапейскай філасофіі. Асноўныя тэндэнцыі ў беларускай філасофскай думцы (Л. Зізаній, А. Белабоцкі, С. Полацкі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распаўсюджванне ў ўсталяванне ідэй заходнееўрапейскай філасофіі Новага часу ў Беларусі – даволі доўгі і складаны працэс. На працягу XVII – першай паловы XVIII ст. творы філосафаў і вучоных Заходняй Еўропы эпохі Новага часу сустракалі насцярожанасць і варожасць з боку каталіцкай царквы, якая кантралявала духоўнае жыццё грамадства. У схаластычнай філасофіі, якая ў Беларусі была афіцыйнай амаль да канца XVIII ст., таксама адбываўся працэс унутранай барацьбы новага са старым.

Прагрэс еўрапейскай навукі, XVI – XVII ст., гуманістычны і рэфармацыйны рух, распаўсюджванне рацыяналістычных ідэй падрывалі хрысціянскае веравучэнне і схаластычную філасофію, узнімалі прэстыж свецкіх ведаў, падводзілі мысліцеляў Беларусі да пераканання аб неабходнасці вызвалення навукі і філасофіі ад тэалогіі. Адным з такіх мысліцеляў быў *Лаўрэнцій Зізаній* (Тустаноўскі). Ён выходзіў з праваслаўнай шляхетскай сям'і. Скончыў астрожскую школу, а потым выкладаў у львоўскай, берасцейскай і віленскай брацкіх школах. Пасля 1595 г. быў дамашнім настаўнікам у сем'ях князёў Аляксандра Астрожскага і Якіма Карэцкага. У 1618 г. Зізаній пераехаў у Кіева-Пячэрскую Лаўру, дзе выкладаў, пісаў кнігі, перакладаў з грэчаскай мовы на беларускую сачыненні візантыйскіх хрысціянскіх багасловаў і філосафаў. На працягу 1620-1623 гг. Зізаній працаваў над "Катэхізісам", дзе змясціў не толькі асновы праваслаўнага веравучэння, але і звесткі аб астраноміі, гісторыі, геаграфіі і іншых свецкіх навуках. Ёсць сведчанні, што "Катэхізіс" абмяркоўваўся з удзелам аўтара маскоўскімі багасловамі і быў прызнаны ерэтычным. Памёр Зізаній ў канцы 30-х гг. XVII ст.

У светапоглядзе Зізанія прысутнічалі элементы рацыяналізму і матэрыялізму. Ён не прызнаваў троіцы, лічыў, што цела і дух павінны знаходзіцца ў непарыўным адзінстве. Смерць цела выклікае гібель духа.

Абгрунтоўваючы ідэю аб свабодзе волі, мысліцель сцвярджаў, што чалавек сваім самаўладдзем цягнецца як да дабрых, так і да злых учынкаў. Згодна Зізанію, чалавек сам гаспадар свайго лёсу, ад яго волі і розуму



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

залежыць і яго жыццёвы шлях. Вельмі высока Зізаній ацэньваў ролю свецкіх ведаў, таму ў “Катэхізіс” уключыў мноства звестак навуковага характару. У “Лексісе” (слоўніку) змясціў звесткі па філасофіі, гісторыі, геаграфіі, медыцыне, матэматыцы. “Лексіс” уваходзіў у “Азбуку”, якая была выдадзена ў 1596 г. Аўтар імкнуўся стварыць беларускую філасофскую тэрміналогію на аснове перакладу паняццяў з грэчаскай мовы: філасофія – мудрасць; ісціна – праўда; існасць – бытнасць і г.д. Ідэя Зізанія аб праве навукі на самастойнае існаванне атрымала далейшае развіццё ў філасофскіх працах іншых беларускіх мысліцеляў.

На больш высокім узроўні яе абгрунтаваў у другой палове XVII ст. *Ян Белабоцкі*. Ён скончыў каталіцкую школу ў Слуцку, а затым некалькі год вучыўся за мяжой (Францыя, Італія, Іспанія). Пасля вяртання служыў прапаведнікам у Слуцку, потым выкладаў у Магілёве. Ратуючыся ад іезуітаў, пераехаў у Маскву і прыняў праваслаўе. Там ім выдадзены “Краткая беседа милости со истиною» (1685), «Риторика» (1690), «Великая наука Раймонда Люллия» і «Книга философская» (1698-1699).

Асновай філасофскай канцэпцыі Белабоцкага было вучэнне аб прыродзе, якая існуе вечна як і Бог. Тэалогія – “боская мудрасць” з’яўляецца недаступнай розуму чалавека, таму яе палажэнні павінны прымацца на веру. У філасофіі магчымасці чалавечага розуму нічым не стрымліваюцца, філосаф мае права сумнявацца нават у існаванні Бога. Напрыклад, з пункту погляду розуму нельга пагадзіцца з тым, што Бог стварыў навакольны свет. Такім чынам, абараняючы права філасофіі на самастойнае існаванне, Белабоцкі ставіў яе вышэй тэалогіі. Тлумачылася гэта тым, што філасофія мае сваім падмуркам дадзеныя навукі, а не веры. Апошнюю ён лічыў асабістай справай кожнага чалавека, таму няма а ніякай неабходнасці ў афіцыйнай царкве і святарах. У пытанні паходжання Ісуса Хрыста прытрымліваўся натуралістычнай канцэпцыі Буднага.

У светапоглядзе Белабоцкага вельмі бачна адлюстраваўся працэс вызвалення філасофіі і навукі ад улады тэалогіі. Гэта сведчыць аб тым, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь не стаяла ў баку ад таго шляху, па якому ішла прагрэсіўная еўрапейская думка.

*Сімяон Полацкі* (1626-1680) – філосаф, асветнік, педагог, тэолаг, грамадскі і царкоўны дзеяч. Пачатковую адукацыю атрымаў у родным Полацку, потым набываў веды ў Кіева-Магілянскай школе і Віленскай іезуіцкай акадэміі. Вучоба прыйшлася на першую палову 1650-х гадоў. Пасля 1656 г. вярнуўся ў Полацк, прыняў праваслаўнае манаства і настаўнічаў у брацкай школе пры Багаяўленскім манастыры. У ліпені 1656 г. ён шчыра вітаў маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча вершамі, праслаўляючымі "вызваліцеля беларускай зямлі". Зімой 1664 г. Полацкі прыняў запрашэнне пераехаць у Маскву.

Філасофскія погляды Полацкага грунтаваліся на хрысціянскіх каштоўнасцях. Размяжоўваючы рэлігію і навуку асветнік імкнуўся да кампрамісу паміж імі. У цэнтры ўвагі мысліцеля была праблема чалавека, яго маральнага аблічча. Духоўныя каштоўнасці Полацкі ставіў вышэй за матэрыяльныя. Крыніцай духоўнага выступаў Бог.

У светапоглядзе Полацкага, як паказваюць даследчыкі, сумяшчаліся сярэднявечны маральны рыгарызм і рэнесансавы эстэтызм, энцыклапедычная вучонасць гуманіста і еўрапейская неасхаластычная філасофія. Традыцыйная для беларусаў арыентацыя на прыярытэт агульнанародных інтарэсаў дапаўнялася напружаным перажываннем каштоўнасці чалавечай асобы. Наяўнасць у яго спадчыне шматлікіх фрагментаў антычнай культуры і натурфіласофскіх ведаў збліжаюць Полацкага з дзеячамі заходнееўрапейскага Рэнесансу.

Разам з тым рэлігійная паэзія Полацкага сведчыць аб яго артадаксальнай пазіцыі ў дачыненні да хрысціянскіх дагматаў і праблемы суадносін Бога і чалавека.

Філасофію як навуку Полацкі падзяляў на "разуміцельную" (логіку), "натуральную" (прыродазнаўства) і "маральную" (этыка). У поглядах на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сусвет прытрымліваўся геацэнтрычнай сістэмы Арыстоцеля і Пталамея, пры тым, што быў знаёмы з тэорыяй Каперніка.

У творчасці Полацкага важнае месца займалі праблемы эстэтыкі. Крыніцамі яго эстэтычных поглядаў былі раннехрысціянская літаратура, антычная культура, фальклор. Полацкі адрозніваў вонкавую матэрыяльную красу і духоўную прыгажосць. Пачуццёвая прыгажосць бывае вонкавым адлюстраваннем духоўнай. Але яна можа сведчыць не пра свет божы, а д’ябальскі. Тады яна пераходзіць у сваю процілегласць – скараднасць (агіднае) і мерзасць (нізкае). У пагоні за прыгажосцю рэчаў людзі часта трацяць прыгажосць духоўную. Перамагаецца агіднае, як і ўвесь злы пачатак, толькі любоўю – найвышэйшай маральнай прыгажосцю. Трагічнае ў жыцці чалавека Полацкі тлумачыў як духоўнае адраджэнне і выратаванне праз пакуты і смерць. Трагічнае пераадольваецца верай у немінучае ўваскрасенне і вечнае жыццё.

### 4.2. Капернікіянства ў Беларусі

У 40-60 гг.XVIII ст. у сацыяльна-эканамічным жыцці Рэчы Паспалітай Заяўляюць аб сабе пачаткі капіталістычнага ўкладу. Ажываюць рамёствы, гандаль, расце насельніцтва гарадоў, павялічваецца ўнутраны рынак. У мануфактурнай вытворчасці пашыраецца прымяненне наёмнай працы. Усё гэта стварала ўмовы для далейшага развіцця навуковага і культурнага жыцця. Згодна даследчыкам, сярэдзіна XVIII ст. – пачатковы этап пераходу Беларусі ад феадалізму да буржуазных капіталістычных адносін. Але паколькі клас буржуазіі толькі нараджаўся, выразнікамі антыфеадальных ідэй сталі прадстаўнікі перадавых колаў шляхты. Працэс фарміравання новага светапогляду працякаў у барацьбе з тэалагічнымі, схаластычнымі і містычнымі ўяўленнямі. Аднак схаласты, якія карысталіся падтрымкай каталіцкай царквы, аказалі гэтаму працэсу моцнае супраціўленне. Барацьба паміж новай навукай і тэалогіяй разгарнулася вакол праблем геліяцэнтрызму. Выкладчыкі вучэбных устаноў каталіцкай царквы геліяцэнтрызм асуджалі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’яўлялі, што ён пярэчыць “Свяшчэннаму пісанню”.Але ў 60-я гг. XVIII ст. у навуковай і вучэбнай літаратуры ўсё больш часцей сустракюцца станоўчыя водзывы аб М. Каперніку-вучоным. Такім шляхам царкоўнікі хацелі прадставіць яго адкрыццё як нейкую навуковую абстракцыю, якая не мае вялікага светапогляднага значэння. Віленскія іезуіты нават настойвалі, што вучэнне Каперніка можна разглядаць як гіпотэзу, зручную для астранамічных назіранняў і падлікаў, а пытанне аб кругавароце Зямлі вакол Сонца з’яўляецца не столькі фізічным і астранамічным, колькі філасофскім. Усё гэта сведчыла аб тым, што ў навуцы і філасофіі Беларусі ствараліся прадпасылкі для канчатковай перамогі капернікіянства. У шэрагу вучэбных устаноў узнікаюць фізічныя кабінеты і праводзяцца вопыты. Імёны прадстаўнікоў прыродазнаўства (Дэкарта, Ньютана і інш.) становяцца вядомымі не толькі ў Вільні, але і ў іншых гарадах Беларусі. У 1755 г. была адкрыта Віленская астранамічная абсерваторыя, пачаліся сістэматычныя назіранні. Негледзячы на супраціўленне каталіцкай царквы, з сярэдзіны XVIII ст. у Беларусі пачынаецца станаўленне навукі Новага часу. Ідзе далейшае разлажэнне схаластыкі і замена яе эклектычнай філасофіяй. Даволі папулярнай у навучальных установах становіцца філасофія Х. Вольфа. Нямецкі мысліцель эклектычна злучаў некаторыя прынцыпы механістычнага матэрыялізму з тэлеалагізмам. Ён тлумачыў усеагульную сувязь і гармонію існага дзейнасцю Бога і пры гэтым адстойваў неадольнасць навуковых ведаў. У гістарычных умовах Беларусі вучэнне Вольфа садзейнічала аддзяленню філасофіі ад тэалогіі і афармленню яе ў самастойнае адгалінаванне ведаў.

### 4.3. Эклектычная філасофія. Вучэнні А. Скарульскага і С.Шадурскага

У працэсе таго, як размывалася схаластыка, паступова заяўляла аб сабе эклектычная філасофія. Яна ўяўляла сабой механістычнае злучэнне схаластычных поглядаў з рацыяналістычнымі ідэямі заходнееўрапейскай філасофіі. Тым не менш, яе ўзнікненне было значным крокам наперад у развіцці беларускай філасофскай думкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Антон Скарульскі* (1715–1780) – адзін з першых прадстаўнікоў эклектычнай філасофіі ў Беларусі. Атрымаў адукацыю ў Вільні, затым выкладаў філасофію ў Слуцку, Нясвіжы і іншых беларускіх гарадах. У 1772 годзе ўзначаліў Віленскую акадэмію. Выдаў у Вільні свой адзіны твор “Каментарыі па філасофіі”, які лічыўся падручнікам.

У вырашэнні светапоглядных праблем Скарульскі зыходзіў з неабходнасці ўзгаднення дасягненняў філасофіі і навукі Новага часу з тэалагічнымі догмамі і схаластычнымі пабудовамі. Ён імкнуўся нават мадэрнізаваць некаторыя палажэнні сярэднявечнага арыстоцелізму. У “Каментарыях па філасофіі” Скарульскі крытыкаваў вучэнне Ньютана, супрацьпастаўляючы яму канцэпцыю абсалютнай субстанцыйнай формы Арыстоцеля. Шмат хібаў ён знаходзіў і ў геліяцэнтрычнай сістэме Каперніка, сцвярджаючы, што яна супярэчыць як фізічным аргументам, так і “Святому пісанню”. Эклектыцызм Скарульскага найбольш выразна праявіўся ў пытанні аб крытэрыі ісціны. Так, да дэкартаўскіх рацыяналістычных прынцыпаў выразнасці і дакладнасці ён дадаваў сенсуалістычнае палажэнне аб ролі пачуццяў у дасягненні выразнасці і дакладнасці пазнання, а таксама аўтарытэт Бога. У “Каментарыях па філасофіі” аўтарам было зроблена шмат крытычных заўваг па тэорыі прыроджаных ідэй і інтуітыўнага пазнання. Сусвет для Скарульскага – вынік тварэння Бога. Існаванне цел ён тлумачыў як узаемадзеянне матэрыі і формы. Праблему душы і цела спрабаваў вырашаць на аснове дэкартаўскага дуалізму.

Значна далей адыйшоў ад схаластыкі *Станіслаў Шадурскі* (1727-1789). Адукацыю атрымаў у езуіцкіх калегіумах Вільні і Оршы. У 1752 г. паступіў у Віленскі ўніверсітэт і неўзабаве быў накіраваны працягваць адукацыю ў Парыж. У калегіуме Людовіка Вялікага вывучаў філасофію, прыродазнаўства і матэматыку. Пасля вяртання на радзіму, выкладаў філасофію ў Варшаўскім шляхецкім калегіуме, а з 1759 г. у Навагрудку. Менавіта там ім былі напісаны найбольш значныя філасофскія творы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтар лічыў, што ў тэорыі пазнання неабходна гарманічна спалучаць рацыяналізм і эмпірызм. Асноўным крытэрыем ісціны павінна выступаць відавочнасць, не адмаўляючы пры гэтым гістарычнага сведчання і рэлігійнай веры.

Чалавек у працах Шадурскага прадстае як псіхафізічная істота, спалучэнне матэрыі і духу. Разыходзячыся з Дэкартам па некаторым пытанням, ён быў згодны з асноўнымі прынцыпамі яго матэрыялістычнай фізікі, а таксама ідэалістычнай і дуалістычнай метафізікі. Падзяляў пункт погляду Дэкарта пра існаванне дзвюх субстанцый – матэрыяльнай і духоўнай, адначасова спрабаваў аб'яднаць вучэнне Дэкарта аб прыроджаных ідэях са схаластычным палажэннем аб інтэлектуальным пазнанні.

Зыходзячы з пазіцый эклектыцызму, Шадурскі лічыў магчымым карыстацца рознымі філасофскімі сістэмамі, запазычваючы з іх толькі тое, што ўяўлялася яму дакладным і не выклікала сумнення.

Беларускі філосаф не падзяляў атамізму Эпікура, а таксама яго ідэалістычную інтэрпрэтацыю ў вучэнні Лейбніца аб манадах. Выступаў супраць пантэізму і атэізму. Спецыяльна спыняўся на доказах існавання Бога, нават спрабаваў вытлумачыць рэлігійныя дагматы з дапамогай законаў ньютанавай механікі.

## 4.4. Філасофскія погляды Б. Дабшэвіча

*Бенедыкт Дабшэвіч* (1722-1794) – буйнейшы прадстаўнік эклектычна й філасофіі ў Беларусі. Нарадзіўся каля Навагрудка. Адукацыю атрымаў у Навагрудскай калегіі і Віленскай духоўнай акадэміі, у якіх пазней выкладаў тэалогію і філасофію. Галоўная праца Дабшэвіча "Погляды новых філосафаў" фактычна складаецца з лекцый, якія ён чытаў у Навагрудскім іезуіцкім калегіуме.

Светапогляд Дабшэвіча рэлігійна-ідэалістычны, разам з тым ён пашыраў на Беларусі прыродазнаўства і рэлігійнае асветніцтва. Ордэн

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іезуітаў амаль да 60-х гадоўXVIII ст. не прызнаваў філасофіі Новага часу, таму лекцыі Дабшэвіча ўяўлялі пэўную апазіцыю і наватарства.

Сістэма філасофіі Дабшэвіча будавалася аснове картэзіянства. Ён асэнсоўваў філасофскі метад як функцыю розуму, з дапамогай якой паняцці, меркаванні і разважанні зводзяцца ў ясныя і пэўныя правілы, якія раскрываюць або дапамагаюць выяўляць ісціны.

Метафізіку беларускі філосаф традыцыйна падзяляў на анталогію, этыялогію (вучэнне аб прычыннасці), натуральную тэалогію, псіхалогію і касмалогію. Душу разглядаў як духоўную субстанцыю, звязаную з Богам, а таксама целам і нервамі чалавека. Прызнаваў прыроджаныя здольнасці апошняга і адначасова схіляўся да сенсуалізму Джона Лока.

У касмалогіі, разглядаў розныя сістэмы будовы свету, але спецыяльна вылучаў геліяцэнтрычную сістэму Каперніка. Лічыў яе верагоднай гіпотэзай, якую нельга прымаць за абсалютную ісціну.

У агульнай фізіцы асэнсоўваў праблему рэальнага існавання рэчаў, крытыкуючы пры гэтым суб’ектыўны ідэалізм Джоржа Берклі. Філосаф не адкідваў арыстоцелеўскіх паняццыў (форма, змест і інш.), спрабуючы іх рэфармаваць шляхам далучэння новых(фізічная прырода, механічная форма і інш.). Такім чынам, у эклектычнай філасофіі Дабшэвіча адлюстраваліся імкненні натураліста-даследчыка і тэолага-прафесіянала.

**4.5. Вучэнне Г. Каніскага**

Ідэі філасофіі Новага часу ў пэўнай ступені адлюстраваны ў творчасці *Георгія Каніскага* (1717-1795). Нарадзіўся ў г. Нежын. Адукацыю атрымаў у Кіева-магілянскай акадэміі, якую затым узначаліў у 1751 г. У 1755 г. прызначаецца беларускім епіскапам і пераязджае ў Магілёў.

На беларускай зямлі Каніскі распаўсюджваў ідэі Кіева-Магілянскіх асветнікаў, выступаў супраць Ватыкана і Брэсцкай уніі, прапагандаваў ідэю аб’яднання трох брацкіх народаў. У 1757 г. адкрыў у Магілёве вучылішча па ўзору Кіеўскай акадэміі, паставіўшы мэтай зрабіць яго апорай асветы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шырокіх колаў беларускага грамадства. Мысліцель звязваў грамадскі прагрэс з развіццём навукі і распаўсюджваннем адукацыі на ўсе слаі насельніцтва. Крытыкаваў крайнасці феадалізму, невуцтва і забабоны. Значнай навуковай з'явай у Беларусі стаў трактат Каніскага "Філасофія, якая складаецца з чатырох частак і адпаведна чатыром здольнасцям уключае логіку, метафізіку, фізіку і этыку". Твор сведчыццьаб тым, што Каніскі быў паслядоўнікам арыстоцелізму і стараўся засвоіць яго ў інтэрпрэтацыі філосафаў Адраджэння. Беларускі мысліцель быў упэўнены ў здольнасці пазнання чалавекам акружаючай рэчаіснасці. У асобных пытаннях гносеалогіі ён адыходзіў ад традыцыйнай схаластыкі і набліжаўся да філасофіі Новага часу. Каніскі не сумняваўся ў тым, што пачуцці ўзнікаюць тады, калі дзейнічаюць адпаведныя матэрыяльныя аб'екты на органы пачуццяў.

Філосаф падкрэсліваў, што чалавеку патрэбна шукаць у гэтым жыцці ўсё добрае, а не чакаць яго на тым свеце.

## Тэма 5. Філасофія Асветніцтва (другая палова XVIIIст.-пач. XIX ст.)

План

1. Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі.
2. Філасофскія ідэі Казіміра Нарбута.
3. Філасофскія і сацыялагічныя погляды фізіякратаў.
4. Аніёл Доўгірд.

### 5.1. Асаблівасці эпохі Асветніцтва ў Беларусі

Асветніцтва ў Беларусі прадстаўляла сабой шэраг культурных фенаменаў, у цэнтры якіх знаходзілася буржуазная, антыфеадальная па сваёй сутнасці ідэалогія. Гэта ідэалогія абапіралася на своеасаблівы светапогляд.

Філасофія Асветніцтва адрознівалася ад папярэдніх вучэнняў сваёй накіраванасцю на грамадскія пераўтварэнні і абсалютызацыяй каштоўнасцей навукі. Агульныя рысы філасофіі Асветніцтва праяўляліся даволі спецыфічна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў розных краінах Заходняй Еўропы. Залежыла гэта ад узроўню іх эканамічнага і сацыяльнага развіцця.

На філасофскую думку Асветніцтва ў Беларусі значны ўплыў аказалі руская і польская культуры. Разам з тым Асветніцтва мела і свае спецыфічныя рысы, абумоўленыя гісторыяй краю, а таксама яго народнай культурай. У другой палове XVIII ст. у Беларусі, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай узмацняецца працэс разлажэння прыгонніцтва. Разам з актывізацыяй гаспадарчага жыцця ідзе дыферэнцыяцыя шляхты, абвастраецца класавая барацьба. Прадстаўнікі розных сацыяльных груп і класаў прапануьць свае тэорыі і праекты перабудовы грамадства. У 1773 г. была створана Камісія народнай адукацыі. Яна правяла некаторыя рэформы ў асвеце, распрацавала сацыяльныя і педагагічныя праекты асветніцкага характару. Цэнтрам навуковай і культурнай дзейнасці ў краі была Віленская акадэмія, а потым універсітэт.

Для Беларусі характэрна некаторае змяшчэнне ў часе перыяду асветніцтва адносна заходнееўрапейскіх краін. Найбольшы ўздым культуры і навукі асветніцтва ў Беларусі прыходзіцца на сярэдзіну XVIII ст., а ўплыў яе сутнасна заяўляе аб сабе значна пазней. Асветніцтва насіла арыстакратычны характар, паколькі было звязана з дзейнасцю прыхільнікаў філасофска-эканамічнага вучэння фізіякратаў (Масальскі, Храптовіч і інш.). Філасофская думка ў гэты час праходзіць этап дэструктуралізацыі схаластыкі, пераходу ад тэалогіі да новай філасофіі і прыродазнаўства. У цэлым для яе былі характэрнымі рысамі эклектыцызм і кампраміснасць.

У апошняй трэці XVIII ст. у Беларусі з’яўляюцца паслядоўнікі філасофіі Асветніцтва ў галіне грамадска-палітычных праблем. Выказваюцца ідэі, якія закранаюць прыроду чалавека, яго правы, імкненне да шчасця. Адной з асноўных рыс філасофіі эпохі Асветніцтва было адмаўленне правідэнцыялізму ў развіцці грамадства і чалавека.

У 80-90 гг. (перыяд абвастрэння палітычнага крызісу і раздзелаў Рэчы Паспалітай) узмацняюцца дэмакратычныя тэндэнцыі і плыні асветніцкага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руху. Набірае сілу антыпрыгонніцкая думка. Заяўляе аб сабе рэвалюцыйна-дэмакратычнае асветніцтва, якое падтрымлівае ідэі Французскай рэвалюцыі.

Вялікія гістарычныя падзеі – падзелы Рэчы Паспалітай, паражэнне паўстання Т. Касцюшкі, айчынная вайна 1812 г. – выклікалі крызіс ідэалогіі і філасофіі Асветніцтва, але разам з тым і своеасаблівы іх “рэнесанс” у Віленскім універсітэце. Філасофская думка ў гэты перыяд становіцца пераважна гнасеалагічнай. Яна стараецца абаперціся на сенсуалізм і вопытнае прыродазнаўства. Аднак своеасаблівым цэнтрам ідэйнай барацьбы з’явілася супрацьстаянне філасофіі Асветніцтва і антыасветніцкіх сіл каталіцкай царквы, пераважна іезуітаў.

Паступова ў беларускім грамадстве сярод інтэлігенцыі ўзнікае культурная плынь, якая імкнецца да вывучэння гісторыі, культуры, жыцця беларускага народа. Такім чынам з ідэалогіяй і філасофіяй Асветніцтва звязваецца творчасць першых беларускіх літаратараў XIX ст. – Яна Чачота, вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і інш.

## 5.2. Філасофскія ідэі Казіміра Нарбута

*Казімір Нарбут* (1738-1807) выступіў у Беларусі прадаўжальнікам ідэй

Ранняга Асветніцтва. Нарадзіўся філосаф у маёнтку Яшнец у Лідскім павеце. Вучыўся ў піярскай школе ў Шчучыне і піярскім калегіуме ў Вільні. Каля чатырох год працягваў адукацыю ў піярскім вучылішчы ў Рыме. Пасля вяртання ў Беларусь, выкладаў у піярскім калегіуме ў Дубровіцы. Праз некаторы час быў запрошаны ў Вільню, дзе чытаў лекцыі па філасофіі ў піярскай школе. У 1769 г. выдаў у Вільні падручнік па логіцы, а ў 1771 г. пад кіраўніцтвам Нарбута яго вучнямі была выдадзена кніга “Выбраныя філасофскія меркаванні”.

Беларускі асветнік выступаў супраць схаластычнай сістэмы адукацыі, створанай іезуітамі, прапагандаваў ідэі новай філасофіі, заклікаў абапірацца на вопыт і назіранні. У “Логіцы” з гуманістычна-асветніцкіх пазіцый выказваўся за свабоду філасофствавання, звязваючы яго з пошукам ісціны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нарбут больш паслядоўна, чым яго папярэднікі крытыкаваў схаластаў, разумеючы што схаластычная філасофія з’яўляецца сур’ёзнай перашкодай на шляху далейшага развіцця навуковых ведаў, паколькі займаецца праблемамі, адарванымі ад практычнага жыцця чалавека і грамадства.

Асновай пазнання Нарбут лічыў дакладнасць і відавочнасць ідэй, прытрымліваючыся тых правілаў пошуку ісціны, што і Дэкарт. Для ўстанаўлення ісціны Нарбут падкрэсліваў важнасць усебаковага і разнастайнага падыходу ў даследаванні з’яў. Філасофію асветнік адносіў да найважнейшых дысцыплін, крытыкуючы становішча, якое яна займала тады, калі была на паслугах у тэалогіі. Мысляр выказваў сваю падтрымку тым грамадскім мерапрыемствам (будаўніцтва Пінскага канала), якія ажыццяўляліся ў Беларусі. Ён падкрэсліваў, што тая палітыка і мерапрыемствы, якія накіраваны на карысць усяго народу, спрыяюць развіццю мануфактур, удасканаленню сельскай гаспадаркі, развіццю ўнутранага рынку, зберажэнню грашовых сродкаў у краіне.

Значнае месца сярод філасофскіх разважанняў Нарбута займалі думкі аб грамадскай прыродзе чалавека. Пад уплывам Дж. Лока ён адзначаў, што чалавек прызначаны да жыцця ў грамадстве – гэта ўласцівасць чалавечай прыроды. Вярхоўная ўлада ўзнікае на пэўнай ступені развіцця грамадства, людзі пры гэтым захоўваюць свае прыродныя правы, якія ім гарантуе вярхоўная ўлада. У грамадстве, як і ў любой суполцы, намаганні ўсіх павінны быць скіраваны на дасягненне ўсеагульнага шчасця, таму ў краіне неабходны законы, на якіх бы грунтавалася цэласнасць, бяспека, а разам з тым і шчасце грамадзян. Вярхоўная ўлада павінна клапаціцца аб непарушнасці законаў, справядлівасці, роўнасці, свабодзе асобы. Філосаф адстойваў думку пра неабходнасць шырокай свецкай адукацыі, выступаў супраць такіх метадаў у практыцы навучання і выхавання, як цялесныя пакаранні вучняў. Асаблівую ўвагу Нарбут звяртаў на неабходнасць памяркоўнага абыходжання настаўнікаў з вучнямі з бедных сем’яў, на павагу да іх асабістай годнасці. Крытыкуючы саслоўную сістэму навучання, Асабліва ў калегіумах ордэна



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іезуітаў, асветнік выступаў за свецкую сістэму адукацыі, за адзіныя метады навучання, за школу, якая была б звязана з практыкай эканамічнага і сацыяльнага жыцця. Як асветнік-гуманіст, Нарбут клапаціўся аб фарміраванні ў вучню асобы, чалавека цесна звязанага з практычнымі патрабаваннямі грамадства і часу.

У пытаннях анталогіі філосаф выступаў паслядоўнікам тэалагічнай канцэпцыі. Бога ён лічыў адзінай субстанцыяй, якая не мае ні пачатку, ні канца. Цела і душа цесна звязаны пакуль чалавек жыве  Апошняя надзелена розумам і воляй.

Праблема ісціны звязвалася Нарбутам з вынікамі чалавечага пазнання. Для яе пошуку патрэбна карыстацца адпаведнымі метадамі: апісальным, параўнальным і інш. Філосаф лічыў, што існуюць чатыры шляхі, якія дапамагаюць атрымаць неабходныя веды: унутраная душэўная свядомасць, вывядзенне аднаго меркавання з другога, вопыт, атрыманы пры дапамозе пачуццёвых органаў і чыёсьці аўтарытэтнае меркаванне. Крытэрый ісціны Нарбут бачыў у даставернасці і яснасці ўяўленняў.

Беларускі філосаф крытычна ацэньваў тэорыю прыроджаных ідэй і прытрымліваўся пазіцыі матэрыялістычнага сенсуалізму. Уяўленні аб рэчах, меркаваў ён, даюць нам органы пачуццяў.

Думкі пра будову Сусвету Нарбут выкладаў, абапіраючыся на вучэнні Каперніка, Галілея, Ньютана. Кеплера і інш. Сістэму Каперніка лічыў найбольш правільнай з вядомых у той час сістэм. У сярэдзіне XVIII ст. беларускі вучоны ведаў, што Зямля сплюшчана каля палюсоў, а таксама пра плямы на Сонцы.

У сацыялагічных поглядах Нарбута даволі выразна адчуваецца ўплыў ідэй заходнееўрапейскіх асветнікаў. Так, ён лічыў, што грамадства павінна грунтавацца на “натуральным праве”. Чалавека разглядаў як грамадскую істоту. Неабходнасць грамадскага жыцця абасноўваў прыродай чалавека. У грамадстве намаганні людзей павінны быць накіраваны на дасягненне ўсеагульнага шчасця. Для гэтага неабходны адпаведныя законы. Філосаф



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адрозніваў натуральнае становішча грамадства ад грамадзянскага. У грамадзянскім людзі падпарадкоўваюць сваю волю большасці. Дзяржаву лічыў прадуктам усеагульнай волі і згоды, абапіраючыся на ідэі Ж.-Ж. Русо. Быў прыхільнікам цэнтралізаванай дзяржаўнай улады.

У сваёй творчасці Нарбут прарабіў своеасаблівую эвалюцыю ад рацыяналізму Дэкарта і Лейбніца да сенсуалізму Лока.

**5.3. Філасофскія і сацыялагічныя погляды фізіякратаў**

У складаным і супярэчлівым працэсе развіцця грамадскай думкі Беларусі ў апошняй трэці XVIII ст. значная роля належыла дактрыне фізіякратаў. Вучэнне фізіякратаў (эканамістаў-філосафаў) раней узнікла ў Францыі. Першымі яго прапагандыстамі ў Рэчы Паспалітай былі магнаты і прадстаўнікі багатай шляхты, якія імкнуліся рацыяналізаваць вядзенне гаспадаркі ў сваіх маёнтках, каб пераадолець векавое адставанне краіны ад заходнееўрапейскіх дзяржаў.

Актыўным паслядоўнікам вучэння фізіякратаў быў *Ігнацій Масальскі* (1729-1794), сын гетмана Вялікага княства Літоўскага Міхаіла Масальскага. Першапачатковую адукацыю ён атрымаў у Вільні. Пасля працягу вучобы ў Рыме стаў доктарам філасофіі і тэалогіі. У 1762 г. узначаліў Адукацыйную камісію Рэчы Паспалітай па Беларусі.

У аснове тэорыі фізіякратаў ляжала ідэя натуральнай абумоўленасці грамадскіх адносін, звароту да вечных натуральных законаў існасці, сацыяльнай роўнасці і правоў чалавека. Згодна ініцыятыве Масальскага гэтыя ідэі прапаведваліся нават з касцёльных кафедраў. Сам Масальскі ў сваіх пастырскіх пасланнях гаварыў пра надзённыя інтарэсы людзей, падкрэсліваў неабходнасць пераадолення векавой адсталасці краіны, больш эфектыўнага выкарыстання зямлі і сялянскай працы. Масальскі імкнуўся палепшыць асвету і матэрыяльныя ўмовы жыцця земляробаў, лічыў неабходным забяспечыць усім сялянам свабоду, магчымасць павялічваць сваю ўласнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускі рэфарматар падтрымліваў непасрэдныя сувязі з французскімі асветнікамі, уваходзіў у парыжскі гурток фізіякратаў, сімпатызаваў рэспубліканскай форме ўлады. Ён нават наведваў салоны энцыклапедыстаў, сустракаўся і гутарыў з Дзідро. Загінуў у час паўстання 1794 г. супраць інтэрвенцыі Расіі і Прусіі.

Прыхільнікам фізіякратаў быў *Іаахім Ігнацый Юзаф Літавор Храптовіч* (1729-1812) – грамадскі, палітычны, дзяржаўны дзеяч Вялікага княства Літоўскага, публіцыст, паэт, перакладчык. Паходзіў з беларускага магнацкага роду, вучыўся ў Віленскай акадэміі, узначальваў дыпламатычныя місіі ў Парыжы і Вене. У 1793 г.быў прызначаны на пасаду міністра замежных спраў, а ў 1793 г. стаў канцлерам Вялікага княства Літоўскага. У сваіх радавых маёнтках Шчорсы і Вішнева адмяніў паншчыну. Бібліятэка Храптовічаў ў Шчорсах налічвала больш десяці тысяч кніг. У рэфарматарскай дзейнасці Храптовіча выявілася імкненне прадстаўнікоў пануючага класа да павышэння прадукцыйнасці працы сялян і адначасова да паслаблення вострых класавых супярэчнасцей. Гэтыя спробы зводзіліся да пошукаў аптымальнага варыянту вядзення маянтковай гаспадаркі ва ўмовах разаіцця таварна-грашовых адносін і без карэннай ломкі прыгоннай сістэмы.

Аб светапоглядзе Храптовіча сведчаць яго творы "Пра штогодняе аднаўленне краіны" і "Пра натуральнае права". У першым творы аўтар разгледжвае эканамічныя праблемы, у другім, разам з прававымі пытаннямі выкладае агульнафіласофскія і сацыялагічныя канцэпцыі. Асэнсоўваючы грамадскае тжыццё Храптовіч адзначаў наяўнасць у ім "натуральнага парадку", які ўстанаўлівае правы і абавязкі ўсіх членаў грамадства. Для падтрымкі такога парадку ў супольным жыцці і заключаюцца дагаворы. Чым бліжэй закон да натуральнага права, тым больш ён справядлівы. Паколькі задавальненне патрэб чалавека магчыма толькі ў грамадстве, то кожны павінен лічыцца з патрэбамі іншых членаў грамадства.

Аўтар лічыў, што маральныя законы цалкам адпавядаюць таму, што карысна і неабходна чалавеку ў яго жыцці. Так, дзеці павінны паважаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бацькоў, а бацькі павінны паважаць дзяцей, паколькі гэта вынікае з маральнага парадку, які адпавядае фізічнаму парадку прыроды.

Грамадства разглядалася фізіякратамі як натуральны арганізм, што складае частку прыроды, у якую ўваходзіць чалавек і яго маральныя прынцыпы. Калі ж чалавек вырваны з заканамернай сувязі прыроды (не мае свабоды, ці бяспекі, або пазбаўлены ўласнасці), ён становіцца бескарысным для сябе і грамадства.

Да ліку фізіякратаў належыў *Іеранім Сержпутоўскі* (1752-1815), які нарадзіўся ў вёсцы Ходачкава на Валыні. Адукацыю атрымаў у навучальных установах ордэна піяраў. У 1780 г. Сержпутоўскі становіцца прафесарам кафедры натуральнага права Галоўнай школы Вялікага княства Літоўскага ў Вільні, а з 1799 г. яе рэктарам (у 1803 г. школа ператорана ва ўніверсітэт). Асноўным творам Сержпутоўскага з'яўляецца "Навука аб прыродным і палітычным праве, палітычнай эканоміі і праве народаў" (1785), які сведчыць аб тым, што аўтар стаяў на пазіцыях дэізму, але прытрымліваўся сенсуалістычных поглядаў. Вучэнне Дэкарта аб прыроджаных ідэях ён лічыў памылковым.

Асновай сацыялагічнай канцэпцыі фізіякратаў таго часу было вучэнне пра натуральны парадак і як вынік з яго – натуральнае права. Натуральны парадак рэчаў Сержпутоўскі разглядаў як адзінства фізічнага і маральнага парадку, як сукупнасць законаў прыроды і грамадства. Людзі, на думку аўтара, могуць набыць шчасце толькі праз пазнанне і захаванне гэтага парадку натуральнага права. З натуральнага права Сержпутоўскі выводзіў сацыяльныя правы і абавязкі людзей, у тым ліку правы асабістай свабоды, узаемнай дапамогі, прыватнай уласнасці. Філосаф лічыў, што прыватная ўласнасць выступае асновай грамадства, а яе недатыкальнасць з'яўляецца найпершым натуральным правам чалавека. Прынцып натуральнага права ён разглядаў у якасці крытэрыя існасці таго ці іншага сацыяльна-палітычнага ладу. Разумнае грамадскае ўпарадкаванне і шчасце народа Сержпутоўскі звязваў з узроўнем пашырэння ведаў аб прыродзе і грамадстве.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4. Аніёл Доўгірд

*Аніёл Доўгірд* (1776-1835) нарадзіўся ў маёнтку Юркаўшчына

Мсціслаўскага павета. З 1786 г. вучыўся ў Мсціслаўскай школе іезуітаў, потым у школе піяраў у Дуброўне (Магілёўская губ.). Пасля заканчэння Віленскай акадэміі выкладаў шэраг дысцыплін у піярскіх вучылішчах. З 1821 года чытаў у Віленскім універсітэце поўны курс тэарэтычнай і практычнай філасофіі. У тым жа годзе выдаў манаграфію “Аб логіцы,метафізіцы і маральнай філасофіі”.У Віленскім ўніверсітэце да нашага часу захаваліся экзаменацыйныя пытанні Доўгірда па курсе логікі і філасофіі з адказамі на іх Адама Міцкевіча.

Сістэма поглядаў Доўгірда была даволі супярэчлівай, паколькі філасофія і тэалогія ў ёй не толькі спалучаліся, але і дапаўнялі адна адну. Доўгірд не пагаджаўся з апрыярыстычнай канцэпцыяй Канта, скептычна ставіўся да ідэі трансцэндэнтнага.

Асноўная крытыка аўтара скіравана на суб’ектыўны ідэалізм. Абапіраючыся на класікаў дакладных навук - Каперніка, Галілея, Ньютана і інш., Доўгірд схіляўся да механістычнай карціны свету. Мысляр прытрымліваўся так званай “філасофіі здаровага розуму” (Рыд, Сцюарт і інш.). У адпаведнасці з прынцыпамі, сфармуляванымі гэтымі шатландскімі філосафамі, крытыкаваў Канта і яго паслядоўнікаў. Выказваў надзею на цывілізацыйную, гуманістычную ролю дакладных навук.

Маральная філасофія Доўгірда сведчыць аб уплыве на яе ідэй Асветніцтва. Асноўнай мэтай маралі аўтар лічыць цягу чалавека да шчасця. Этыка ў строгім яе разуменні, выкладае аснову правоў і маральных абавязкаў чалавека. Гэтаму трэба вучыць з дзяцінства, растлумачваць сувязь маралі і жыцця.

Доўгірд вінаваціў Юма і Канта за тое, што яны скептычна ставіліся да рэальнасці цудаў. Сам ён лічыў, што цуда ў сваёй аснове ўтрымлівае дабро і робіць людзям напамінак пра Бога, накіроўваючы іх да добрых учынкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтар крытыкаваў тых багасловаў, якія сціралі межы паміж метафізічным і натуральным, імкнуўся тэарэтычна абгрунтаваць тэалагічную канцэпцыю цуда.

## Тэма 6. Філасофская і сацыяльна-палітычная думка XIX ст.

Лекцыя 1 (першая палова XIX ст.)

План

6.1.1. Сацыяльна-палітычная думка 20-40-х гадоў

6.1.2. Філасофская палеміка 30-50-х гадоў

6.1.3. Вінцук Дунін-Марцінкевіч

### 6.1.1. Сацыяльна-палітычная думка 20 – 40-х гадоў

Развіццё сацыяльна-палітычных ідэй у Беларусі і іх прапаганда ў 20 –

30-я гады XIX ст. цесна звязана з вызваленчым рухам, з дзейнасцю тайных гурткоў, якія рыхтавалі ўзброенае паўстанне супраць царызму. Першыя крокі ў гэтым накірунку былі зроблены *філаматамі* – тайнай арганізацыяй студэнтаў Віленскага ўніверсітэта (1817-1823 гг.). Галоўнымі мэтамі філаматы лічылі вывучэнне навук, авалоданне творчасцю, выхаванне высокай маралі. У статуце арганізацыі падкрэслівалася роўнасць ўсіх яе членаў, незалежна ад узросту, багацця і таленту. У далейшым галоўным у іх дзейнасці быў клопат аб тым, каб прынесці больш карысці краю і яго жыхарам. У прапанаваным А. Міцкевічам "Плане новай арганізацыі" (1819) гаварылася аб тым, каб як мага шырэй распаўсюджваць сярод народа асветніцтва, развіваць нацыянальную самасвядомасць, абуджаць імкненне да дзяржаўнай дзейнасці.

Светапогляд філаматаў складваўся пад уздзеяннем ідэй Асветніцтва. Шмат членаў таварыства было добра знаёма з творамі Русо, Вальтэра, Гельвецыя і інш. Філасофію філаматы імкнуліся вывучаць паводле арыгіналаў. Адам Міцкевіч, напрыклад, лічыў, што ніводнага з твораў мінулага нельга зразумець, калі ён прадстае ў чужой інтэрпрэтацыі, без



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асабістых інтэлектуальных намаганняў чытача. Знаёмства з працамі мысліцеляў мінулага філаматы разглядалі як неабходны этап на шляху ўнутранага ўдасканалення асобы. У сваю чаргу, унутранае ўдасканаленне цесна звязвалася з удасканаленнем свядомасці грамадства, служэннем чалавецтву.

Як і асветнікі XVIII ст. філаматы бачылі сувязь маралі і палітыкі. Там, дзе дрэннае кіраванне, падкрэслівалі яны, не можа быць добрых грамадзян. Выступаючы супраць дэспатызму, філаматы выказваліся за канстытуцыю і прадстаўнічае праўленне. Масы павінны праз асветніцтва зразумець выгоды канстытуцыйнага праўлення і шкоднасць дэспатызму. Пазней у праграме філаматаў адным з найбольш важных стала патрабаванне сацыяльных змен і перш за ўсё вызваленне сялян ад прыгонніцтва. Па сваўму грамадскаму становішчу філаматы былі найбольш блізкімі да сялянства. Сярод іх было шмат такіх, якія выйшлі з бедных слаёў і востра адчувалі недасканаласць сучаснага ім жыцця.

Інтарэс да народнай культуры, звычаяў, мастацтва стаў адной з крыніц паэзіі *Адама Міцкевіча*. Ён і яго паплечнікі-філаматы першымі паказалі мастацкую каштоўнасць вуснай народнай творчасці. Некаторыя з філаматаў (*Ян Чачот*) пачалі ў некаторых сваіх творах выкарыстоўваць беларускую мову.

Інтарэсы існавання нацыі, адраджэнне яе самастойнасці выклікаюць барацьбу паміж памешчыкамі і сялянамі. Не прызнаючы будучага за буйнымі землеўладальнікамі, філаматы абгрунтоўвалі ідэю аб “сярэднім класе”, здольным адрадзіць грамадства. Гэты клас звязаны, на іх думку, з бяднейшай шляхтай, якая можа ўзначаліць вызваленчую барацьбу ў грамадстве. Сялянства ж – цёмнае і неадукаванае, таму і патрабуе кіраўніцтва. Асноўныя прынцыпы пабудовы новага грамадства філаматы шукалі ў натуральным праве. Яно выступала ў іх як навука аб адносінах паміж людзьмі, з якой вынікала выснова аб свабодзе і роўнасці, аб іх карыснасці для грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1825 г. на Беласточчыне ўзнікла тайная суполка "*Ваенных сяброў*". Яе членамі былі афіцэры асобнага Літоўскага корпуса і прадстаўнікі прагрэсіўных колаў мясцовай шляхты, інтэлігенцыі, чыноўніцтва. Суполка падзялялася на тры ступені: "Ваенных сяброў", "Згоду" і "Зару". Членамі першай – кіруючага цэнтра , былі афіцэры Ігельстром, Вегелін, Гофман, Трабінскі, Пятроўскі. Другую прадстаўлялі грамадзянскія асобы – шляхціч Руткевіч, настаўнік Свіслачскай гімназіі Ардынскі, калежскі рэгістратар Грынявецкі, канцылярскі чыноўнік Вронскі і інш. Трэцяя ступень аб'ядноўвала вучнёўскую моладзь, галоўным чынам вучняў Свіслачскай і Беластоцкай гімназій.

Галоўнай мэтай суполкі "Ваенных сяброў" абвяшчалася "вольнасць" і "агульная карысць". Рэвалюцыя разглядалася як галоўны сродак дасягнення свабоды і роўнасці ўсіх членаў грамадства. Найлепшай формай дзяржаўнага ладу прызнавалася рэспубліка. Шляхту, члены суполкі лічылі здольнай адмовіцца ад сваіх прывілей і даць свабоду "сваім браццям" – сялянам.

На фарміраванне светапогляду членаў суполкі "Ваенных сяброў" аказалі ўплыў філасофія Асветніцтва і заходнееўрапейская філасофская думка навогул. Членам суполкі былі знаёмы творы Бэкана, Шэлінга, Гегеля. Вядома была і кніга польскага дэмакрата, удзельніка паўстання 1830-1831гг. Яна Чыньскага "Польскія якабінцы", выдадзеная ў Парыжы ў 1833-1834 гг. Аўтар выказваў надзею, што ў Расіі павінны з'явіцца новыя дэкабрысты і заклікаў палякаў да саюзу з рэвалюцыйнымі сіламі.

Паўстанне 1830-1831 гг. паказала памылковасць тэзы аб выключнай ролі шляхты як суб'екта гістарычнай дзейнасці. Гэта патрабавала выпрацоўкі новай рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі. Сярод удзельнікаў вызваленчага руху яе тэарэтыкамі на першы план ставілася ідэя "сацыяльнай гармоніі", г. зн. адзінства інтарэсаў шляхты, сялян і мяшчан. Шляхце адводзілася кіруючая роля, а сялянства разглядалася як сіла, здзяйсняючая намечаную сацыяльную праграму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўным прынцыпам сацыяльнай думкі 30-х гадоў заставалася "натуральнае права" у яго антыфеадальнай дэмакратычнай інтэрпрэтацыі. Феадальна-абсалютысцкі рэжым адмаўляўся як не адпавядаючы натуральнай прыродзе чалавека, а існуючыя аграрныя адносіны разглядаліся як адна з галоўных перашкод на шляху да ўсталявання роўнасці і свабоды.

Вялікі ўплыў на сацыяльна-палітычную думку Беларусі аказалі рэвалюцыйныя падзеі 1848 г. у Заходняй Еўропе. Прынцып "натуральнай роўнасці" у ідэалогіі вызваленчага руху паслужыў абгрунтаванню права ўсіх народаў на нацыянальную самастойнасць. Члены тайных суполак выказваліся супраць розных тэорый аб непаўнавартасці асобных народаў. Глыбокі інтарэс праяўляўся да праблемы дзяржавы. Сучасную ім феадальна-абсалютысцкую форму палітычнай арганізацыі члены тайных суполак разглядалі як сродак падаўлення свабоды і разбэшчвання асобы. Ідэолагі вызваленчага руху лічылі, што кожны чалавек павінен карыстацца адолькавымі правамі і мець права кіраваць, а таму павінна быць усталявана рэспубліка. Патрабаванне рэспубліканскай формы кіравання – адно з найбольш значных дасягненняў сацыяльна-палітычнай думкі Беларусі 30-40-х гадоў XIX ст.

### 6.1.2. Філасофская палеміка 30-50-х гадоў

У развіцці філасофскай думкі Беларусі з другой паловы 30-х гадоў XIX ст. выявіліся новыя тэндэнцыі. У параўнанні з мінулым перыядам, калі станаўленне прагрэсіўных ідэй было непасрэдна звязана з Асветніцтвам, усё большае распаўсюджванне атрымлівае філасофія Гегеля, а разам з ёю і дыялектыка. Вострая барацьба, якая разгарнулася вакол філасофскіх праблем у 30-50-я гг., адлюстравала не толькі супярэчнасці тэарэтыка-пазнаваўчых канцэпцый, але і супрацьборства палітычных сіл. Філасофія заявіла аб сабе як тая крыніца ведаў, у якой кожны клас шукаў абгрунтаванне сваім палітычным імкненням. Адным з галоўных пунктаў у гэтай палеміцы было пытанне аб адносінах філасофіі да жыцця, сувязі тэорыі і практычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці людзей. Шмат увагі ўдзялялася праблеме сутнасці філасофскіх ведаў, суадносінам эмпірычнага і рацыянальнага, узаемасувязі філасофіі і іншых навук, аналізу гісторыка-філасофскага працэсу. Характэрнай асаблівасцю выступленняў шэрагу аўтараў было імкненне абгрунтаваць ролю філасофіі ў перабудове свету. Яны выступалі супраць тых, хто бачыў у філасофіі толькі ўтопію, далёкую ад лёсу народаў, а таксама супраць спробы разглядаць яе як нейкую прыкладную навуку, прадназначаную для кіравання канкрэтнай дзейнасцю. Падвяргалася крытыцы пазіцыя, згодна якой філасофія паўставала як сфера чыстых ведаў, дзе здзяйсняецца пазнанне ісціны дзеля ісціны. У гэтай сувязі крытыкавалася і нямецкая філасофія ад Канта да Гегеля за яе абстрактны характар, а таксама за тое, што нямецкія філосафы былі вельмі далёкімі ад сацыяльнай барацьбы, якая вялася ў грамадстве. Пад час гэтай крытыкі выразна праявілася імкненне да сінтэзу ідэй Гегеля з сацыялістычнымі прынцыпамі, якое стала своеасаблівым патрабаваннем злучыць "практыку Францыі" і "філасофскі дух Германіі". Аб'яднанне гэтых элементаў лічылася неабходнай умовай далейшага развіцця філасофіі.

Асобнае месца ў крытыцы рацыяналізму займалі выступленні супраць гегелеўскай філасофіі, якая трактавалася як філасофія адмаўлення, не здольная ствараць. Непрымальным здаваўся для апанентаў гнасеалагічны рацыяналізм Гегеля, калі рэчаіснасць раскрывалася як даступная чалавечаму розуму.

З крытыкай канцэпцыі незалежнасці свядомасці ад матэрыі выступіў *М. Лавіцкі,* які разглядаў псіхафізічную праблему у плане суадносін псіхічнага і фізіялагічнага. Працяканне фсіхічных працэсаў ён звязваў з фізіялагічнымі, якія адбываюцца ў галаве чалавека. Лавіцкі таксама выступаў супраць спрошчанага механістычнага разумення гэтага працэсу (Кабаніс). Галоўнае ў разважаннях Лавіцкага "аб душы" заключаецца ў адмаўленні ўсіх спроб звышнатуральнага тлумачэння праблемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ідэйнай барацьбе 30-40-х гг. значнае месца адводзілася гісторыка-філасофскім пытанням, што было выклікана шэрагам прычын. Адна з іх – адносіны да культурнай спадчыны іншых народаў, у прыватнасці да філасофіі Асветніцтва і класічнай нямецкай філасофіі.

Узрастанне нацыянальнай самасвядомасці славянскіх народаў, актывізацыя іх барацьбы за вызваленне і выхад на арэну гістарычнай творчасці патрабавалі заявіць аб сабе ў духоўнай сферы, у тым ліку і ў філасофіі. Далёка не выпадкова ў грамадскай думцы Беларусі ўзнікла пытанне аб сутнасці “славянскай філасофіі”, рабіліся першыя спробы высветліць яе ўзаемасувязь з філасофскай спадчынай іншых народаў. Падкрэсліваючы “незалежнасць” філасофскіх сістэм *Буйніцкі, Галавін, Ржавусскі* і іншыя сцвярджалі, што філасофскія ісціны не маюць універсальнага характару, што яны нацыянальныя і таму прыдатны толькі для аднаго народа, што няма і не можа быць адзінага крытэрыя філасофіі. Гэтыя тэзы аўтараў прэтэндавалі на ролю прынцыпаў у распрацоўцы “нацыянальнай” філасофіі.

Такія аўтары *як Давід і Марцінкоўскі* разглядалі гісторыка-філасофскі працэс як пэўную цэласнасць. Гісторыя філасофіі паўставала ў іх творах у паступовым раскрыцці ісціны. Філасофію асобнага народа яны лічылі неад’емнай часткай сусветнага гістарычнага працэсу. У іх творах падкрэсліваўся інтэрнацыянальны характар філасофіі як навукі аб цэлым. Кожны народ уносіць свой набытак у агульную скарбонку сусветнай думкі, таму Старажытны Ўсход, Грэцыя, Рым Сярэднявечча, Новы час паўстаюць як вялікія галіны дрэва філасофскага прагрэсу. Згодна аўтарам, усялякая абсалютызацыя адной з прыступак гэтага руху будзе памылковай.

Такім чынам прагрэсіўна настроеныя беларускія аўтары змаглі не не толькі адкрыта выступіць супраць кансеватыўных поглядаў сваіх апанентаў. Еле і абгрунтаваць ідэю актыўнай ролі філасофіі ў грамадзянскай перабудове. Тым самым тэарэтычная палеміка 40-х гадоў садзейнічала ажыўленнюфіласофскай думкі, засваенню важнейшых філасофскіхпраблем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 6.1.3. Вінцук Дунін-Марцінкевіч

Складаныя і супярэчлівыя тэндэнцыі грамадскай і эстэтычнай думкі XIX ст. найбольш выразна праявіліся ў творчасці *В. Дуніна-Марцінкевіча* (1807-1884). Будучы цесна звязаным з традыцыямі польскай літаратуры і эстэтыкі, Дунін-Марцінкевіч, тым не менш, прыходзіць да пераканання аб неабходнасці самастойнага існавання беларускай культуры. Шляхі яе аднаўлення пісьменнік бачыў у спалучэнні культуры вышэйшых слаёў дваранства, закранутага Асветніцтвам і дасягненняў народнай культуры. Практычнай рэалізацыяй гэтай пазіцыі стала літаратурная творчасць Дуніна-Марцінкевіча на беларускай мове. Такая накіраванасць пазіцыі пісьменніка выходзіла за межы чыста літаратурных інтарэсаў і набывала грамадска-палітычны характар. Яна выклікала варожую рэакцыю з боку польскіх шавіністаў, лічыўшых Беларусь неад’емнай часткай Польшы, а таксама іэолагаў і праваднікоў палітыкі расійскага самадзяржаўя.

Ідэйна-эстэтычная пазіцыя Дуніна-Марцінкевіча характэрызавалася значнай супярэчлівасцю, што было адлюстраваннем тых умоў у якіх адбывалася ў той перыяд аднаўленне беларускай культуры. Дунін-Марцінкевіч па сацыяльнаму паходжанню і выхаванню належыў да дробнапамеснага дваранства. Пасля заканчэння Бабруйскай гімназіі ён займаўся ў Пецярбургскім універсітэце. Затым служыў у Менску дробным чыноўнікам. У 1840 г. пасля звальнення з службы, пасяліўся ў іменні Люцынка недалёка ад Менску і засяродзіў увагу на літаратурнай дзейнасці. У 1864 г. быў абвінавачаны ў напісанні рэвалюцыйных пракламацый і заключаны ў турму. Але паколькі рэальных доказаў не знайшлося, быў выпушчаны і знаходзіўся пад наглядам паліцыі. З “пісаннем сваім, з думкамі, вымушаны быў ад усіх зачыняцца ў каморку”. Апошнія творы пісьменніка ўбачылі свет толькі пасля кастрычніка 1917 г.

Светапогляд Дуніна-Марцінкевіча прасякнуты імкненнем да ўсталявання гарманічных узаемасувязяў у сферы сацыяльных адносін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асновай, на якой магчыма было дасягненне гэтага гарманічнага адзінства, Дунін-Марцінкевіч лічыў узровень патрыярхальных адносін грамадства. Апошнія пісьменнік імкнуўся вытлумачыць праз прызму ідэалізаваных норм патрыярхальнай маралі, таму сацыяльныя адносіны набывалі ў яго аблічча адносін паміж бацькамі і дзецьмі ў вялікай зладжанай сям'і. Прынцып гарманічнага адзінства ў сферы сацыяльнага жыцця вёў да сцвярджэння ідэі класавага салідарызму. Дунін-Марцінкевіч, безумоўна ўсведамляў наяўнасць сацыяльных супярэчнасцей, прызнаваў, што сярод сялян укаранёны з дзяцінства негатыўны погляд супраць паноў. Тым не менш, відавочнасці сацыяльнага антаганізму ён імкнуўся проціпаставіць культурна-асветніцкую дзейнасць адукаваных паноў: арганізацыю нацыянальных школ, стварэнне літаратуры на беларускай мове, што на думку Дуніна-Марцінкевіча здольна было ўраўнаважыць існуючую няроўнасць.

Асаблівае значэнне Дунін-Марцінкевіч надаваў стварэнню літаратуры на беларускай мове, якая, звяртаючыся і да пана і да селяніна, паказвала б прыцягальнасць стану грамадства, дзе захаваны формы простых і добразычлівых адносін паміж людзьмі розных сацыяльных станаў. Абуджэнне народа да духоўнага жыцця Дунін-Марцінкевіч разглядаў як крок унутранага развіцця, які ператворыць у рэальнасць маральныя ўяўленні пра гарманічныя адносіны паміж людзьмі, найперш паміж панам і селянінам. Паводле меркавання пісьменніка, дасягненне гэтай мэты ў большай ступені залежыла ад паноў, ад таго наколькі яны стануць носьбітамі лепшых духоўных якасцей і будуць садзейнічаць укараненню гэтых маральных уяўленняў сярод народа. Існаванне літаратуры на беларускай мове абгрунтоўвалася Дуніным-Марцінкевічам асветніцкімі і маральнымі задачамі, што, на яго погляд, адкрывала шляхі да пераадолення сацыяльных цяжкасцей.

Пазіцыя Дуніна-Марцінкевіча, як выразніка працэсу станаўлення нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, не была дастаткова пэўнай. Дваістасць пісьменніка ў нацыянальным пытанні выразна выявілася



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў яго двухмоўных творах, дзе паны гавораць па-польску, а сяляне – па-беларуску. З гэтага вынікае, што беларускую мову ён лічыў сялянскай, простанароднай. Таму і Беларусь ўяўлялася яму тэрытарыяльна-этнаграфічнай, а не нацыянальнай цэласнасцю. Нацыянальныя адносіны яшчэ не ўсведамляліся ім як адносіны народаў, напрыклад беларускага і польскага. Беларусь, якой ён жадаў яе бачыць, паўставала краем, дзе польска-беларускае дваранства аб’яднана з беларускім сялянствам, утвараючы ідэальнае самабытнае адзінства. Такая сацыяльна-нацыянальная ідэалізатарская тэндэнцыя была утапічнай.

Агульная ідэя сацыяльнай гармоніі была цесна звязана з поглядамі Дуніна-Марцінкевіча на лёс культуры. Сцвярджэнне ім самабытнага характару беларускай культуры грунтавалася ў першую чаргу на рэальных каштоўнасцях духоўнай існасці беларусаў, увасобленай ва ўсім складзе светапогляду народа, у яго паданнях, звычаях, песнях, побыце. Разам з тым паняцце культурнай самабытнасці неадлучна ад яго ідэалізатарскіх імкненняў. Вышэйшай мэтай імкненняў Дуніна-Марцінкевіча становіцца адукаванае дваранства – носьбіт высокіх духоўных якасцей, узорнае ў маральных адносінах і далучанае да асветы ў выніку стварэння літаратуры на беларускай мове – мове сялянства, якое захавала лепшыя здабыткі самабытнай народнай культуры.

Праблема культурнай пэўнасці Беларусі вырашалася пісьменнікам як сінтэз адзінства дзвюх культур – дваранскай і народнай. Першая нясе высокі ўзровень духоўнасці, другая вызначае самабытнасць. Такое адзінства дваранскай і народнай культур павінна было стварыць фундамент. Абумовіць характар новай беларускай культуры.

У цэлым ідэал Дуніна-Марцінкевіча можа быць вызначаны як проціпастаўленне старога новаму (вёскі – гораду), у аснове якога ляжалі маральныя крытэрыі. Прастата і чалавечнасць звязваліся з ідэалізаванымі патрыярхальнымі адносінамі жыхароў вёскі, варожасць і маральнае бязладдзе – з новымі працэсамі ў гарадскім жыцці. Крытыкуючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

капіталістычныя адносіны, Дунін-Марцінкевіч бачыў перш-наперш іх антыгуманную сутнасць, адчуваў пагрозу прастаце і натуральнасці жыцця народа, дабразычлівасці ў людскіх адносінах. Менавіта вёска выступала для пісьменніка хавальніцай спрадвечных маральных прынцыпаў, хаця яна была хутчэй ідэалізаванай, чым рэальнай.

Роля Дуніна-Марцінкевіча ў развіцці беларускай нацыянальнай культуры вельмі значная. Ён быў адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, творчасць пісьменніка стала важным этапам яе фарміравання ў даволі неспрыяльных умовах. Можна не пагаджацца з яго ўяўленнямі пра справядлівае ўладкаванне грамадства, аднак трэба аддаць належнае намаганням у пошуку дасканаласці і гармоніі грамадства, імкненню садзейнічаць дабрабыту роднага краю і свайго народа.

## Тэма 6. Філасофская і сацыяльна-палітычная думка XIX ст.

Лекцыя 2 (другая палова  XIX ст.)

План

6.2.1. Грамадская думка перыяду паўстання 1863 г. Кастусь Каліноўскі

6.2.2. Францішак Багушэвіч

6.2.3. Янка Лучына. Адам Гурыновіч

### 6.2.1. Грамадская думка перыяду паўстання 1863 г. Кастусь Каліноўскі

Паўстанне 1863 г. суправаджалася масавым выданнем рэвалюцыйна-дэмакратычных праkламацый, газет і брашур. Напярэдадні і ў час паўстання ствараліся падпольныя тыпаграфіі, якія выдавалі самую разнастайную рэвалюцыйна-дэмакратычную літаратуру. Усе яны былі прасякнуты адной мэтай – падняць свядомасць народных мас, узброіць іх новымі рэвалюцыйнымі ідэямі, мабілізаваць на барацьбу супраць царызму і прыгонніцтва. Рэвалюцыйна-дэмакратычная літаратура распаўсюджвалася ў вёсках. мястэчках. гарадах, ваенных казармах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзначым, што ў той час народ яшчэ верыў у добрага цара. Ён лічыў, што дрэннымі з’яўляюцца чыноўнікі, менавіта яны скажаюць тую палітыку, якую праводзіць манарх. Патрэбна было пераадолець гэтую манархічную ілюзію і ў той жа час не адвярнуць ад рэвалюцыі народныя масы.

У “Мужыцкай праўдзе” падкрэслівалася, што царскі ўрад здзяйсняе дыктатуру памешчыкаў-прыгоннікаў. Менавіта ўрадпрадаставіў апошнім усе правы і прывілеі, а ўсе абавязкі (рэкрутчына, налогі, аброк і інш.) усклаў на сялян. Так адбываецца таму, тлумачыла газета, што цар з яго ўрадам, чыноўнікамі і памешчыкамі – адна шайка, якая глуміцца над народам.

Гэтыя ідэйныя прынцыпы “Мужыцкай праўды” вызначалі практычныя справы. Сяляне павінны былі ўсімі сваімі намаганнямі і сродкамі супраціўляцца грабяжу: не плаціць падаткаў і аброку, не даваць рэкрутаў і інш.

Сацыялагічная думка Беларусі напярэдадні паўстання і пазней ставіла шэраг пытанняў, якія садзейнічалі яго актывізацыі, у тым ліку сялянскае пытанне і нацыянальнае пытанне. Гэтыя тэмы былі найбольш поўна распрацаваны як у друку пачатку 60-х гг. XIX ст., так і ў публіцыстыцы, прысвечанай паўстанню 1863 г. Асабліва важнае месца ў сацыялагічнай думцы Беларусі таго часу займала сялянскае пытанне. Рэвалюцыянеры-дэмакраты начале з Каліноўскім летам 1862 г. арганізавалі выпуск першай нелегальнай газеты “Мужыцкая праўда”. Сама назва сведчыць аб тым, што ставілася задача перш-наперш разглядаць сялянскае пытанне, абараняць інтарэсы сялянства, прапагандаваць менавіта “мужыцкую праўду”.

“Мужыцкая праўда” адыграла вялікую ролю ў падрыхтоўцы паўстання 1863 г. Яна ўпершыню на беларускай мове несла рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі ў асяроддзе сялян, выхоўвала ў іх нянавісць да прыгонніцтва і самадзяржаўя, заклікала да барацьбы з імі. Кожны нумар “Мужыцкай праўды” прысвячаўся якому небудзь аднаму вельмі важнаму пытанню. Так, першы нумар быў прысвечаны крытыцы рэформы 1861 г., другі – тлумачэнню прычын і сутнасці сацыяльнай няроўнасці, трэці –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

барацьбе за палітычныя свабоды сялян, чацвёрты – несправядлівым наборам рэкрутаў, шосты – абароне ўніяцкай царквы, сёмы – абгрунтаванню неабходнасці паўстання ў беларусі і Літве і падтрымцы паўстання ў Польшчы. Усе нумары “Мужыцкай праўды” так ці інакш прапагандавалі самае галоўнае для сялян пытанне – пытанне аб зямлі. На яе старонках рэвалюцыянеры-дэмакраты адстойвалі радыкальнае для таго часу вырашэнне гэтага пытання – раздзел усёй панскай зямлі без усялякіх выкупаў. Ні паны, ні царскі ўрад, падкрэслівалася ў газеце, дабраахвотна на гэты шлях не стануць. Таму патрэбна не рэформа, а сялянская рэвалюцыя, якая звергне самадзяржаўе, ліквідуе панскае землеўладанне і ўстановіць дэмакратычнае дзяржаўнае кіраванне. Сяляне ў дэмакратычнай дзяржаве праз сваіх выбраных членаў самі будуць вырашаць усе дзяржаўныя і грамадскія справы.

Рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі па нацыянальнаму пытанню ляжалі ў аснове публіцыстыкі беларускіх рэвалюцыянераў-дэмакратаў. Гэтымі ідэямі былі прасякнуты газета “Мужыцкая праўда”, загады і адозвы К. Каліноўскага. Падтрымліваючы польскае паўстанне 1863 г. “Мужыцкая праўда” выражала перадавыя ў той час погляды рэвалюцыянераў-дэмакратаў па нацыянальнаму пытанню.

Лідэр беларускага рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху *Кастусь Каліноўскі* (1838-1864) нарадзіўся ў вёсцы Мастаўляны Гродзенскага павета, цяпер Беластоцкае ваяводства. Маці, Вераніка Рыбінская, памерла маладой, калі Кастусю было пяць гадоў. Бацька, Сямён Сцяпанавіч, заснаваў у Мастаўлянах (1835 ) невялікую ткацкую фабрыку, дзе выраблялі сурвэткі, абрусы і іншыя вырабы з ільну. Потым набыў невялікі фальварак Якутоўка паблізу мястэчка Свіслач у Ваўкавыскім павеце. Туды ў 1849 г. перабралася сям’я, а таксама была перавезена фабрыка. У 1855 г. бацька дамогся зацвярджэння сенатам роду Каліноўскіх у дваранскіх правах. Але матэрыяльнае становішча сям’і, у якой пасля дзвух шлюбаў бацькі было 18 дзяцей, заставалася цяжкім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1847 г. Кастусь паступіў у першы клас Свіслацкай гімназіі. Пасля яе сканчэння (1852) тры гады жыў у Якутоўцы, дапамагаючы бацьку па гаспадарцы і займаючыся самаадукацыяй. У 1856 г. паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта.

Студэнцкія гады мелі вырашальнае значэнне для станаўлення рэвалюцыйнага светапогляду Каліноўскага. Ён захапляўся творамі рэвалюцыянераў-дэмакратаў М. Чарнышэўскага і М. Дабралюбава. Каліноўскі неаднаразова выбіраўся бібліятэкарам-кіраўніком арганізацыі студэнтаў "Огул" – выхадцаў з Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны, узначальваў у ёй найбольш радыкальнае крыло. З утварэннем каля 1858 г. у Пецярбургу ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі Серакоўскага-Дамброўскага, стаў яе актыўным удзельнікам. Летам 1860 г. Каліноўскі паспяхова скончыў універсітэт, а пасля падачы дысертацыі ў студзені 1861 г. быў зацверджаны ў ступені кандыдата правоў.

Вяртанне Каліноўскага на радзіму супала з моцным уздымам вызваленчага руху на Беларусі і ў Літве. На працягу 1861 г. Каліноўскі стварыў на Гродзеншчыне з разначыннай інтэлігенцыі нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю. Разам з В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім летам 1862 г. ён распачаў выданне першай у гісторыі Беларусі нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты "Мужыцкая праўда". На працягу 1862-1863 гг. удалося выдаць сем нумароў. Аўтарам і рэдактарам большасці з іх быў Каліноўскі. "Мужыцкая праўда" упершыню на беларускай мове несла рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі ў асяроддзе сялянства, рыхтавала яго да паўстання. Пасля таго як мясцовыя ўлады аддалі загад пра арышт Каліноўскага, ён цалкам пераходзіць на нелегальнае становішча. З восені 1862 г. Каліноўскі ўзначальвае Літоўскі правінцыяльны камітэт. Вядомы яго прынцыповыя спрэчкі на гэтай пасадзе з рэвалюцыйнымі дзеячамі Варшавы за прызнанне суверэннасці Літвы і Беларусі.

Пасля выбуху паўстання ў Польшчы (студзень 1863) Літоўскі правінцыяльны камітэт заклікаў народы беларуска-літоўскага краю да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўных дзеянняў і абвясціў сябе Часовым рэвалюцыйным урадам Літвы і Беларусі. выпушчаная Каліноўскім “Паўстанцкая інструкцыя” патрабавала суровых захадаў супраць памешчыкаў. Аднак прадстаўнікам ліберальнай плыні (“белым”) удалося адхіліць Каліноўскага і яго паплечнікаў ад кіраўніцтва паўстаннем, захапіць уладу ў паўстанцкай арганізацыі.

Хутка ў паўстанцкай арганізацыі адбыўся новы пераварот. Каліноўскі ўзначаліў Віленскі паўстанцкі цэнтр. Псеўданім і адрас кіраўніка паўстання выдаў на допытах у Менску ўдзельнік паўстання В. Парфіяновіч. У студзені 1864 г. Каліноўскі быў арыштаваны і зняволены. У турме напісаў і здолеў перадаць на волю “Пісьмы з-пад шыбеніцы” – сваё ідэйна-палітычнае завяшчанне. Асуджаны царскім ваенна-палявым судом, ён быў публічна павешаны ў Вільні на гандлёвай плошчы Лукішкі.

Друкаваная і рукапісная спадчына Каліноўскага па аб’ёме невялікая – сем нумароў газеты “Мужыцкая праўда”, шэраг рэвалюцыйных інструкцый, заклікаў, загадаў, а таксама некалькі лістоў, у тым ліку і вядомыя “Пісьмы з-пад шыбеніцы”. Тым не менш яна ўтрымлівае ў сабе шэраг глыбокіх ідэй. Перш за ўсё ў ёй ідзе вострая крытыка феадальна-прыгонніцкіх адносін у Расіі сярэдзіны XIX ст. Каліноўскі глыбока раскрыў сутнасць прыгонніцкай эксплуатацыі ва ўсіх яе формах, паказаў паразітызм памешчыкаў, выключна цяжкае становішча прыгонных сялян Беларусі. Рэвалюцыйны дэмакрат рэзка крытыкаваў варожую народу дзяржаўную машыну абсалютызму, дзе велізарны бюракратычны апарат кіраўніцтва непадсправаздачны і бескантрольны. Ён трапна параўноўваў царскіх чыноўнікаш з саранчой, што знішчае на сваім шляху ўсю расліннасць, ператвараючы аазісы ў пустэчу.

Каліноўскі выкрываў суд царскай Расіі, які быў толькі прыдаткам адміністрацыі і цалкам залежыў ад яе. Каліноўскі параўноўваў царскія суды з воўчай зграяй, дзе не разбіраюцца па сутнасці, а рвуць на часткі, як могуць. Ён паказваў, што на варце інтарэсаў пануючых класаў знаходзіцца армія, якая дапамагае эксплуататарам прыгнятаць народ. Беларускі рэвалюцыйны дэмакрат настойліва рассейваў царысцкія ілюзіі сялян, даказваў, што ўсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беды народа зыходзяць менавіта ад самога цара. Каліноўскі быў перакананым праціўнікам эксплуатататарскага ладу, прыхільнікам карэннай перабудовы грамадства на новых, справядлівых пачатках. Гэта крытыка садзейнічала класаваму асветніцтву беларускіх сялян, рыхтавала іх да барацьбы за новыя сацыяльныя прынцыпы.

Каліноўскі выступаў за рашучую адмену ў будучым грамадстве ўсіх класавых, нацыянальных і рэлігійных прывілеяў і абмажаванняў з тым, каб зрабіць галоўным крытэрыем каштоўнасці чалавечай асобы працу, ацэньваць чалавека па яго рэальных справах і заслугах. Гэтай мерай беларускі сацыяліст-утапіст марыў выкараніць з грамадства марнатраўства і паразітызм прывілеяваных класаў і найперш шляхты.

Арганічнай часткай сацыяльнай утопіі Каліноўскага з'яўляюцца яго ідэі аб выхаванні. Ён даў глыбокую, палітычна завостраную крытыку педагогікі, якая склалася ў сучасным яму грамадстве і падкрэсліваў, што існуючы сацыяльны лад не можа забяспечыць дзецям правільнага выхавання і адукацыі. Больш таго, ён бачыў, што ў тагачасным грамадстве пануючыя класы закрываюць доступ працоўным і іх дзецям да навукі і культуры, не клапоцяцца аб адукацыі і выхаванні сялянскіх дзяцей.

Каліноўскі рашуча выступаў супраць рэакцыйных забабонаў, паводле якіх быццам бы толькі прадстаўнікі вышэйшых класаў здольны вучыцца і займацца навукай. Галоўнай умовай пашырэння асветы ён лічыў карэнную змену існуючых сацыяльна-палітычных адносін. Пакуль народ не будзе свабодны, не будзе ні справядлівасці, ні багацця, ні навукі.

Каліноўскі выказваўся за ўсеагульную адукацыю і выхаванне, якімі будзе займацца непасрэдна дзяржава, за тое, каб школа фарміравала ў дзяцкй высокія грамадскія якасці і гуманістычныя ідэалы. Ён лічыў за неабходнае развіваць асвету і навуку на роднай беларускай мове. Вялікую ролю ў жыцці грамадства адводзіў жанчыне і вырашэнне жаночага пытання бачыў у карэнным пераўтварэнні грамадства.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значнае месца ў будучым грамадстве Каліноўскі адводзіў дэмакратычным формам праўлення. Ён звязваў вызваленне сялянства і ўсіх працоўных з пераходам дзяржаўнай улады ў рукі народа. Найлепшай формай дзяржаўнай улады ён лічыў рэспубліку. Ажыццяўленне ўсіх сваіх сацыяльных праектаў і планаў Каліноўскі звязваў з сялянскай рэвалюцыяй. Разам з тым лічыў магчымым удзел у народнай рэвалюцыі сумесна з сялянамі гараджан і студэнцтва, імкнуўся да саюзу з імі, падкрэсліваў, што ў іх з сялянамі агульныя інтарэсы. Паколькі паўстанне 1863 г. на Беларусі і ў Літве насіла нацыянальна-вызваленчы характар, Каліноўскі не выключаў магчымасці ўдзелу ў ім асобных памешчыкаў, але на такой ідэйнай платформе, якая б не супярэчыла інтарэсам сялян.

### 6.2.2. Францішак Багушэвіч

*Бенядзікт Казіміравіч Багушэвіч* (1840-1900) – яркі выразнік грамадскай думкі Беларусі, ідэолаг нацыянальнага адраджэння, вызваленчага руху, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры.

Нарадзіўся ў фальварку Свіраны Віленскага павета ў сям'і дробнага шляхціца, матэрыяльнае становішча і ўмовы жыцця якога мала чым адрозніваліся ад побыту навакольных сялян. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Віленскай гімназіі, якую скончыў у 1861 г. У тым жа годзе паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, аднак праз два месяцы быў выключаны за удзел у студэнцкіх хваляваннях. Пасля вяртання на радзіму, працаваў настаўнікам у вёсцы Доцішкі. Прыняў актыўны ўдзел у паўстанні 1863-1864 гг. У адным з баёў быў паранены. Ратуючыся ад рэпрэсій вымушаны быў хавацца, а потым пераехаў на Украіну. У 1865 г. паступіў у нежынскі юрыдычны ліцэй. З 1868 г. працаваў у судовых установах. У 1884 г. вярнуўся ў Вільню, дзе распачаў працу прысяжным паверанным у судовай палаце. Менавіта ў віленскі перыяд разгарнулася яго літаратурная і публіцыстычная дзейнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры жыцці паэта пад псеўданімамі былі надрукаваны вершаваныя зборнікі “Дудка беларуская” (Кракаў, 1891), “Смык беларускі” (Познань, 1894), апавяданне “Тралялёначка” (Кракаў, 1892). З 1898 г. Багушэвіч жыў у вёсцы Кушляны. Пахаваны ў вёсцы Жупраны (Ашмянскі раён).

Светапогляд і ідэйныя перакананні Багушэвіча сфарміраваліся ў эпоху ўзнікнення і ўзмацнення вызваленча-дэмакратычнага руху. Афіцыйная імперская ідэалогія Расіі сцвярджала, што такога народа як беларускі не існуе, а ёсць толькі заходняя галіна “усходнеславянскага плямені”. Усе іншыя меркаванні лічыліся варожай польскай інтрыгай, накіраванай на адлучэнне “спрадвечных расійскіх земляў”.

Эпоха шырокага дэмакратычнага руху, этнакультурнай кансалідацыі беларускага народа пачалася паўстаннем 1863-1864 гг. рэвалюцыйная дзейнасць Каліноўскага і яго паплечнікаў сведчыла пра афармленне на Беларусі самастойнай палітычна-вызваленчай плыні, што адпавядала працэсам выспявання нацыянальнай самасвядомасці. Выразнай прыкметай гэтага стала ідэалагічная праграма баларускіх народнікаў, якія ў 1880-я гады ўпершыню ажыццявілі канкрэтны сацыяльна-палітычны аналіз праблемы нацыянальнага самавызначэння беларускага народа. Менавіта ў 1880-я гады разгарнулася і творчая дзейнасць Багушэвіча. Яго актыўны ўдзел у паўстанні 1863-1864 гг. – яскравае сведчанне глыбокага духоўнага адзінства з найважнейшымі антыцарысцкімі, антыфеадальнымі і нацыянальна-вызваленчымі мэтамі. Гэта адзінства ў далейшым пацверджана яго творчай дзейнасцю, дух якой жывіўся ідэямі свабоды і дабрабыту працоўнага народа. Па глыбіні разумення ўнутраных патрэб народнага жыцця і сіле ўплыву на паслядоўнікаў Багушэвіч стаў першым сапраўды народным выразнікам тыповых рыс і асаблівасцей нацыянальнай свядомасці, духоўным пачынальнікам і натхняльнікам працэсу нацыянальнага самаўсведамлення і адраджэння прыгнечанага народа, заснавальнікам новай беларускай літаратуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўмовах прыгнечання і дыскрымінацыі народа і яго культуры менавіта літаратура была адзіна магчымым сродкам і формай выяўлення сукупнасці грамадска значных ідэй, настрояў і патрэб. У публіцыстычных прадмовах і праграмных вершах Багушэвіча выказаны асноватворныя прынцыпы ідэалогіі нацыянальнага вызвалення.

Праблему мовы Багушэвіч вылучае як асноўную праблему нацыянальнага жыцця: “Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю…, а потым і зусім замерлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай каб не ўмерлі”. Багушэвіч лічыў нацыянальную мову найважнейшай формай выяўлення духоўнасці народа. “Язык ёсць адзежа душы”, “Беларусь там, дзе наша мова жыве”.

Пры абгрунтаванні вызваленчых памкненняў народа Багушэвіч звяртаўся да эпохі Вялікага княства Літоўскага, проціпастаўляючы тагачасны росквіт беларускай культуры бяспраўнаму і прыгнечанаму становішчу народа ва ўмовах панавання царскага самаўладдзя.

Выступаючы ад імя ўсяго працоўнага беларускага народа. Багушэвіч быў пераважна ідэалагічным прадстаўніком працоўнага сялянства. З сялянствам, а таксама з дэмакратычнай інтэлігенцыяй звязваў ён свае вызваленчыя ідэалы.

У сацыялогіі Багушэвіч зыходзіў з факта размежавання грамадства на “панства” – прыгнятальнікаў і народ – людзей працы. Падзел грамадства ён рабіў на аснове фіксацыі канкрэтных абставін іх рэальнага жыццёвага існавання. Гэта вынік перакананняў пісьменніка, у аснове якіх прызнанне антыгуманнай сутнасці рэчаіснасці, антынароднага характару феадальна-прыгонніцкай сістэмы панавання, разуменне неабходнасці іншых высноў грамадскага жыцця. Дэмакратычная ідэалогія Багушэвіча будавалася на адмаўленні каштоўнасцей, уласцівых феадальна-самадзяржаўнаму ладу. Погляд на народ, як на жывую і сапраўдную рэальнасць гісторыі і грамадскага жыцця яскрава выявіўся ў мастацкіх творах Багушэвіча. Ідэя гістарычнага прызначэння мас, самастойнасці іх грамадска-палітычнага і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духоўнага развіцця для Багушэвіча была ідэяй народнай свабоды, такім будучым станам жыцця і чалавечых адносін, які адпавядаў бы сапраўднай ролі народа-працаўніка. Свабоду ён усведамляў найперш як пабудову новага грамадскага жыцця, якая не ведае падначалення адных у імя панавання другіх, нямногіх. На яго трактоўцы праблемы свабоды адбіліся тыповыя сялянскія ўяўленні пра свабодную працу на свабоднай зямлі, не пазбаўленыя аднак ураўняльнасці і ўтапізму. Свабоду ён разумеў як сапраўдны чалавечы стан, дасягненне якога несумяшчальнае з тагачаснымі грамадскімі адносінамі. Сутнасць варожага людзям працы грамадства ён раскрываў як сацыяльную, жыццёвую і духоўную няроўнасць, што ахоўваецца ўсім дзяржаўна-бюракратычным апаратам насілля.

Чалавека Багушэвіч бачыў пераважна ў сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным плане. Чалавек у яго выступаў абагульнена-канкрэтнай праявай сутнасці і памкненняў пэўнай агульнасці. Вобраз чалавека ўзбагачаўся ўнутранымі сацыяльна-псіхалагічнымі вымярэннямі. У яго творах селянін сам выказвае свае адносіны да канкрэтных з’яў рэчаіснасці, сам гаворыць пра свае інтарэсы і патрэбы.

Прынцып рэалізму і народнасці – аснова творчасці Багушэвіча, дэмакратычны характар якой выразна раскрыўся ў падыходзе да народнага жыцця як галоўнага аб’екта мастацкага адлюстравання. Імкненне садзейнічаць уздыму самасвядомасці беларускага народа вызначыла і кірунак дзейнасці Багушэвіча ў галіне літаратуры, а таксама разуменне яе грамадскага прызначэння як істотнага фактара нацыянальнай кансалідацыі беларускага народа.

Моцным і шматгранным было ідэйна-творчае ўздзеянне Багушэвіча на паслядоўнікаў. Увесь наступны працэс фарміравання дэмакратычнай ідэалогіі, новай літаратуры, грамадскай думкі адзначаны свядомым наследаваннем яго спадчыны. Пра гэта красамоўна сведчыць творчая дзейнасць Адама Гурыновіча, Алаізы Пашкевіч (Цёткі), Янкі Купалы, Якуба Коласа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 6.2.3. Янка Лучына. Адам Гурыновіч

Паэт-дэмакрат і грамадскі дзеяч *Янка Лучына* (1851-1897) нарадзіўся ў Менску. Пасля заканчэння гімназіі, паступіў на матэматычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Праз некаторы час перавёўся на механічнае аддзяленне Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута, якое скончыў у 1886 г. У 1877-79 гг. працаваў у Тыфлісе. Служыў у тэхнічным бюро Лібава-Роменскай чыгункі ў Менску.

У 1886 г у газеце "Менскі лісток" надрукаваўт верш "Не дзеля славы ці разліку". Там жа ўпершыню паэт выступіў з беларускамоўным вершам "Вясновай парой".

Адметнымі рысамі мастацкай творчасці Лучыны з'яўляюцца гуманістычная накіраванасць, дэмакратызм, арганічнае зліццё голасу аўтара з голасам простага народа. Селянін, паводле Лучыны, не толькі ўвасабляе сабою Радзіму, але як носьбіт лепшых маральных якасцей сімвалізуе крыніцу яе годнага жыцця. Лучына быў упэўнены, што шаноўнае стаўленне селяніна да зямлі не толькі выяўляе яго светаадчуванне, але таксама фарміруе светапогляд вяскоўца. Паэт расказвае пра лёс селяніна-беларуса, яго паднявольнае, змрочнае жыццё. Адначасова ён раіць вяскоўцу мець свой уласны розум, не спадзявацца на парады суседзяў.

Сіла беларуса, лічыў паэт, у яго цярплівасці, у непахіснасці каштоўнаснай арыентацыі, у жыццярадаснасці і аптымізме. Паводле разумення Лучыны, супярэчлівасць светапогляду беларуса (вера ў сваю сілу і вера ў прадвызначальнасць свайго лёсу) характарызуе яго вялікія духоўныя магчымасці і інтэлектуальныя здольнасці. Вясковец, на думку Лучыны, гэта адначасова і магутны пераўтваральнік свету, і бездапаможная ахвяра сацыяльнай несправядлівасці.

Усеагульны недахоп духоўнасці аўтар звязваў з людской нядоляю, з вынішчэннем старога ўкладу і агрэсіўным наступам тэхнічнага прагрэсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Светапогляд Лучыны грунтаваўся на тэорыі ўнікальнасці, непаўторнасці кожнай чалавечай істоты. Разам з тым, паэт схіляўся да рацыяналістычнай філасофіі, якая лічыла, што рэчаіснасць падпарадкоўваецца ўсеагульным прынцыпам розуму, зыходзячы з якіх можна зразумець і інтэрпрэтаваць кожную з’яву.

*Адам Гурыновіч* (1869-1894) – паэт-дэмакрат і фалькларыст. Паходзіў з татарска-шляхецкага роду. Бацькава сям’я жыла ў Кавалях, цяпер вёска Кавалькі Мядзельскага раёна. У час вучобы у Віленскім рэальным вучылішчы малады Адам пачаў цікавіцца беларускім фальклорам і пытаннямі грамадскага жыцця. У 1887 г. ён паступае ў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут, дзе займаецца не толькі тэхнічнымі навукамі, але працягвае цікавіцца літаратурай. Гурыновіч вывучае працы беларускіх фалькларыстаў Насовіча і Шэйна, знаёміцца з грамадска-палітычнымі творамі. У гэты час ён уваходзіць у студэнцкі “Гурток моладзі польска-літоўска-беларускай і маларускай”, які утварыўся ў 1889 г. і хутка быў скіраваны ў бок падпольнай антыурадавай арганізацыі, цесна звязанай з іншымі рэвалюцыйнымі арганізацыямі Пецярбурга. У 1893 г. быў арыштаваны ў Вільні. Турэмнае зняволенне падарвала здароўе Гурыновіча. Яго выпусцілі з-за хваробы і выслалі пад надзор паліцыі ў бацькоўскі фальварак, дзе ён неўзабаве памёр.

У прысвечаных Багушэвічу радках “Дзякуй табе браце “, Гурыновіч паказвае сваю вернасць закладзенай традыцыі. На думку аўтара, творчасць Багушэвіча стала голасам самога народа. У рамках традыцыі Багушэвіча знаходзіцца і абарона Гурыновічам беларускай мовы, як асновы нацыянальнага жыцця.

Ідэйна-эстэтычнай пазіцыі Гурыновіча ўласцівы новыя рысы, абумовіўшыя выражэнне матыву сацыяльнай помсты панству. На аснове ўсведамлення эксплуататарскай сутнасці існуючых парадкаў, у Гурыновіча нараджаецца ідэя збірання народных сіл. Паэт бачыць парасткі нацыянальнай самасвядомасці беларуса і адлюстроўвае гэта ў сваёй творчасці. Аўтар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

упэўнены ў тым, што недалёкі той час, калі яго герой падымецца да новага жыцця, бо “прыдуць неяк часы лепшыя”.

Творчыя намаганні Гурыновіча не паспелі разгарнуцца больш шырока. Яго невялікая па аб’ёму літаратурная спадчына стала больш вядомай толькі пасля Кастрычніка 1917 г. Тым на менш, дзейнасць Гурыновіча – гэта адметная з’ява ў грамадскім і мастацкім жыцці Беларусі напрыканцы XIX ст.

## Тэма 7. Філасофія Беларусі XX – пачатку XXI ст.

Лекцыя I

План

7.1.1. Станаўленне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні ў грамадскай думцы пачатку XX ст.

7.I.2. Абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці ў творчасці Янкі Купалы

7.I.3. Філасофскае задуменне над жыццём Якуба Коласа

7.1.4. Алаіза Пашкевіч (Цётка)

7.I.5. Максім Багдановіч

### 7.1.1. Станаўленне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні ў грамадскай думцы XX ст.

Пасля адмены царскім урадам забароны на беларускамоўныя публікацыі (1905 г.), узнікаюць першыя беларускія выдавецтвы – “Загляне сонца і ў наша ваконца” у Пецярбургу, “Наша ніва”, “Наша хата”, “Палачанін” у Вільні і інш. Асобная роля сярод іх належыла “Нашай ніве”, дзякуючы якой быў выхаваны і накіраваны да адказнай місіі магутны гурт будучых беларускіх пісьменнікаў-класікаў, буйных грамадска-палітычных і культурных дзеячаў, сапраўдных нацыянальных ідэолагаў. Такімі выступілі Я. Купала, Я. Колас, А. Пашкевіч (Цётка), М. Багдановіч, А. Гарун, З. Бядуля, браты А. і І. Луцкевічы, Я. Карскі, У. Ластоўскі, Б. Тарашкевіч, У. Галубок, Я. Лёсік, Я. Драздовіч і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходна адзначыць, што ў дадзены перыяд даволі значная частка дэнацыяналізаванай буржуазна-ліберальнай інтэлігенцыі ў Беларусі працягвала ідэнтыфікаваць сябе з расійскай “імперскай культурай”, звязвабчы яе з ідэямі аўтараў зборніка “Вехи” і рэлігійных мадэрністаў. Выразнікамі такіх поглядаў былі публіцысты Я. Окунь, Д. Мейчык, В. Самойла і інш. На старонках афіцыйнага рупару царызму – газеты “Северо-западный край” яны ставілі пытанне палітычнай арыентацыі “русской интеллигенции”, выказвалі варожыя адносіны да рэвалюцыі і нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа.

Аднак пад’ём рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі значна актывізаваў дзейнасць рэвалюцыйна-дэмакратычнага накірунку. У светапоглядзе і творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, А. Пашкевіч (Цёткі), М. Багдановіча ўсё больш выразна пачало праяўляцца ўсведамленне неабходнасці рэвалюцыйнага вырашэння асноўных сацыяльных праблем. Выступаючы ад імя ўсяго працоўнага народа, яны ў сваёй грамадска-палітычнай праграме на першы план ставілі патрабаванні агульнадэмакратычнага характару – ліквідацыю самадзяржаўя, дэмакратызацыю грамадскага жыцця, свабоднае развіццё нацыянальнай культуры.

### 7.1.2. Абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці ў творчасці Янкі Купалы

*Янка Купала* (1882-1941), належыць да найбольш значных прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычнага накірунку ў грамадскай думцы Беларусі пачатку ХХ ст.

Паэт вельмі рана абвострана адчуў сацыяльную і нацыянальную несправядлівасць. Ён выступіў як паслядоўны рэвалюцыйны дэмакрат, заклікаўшы да рэвалюцыйнай барацьбы супраць цара і памешчыкаў. Купала звяртаецца з заклікам да ўсіх працоўных Беларусі паўстаць усім разам каб стварыць адзіны фронт барацьбы за свабоду і шчасце людзей працы. З гневам

ён піша аб растрэле царскімі войскамі мінскіх рабочых на мітынгу 29 кастрычніка 1905 г. (“Водклік з 29 кастрычніка 1905 г. у Мінску”). Гэты і іншыя вершы паэта атрымалі шырокую вядомасць. Яны кваліфікаваліся царскімі ўладамі як “антигосударственные”. У іх бачылі “открытое подстрекательство к действиям явно бунтарским”.

Купала заяўляе аб праве беларускага народа на свабоднае развіццё сваёй роднай культуры. Мове і нацыянальнай культуры прысвячаюцца такія радкі, як: “Роднае слова”, “Ворагам беларушчыны”, “Маладая Беларусь” і інш. У публіцыстычных артыкулах, змешчаных у “Нашай ніве”, Купала вёў барацьбу супраць расійскіх шавіністаў і польскіх нацыяналістаў. Якія негатыўна ставіліся да ўсяго беларускага.

Эстэтыка Купалы была генетычна звязана з эстэтыкай Ф. Багушэвіча. Пры гэтым ён здолеў пераадолець статычнасць свайго папярэдніка, увёў у свае творы актыўнага героя, які з’яўляецца тыповым прадстаўніком працоўнага народа і разам з тым носьбітам ідэальнага, духоўнага пачатку – паэтам, выразнікам думак і надзей працоўнага сялянства.

Пазітыўная праграма Купалы вырастала на аснове мастацкага спасціжэння існуючай рэчаіснасці, на глебе адкрыцця рэальных жыццёвых супярэчнасцей той пары.

У гуманістычнай канцэпцыі Купалы галоўнае месца займаў чалавек працы. Грунтаванне на традыцыі народнай культуры вызначыла асобны характар адносін паэта і народа, калі кроўная сувязь паміж імі ператвараецца ў адказнасць мастака за лёс усіх людзей.

Праблема прызначэння мастацтва., паэзіі ў грамадскім жыцці, выступала ў эстэтыцы Купалы як праблема адзінства народа і мастака. Лірыка Купалы паказвае яго глыбокае разуменне паэзіі як адлюстравання інтарэсаў і надзей простага чалавека (“Я не для вас, паны…”).

Эстэтыка Купалы станавілася такім чынам, выражэннем працэсу фарміравання сацыяльнай, нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, даследаваннем і фіксацыяй складаных працэсаў духоўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызвалення шырокіх мас у перыяд абвастрэння карэнных сацыяльных супярэчнасцей і разгортвання вызваленчай барацьбы ў пачатку XX ст.

Пастаянна ідучы па шляху ўсведамлення і раскрыцця трагічных супярэчнасцей народнага жыцця ва ўмовах буржуазна-памешчыцкай рэчаіснасці (лірыка 1905-1909 гг., "Адвечная песня", "Сон на кургане"), паэт падняўся да сцвярджэння неабходнасці барацьбы, праславіў гераічныя намаганні, накіраваныя на пераадоленне трагічных калізій сучаснага яму жыцця (лірыка 1910-1913 гг., "Курган", "Бандароўна").

Трагічнае ў эстэтыцы Купалы стала сферай усведамлення карэнных сацыяльных супярэчнасцей рэчаіснасці. Раскрыццё трагізму гістарычнага і сацыяльнага становішча беларускага народа ў эксплуататарскім грамадстве было адной з найважнейшых задач рэваплюцыйна-дэмакратычнай эстэтыкі Купалы.

### 7.1.3. Філасофскае задуменне над жыццём Якуба Коласа

Ідэйна-эстэтычныя погляды Якуба Коласа (1882-1956) фарміраваліся ў канкрэтна-гістарычных умовах грамадска-палітычнага жыцця Беларусі пачатку XX ст.

У літаратуры і эстэтыцы Колас у дакастрычніцкі перыяд усталёўваў прынцыпы рэвалюцыйнага дэмакратызму, актыўна садзейнічаў умацаванню і развіццю народнага рэалістычнага мастацтва, якое выступала сродкам рэвалюцыйнай барацьбы і вызвалення працоўных мас. Ён стаў стваральнікам нацыянальнага эпасу, падняўшыся да ўсебаковага адлюстравання розных праяў жыцця беларускага народа, паказваючы яго магутную стваральную сілу.

Рэалістычная накіраванасць погляда Коласа на свет выразна вызначылася ў яго паэтычным маніфесце – вершы "Не пытайце, не прасеце…"(1904). Непрыглядная карціна беларускай вёскі той пары выступае сімвалам нядолі чалавека працы. Не можа нарадзіцца светлая песня там, дзе голад і галеча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэвалюцыйныя падзеі 1905-1907 гг. аказалі вялікі ўплыў на мастацкае светаадчуванне паэта. Колас імкнецца паказаць ва ўсёй велічы духоўную прыгажосць працоўнага чалавека. Матывы трагічнага змяняюцца верай у светлую будучыню народа: “Вер брат,- жыццё залатое будзе ў нашай старане”. У вершах “Кіньце смутак”, “Не бядуй”, “Наша возьме”, “Мужык” і інш. Усё мацней праяўляецца тэндэнцыя да адлюстравання складаных змен у свядомасці народа, выкліканых вызваленчай барацьбой беларусаў супраць царызму. Колас у сваім мастацтве адхіляе ўсялякія абстракцыі, асабліва тады, калі гаворка ідзе аб народным жыцці, якое для яго з’яўляецца асновай існасці. Таму паэта так прыцягваюць канкрэтныя праявы народнага жыцця, зямля, чалавек працы, адносіны паміж людзьмі. Высокая ступень эстэтызацыі селяніна-беларуса у Коласа абумоўлена працоўнай і маральнай значнасцю апошняга. Не менш істотнай у гэтых адносінах аказалася сацыяльная актыўнасць героя, яго гатоўнасць да барацьбы за народныя інтарэсы.

Творчасць Коласа – філасофія, заключаная ў вобразе, гэта перажытыя і адчутыя адкрыцці аўтара як у прыродна-касмічным універсуме, так і ва ўніверсуме душы чалавека.

Я не зайздрошчу тым з вас, брацці,
Каго спрадвечныя закляцці
Не парушалі, на тамілі
І цяжкім каменем не білі...(VI. 242).

Запытанні аб існасці павінны спалучацца з асаблівым станам душы, з адметным накірункам розуму, аб якіх гаворыць Колас:

На філасофскі часам лад
Настроіш думкі ты ў самоце…(І. 76).

Коласа-мысліцеля глыбока закранае праблема пазнання прыроды чалавека, тайна яго лёсу, месца ў грамадстве і сусвеце, сэнс жыцця. Пранікаючы ў глыбіні існасці, Колас бачыць чалавека з яго пакутамі, пошукамі, сумненнямі ў трагічнай супярэчлівасці жыцця:

Куды ты йдзеш, чаго шукаеш?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Які ты ў сэрцы смутак маеш? (V. 255).

Сапраўдным сэнсам жыццё людзей надзяляе праца на сваёй роднай зямлі. Менавіта “зямля-маці” фармруе сэнса-жыццёвыя каштоўнасці беларуса-селяніна:

Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы…(VI. 229).

Прырода паўстае ў творах Коласа ў часе і прасторы, у адкрытых і ўтоеных яе пераходах. Колас часта разважае аб розных яе станах, аб жывой дыялектычнай разнастайнасці, аб існасці прыроды. Адчуванне Коласам свайго адзінства з прыродай, ўздымае паэта на прынцыпова новы ўзровень спасціжэння існага:

І ў тон адзін з зямлёю я пяю,
І кожны міг сябе я пазнаю
Часцінкай злітнага вялікага сусвету (II. 114).

Такім чынам, творы Коласа ўтрымліваюць той магутны філасофскі патэнцыял, дзякуючы якому пісьменнік дапамагае нам сёння знайсці свой адказ на “спрадвечныя закляцці” існага.

**7.1.4. Алаіза Пашкевіч (Цётка)**

*Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч* (1876-1916) нарадзілася ў вёсцы Пяшчаны Лідскага павета ў сялянскай сям’і. У 1894 г. паступіла ў прыватную жаночую гімназію ў Вільні. Праз два гады вымушана была з-за хваробы вярнуцца ў вёску. Працавала настаўніцай. Затым у Вільні скончыла сёмы клас гімназіі.

У 1902 г. пераехала ў Пецярбург і паступіла на вышэйшыя педагагічныя курсы П.Ф. Лесгафта. Два гады жыла і вучылася ў Пецярбурзе. Да гэтага ж часу адносяцца яе першыя паэтычныя вопыты.

Вярнуўшыся ў 1904 г. ў Вільню, Алаіза Пашкевіч ўключаецца ў рэвалюцыйна-прапагандысцкую дзейнасць. У 1905 г. у Нова-Віленскай бальніцы, дзе яна працавала, была створана рэвалюцыйная арганізацыя, якая



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ставіла мэтай падрыхтоўку народных мас да ўзброенага паўстання. Пашкевіч прымала актыўны ўдзел у рабоце гэтай арганізацыі. Яе творы “Хрэст на свабоду”, “Пад штандарам”, “Мора”, “Прысяга над крывавымі разорамі” распаўсюджваліся ў Вільні ў 1905 г. як лістоўкі. Паліцэйскія праследаванні вымусілі яе пераехаць у Мінск, а потым у Львоў. У 1906 г. у Жолкаве, паблізу Львова, былі выдадзены два зборнікі “Хрэст на свабоду” і “Скрыпка беларуская”.

Пасля вяртання на радзіму ў 1911 г. супрацоўнічала ў “Нашай ніве”, выдавала першы беларускі часопіс для дзяцей “Лучынка”, стварала беларускія школы. Зімой 1916 г. захварэла тыфам і памерла 5 лютага.

Сваю літаратурную дзейнасць Цётка ставіла ў прамую залежнасць ад творчасці Ф. Багушэвіча. У вершы “Музыка беларускі” выразна бачны рысы падабенства з яе паэтычным папярэднікам. Песня музыкі – гэта песня аб мужыцкай долі, у якой гучаць смутак і адчай. У свеце, згодна паэтычнаму герою Цёткі, вельмі многа чорнай фарбы. Праз вобраз цяжкай мужыцкай долі аўтар паказвае рэалістычную карціну жыцця простага селяніна-беларуса.

Ідэал Цёткі – барацьба чалавека за свабоду. Свабоду яна звязвае з дасягненнем канкрэтных мэт – звяржэннем самадзяржаўя, надзяленнем селяніна зямлёй, развіццём нацыянальнай культуры. І хаця такая праграма не выходзіла за рамкі агульнадэмакратычных пераўтварэнняў, паслядоўная барацьбв за гэтыя мэты ў пачатку ХХ ст. была прагрэсіўнай і садзейнічала пашырэнню вызваленчай барацьбы ў беларускім грамадстве.

Паэтэсе не суджана было ўбачыць новае жыццё беларускага народа, аднак яе рэвалюцыйныя вершы садзейнічалі набліжэнню прагрэсіўных сацыяльных змен на беларускай зямлі.

### 7.1.5. Максім Багдановіч

*Максім Багдановіч* (1891-1917) пражыў вельмі кароткае жыццё, але ў літаратурнай творчасці заявіў аб сабе як сталы класік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нарадзіўся будучы паэт у Мінску. Яго бацька быў вядомым беларускім этнографам, фалькларыстам, гісторыкам. Дзяцінства паэта прайшло ў Гродне. Пасля смерці маці ў 1896 г., сям'я пераязджае ў Ніжні Ноўгарад, дзе ў 1902 г. Максім паступае ў першы клас мужчынскай гімназіі. У 1907 г. бацьку пераводзяць па службе ў Яраслаўль. Там будучы паэт заканчвае гімназію, потым юрыдычны ліцэй.

Першы друкаваны твор – алегарычнае апавяданне "Музыка" з'явіўся ў газеце "Наша ніва" ў 1907 г. Першы і адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў "Вянок" выйшаў у Вільні ў 1913 г.

Нараджэнне Багдановіча як беларускага паэта прадвызначыў не толькі ўплыў бацькі, але і працэсы сацыяльна-палітычнага, культурна-адраджэнскага характарц, звязаныя з агульнай грамадскай абстаноўкай на Беларусі пасля рэвалюцыі 1905 г.

Лёс Радзімы, лёс народа асабліва хвалюе паэта. Папярэджаннем аб катастрофе, звязанай са стратай галоўнага носьбіта духоўных каштоўнасцей роднай культуры гучаць радкі:

Народ, Беларускі Народ!
Ты – цёмны, сляпы, быццам крот.
Табою заўжды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі,-
У ёй нават мовы няма…

Асобная старонка – проза Багдановіча, ў якой філасофскай глыбінёй вылучаецца "Апокрыф" (1913). Аўтарам супрацьпастаўляюцца два вобразы – коласа і васілька. Колас – хлеб штодзённы, васілёк – сімвал прыгажосці. Добра быць коласам, але зайздросны лёс тых на свеце, хто нарадзіўся песняром, мастаком. "Бо нашто каласы, калі няма васількоў? Навошта людзі, каб не было іх памкнення да прыгожага, да ідэалу?".

Вельмі значнае месца ў творчасці Багдановіча займае публіцыстыка. Ён адным з першых у Беларусі паставіў і пачаў распрацоўваць шэраг



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадалагічных і гісторыясофскіх пытанняў. Сярод лепшых публіцыстычных твораў – артыкулы “Беларускае адраджэнне”, “Хто мы такія?”, “Новая інтэлігенцыя”. У першым артыкуле даецца перыядызацыя нацыянальна-вызваленчага руху на працягу XIX – пач. XX ст., фармулююцца яго канкрэтныя патрабаванні. У артыкуле “Новая інтэлігенцыя” абгрунтавана ідэя адкрытасці беларускага народа, яго культуры. Разам з тым Багдановіч выказвае перасцярогу адносна абсалютызацыі знешняга ўплыву, каб пазбегнуць дэнацыяналізацыі беларускага народа.

Аднаўленнем друку на роднай мове, стварэннем беларускай літаратурнай класікі, гістарычнымі даследаваннямі навукоўцаў, станаўленнем нацыянальных школ у тэатральным і выяўленчым мастацтве завяршыўся даволі працяглы ў часе перыяд нацыянальнага Адраджэння – другая яго хваля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 7. Філасофія Беларусі XX – пачатку XXI ст.

Лекцыя 2.

План

7.2.1. Даследаванні філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў 20 – 30-я гг. XX ст.
7.2.2. Пытанні гісторыі рускай філасофіі.
7.2.3. Аналіз гісторыі заходнееўрапейскай філасофіі.
7.2.4. Філасофская навука ў другой палове XX ст.

### 7.2.1. Даследаванні філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў 20 – 30-я гг. XX ст.

Разгледжаны намі ў папярэдніх тэмах матэрыял сведчыць аб тым, што перадумовы філасофскай думкі Беларусі цягнуцца з глыбінь нацыянальнай гісторыі і культуры. Аднак перадумовы (перш-наперш гістарычная свядомасць і самасвядомасць народа) яшчэ не сама з’ява, яны толькі

рыхтуюць яе нараджэнне і развіццё. З’ява ж пачынаецца толькі тады, калі ўзнікае форма адэкватная зместу. Гэта адбылося пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі (1917 г.) ў 20-я гг., калі ўзнялася трэцяя хваля нацыянальнага Адраджэння. У рэспубліцы ў той час былі створаны інстытуцыйныя асновы для развіцця філасофіі – адкрыты першыя навуковыя ўстановы (БДУ, 1921 г.), кафедры, разгорнута падрыхтоўка першых нацыянальных навуковых кадраў. У выніку інстытуцыяналізацыі філасофская думка Беларусі шырока заявіла аб сабе на сваёй роднай мове.

Моцны ўздым нацыянальнай самвсвядомасці выклікаў глыбокі інтарэс да гісторыі свайго народа, да яго духоўнай культуры. Сапраўднай энцыклапедыяй беларусазнаўства стала кніга *Я. Карскага* “Беларусы” (1921), над якой вучоны пачаў працаваць яшчэ да рэвалюцыі. У ёй былі змешчаны звесткі аб Беларусі, яе насельніцтве, дадзены нарысы гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, дыялекталогіі беларускага народа, акрэслены межы беларускай мовы, састаўлена падрабязная бібліяграфія, пералічаны ў храналагічнай паслядоўнасці ўсе працы па беларускай мове, беларускай гісторыі і этнаграфіі, прыведзены назвы асноўных помнікаў беларускага пісьменства і іх выданні. Праца Карскага – гэта першая спроба грунтоўнага вырашэння найважнейшых пытанняў, звязаных з гісторыяй беларускага народа, яго мовы і літаратуры.

Праблемы нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальнай ідэнтычнасці занялі вядучае месца ў даследаваннях *Ігната Абдзіраловіча* (1896-1923). У 1921 г. была выдадзена яго праца “Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага светапогляду”. Радкі гэтага твору вызначаліся не толькі актуальнасцю, але і канцэптуальным характарам аўтарскіх абагульненняў і высноў. У працы прасочваўся драматызм гістарычнага лёсу беларускага народа, падкрэслівалася яго імкненне да незалежнасці. Аналізуючы становішча беларусаў у геапалітычнай прасторы паміж Усходам і Захадам, Абдзіраловіч упершыню тэарэтычна абгрунтаваў уздзеянне гэтых дзвюх “культурных тыпаў” на Беларусь. Згодна Абдзіраловічу, вынікі такога



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўплыву ў гістарычным працэсе самым нечаканым чынам адбіліся на жыцці народа. Так, разам з ідэямі гуманізму, лібералізму, дэмакратыі на тэрыторыю Беларусі з Захаду прыйшлі эканамічны ўціск і эксплуатацыя чалавека чалавекам. Усход, у сваю чаргу, прынёс пагарду да асобы, уціск яе правоў і свабод. Аўтар адстойваў ідэю адраджэння сапраўды нацыянальных формаў жыцця, тых якія б былі здольнымі супрацьстаяць “іншаземнаму месіянству”. Ён падкрэсліваў, што гэтыя формы не прыходзяць звонку, кожная з іх – плод духоўнага развіцця народа. Паколькі ж беларускі народ на працягу доўгага гістарычнага перыяду быў пазбаўлены магчымасці быць суб’ектам свайго гістарычнага лёсу, ён павінен прыйсці да гэтай мэты шляхам самастойнай і адказнай сацыяльнай творчасці – такі галоўны вынік працы Абдзіраловіча.

Істотнае месца сярод даследаванняў духоўнай культуры беларускага народа належыць выпушчанаму ў 1926 г. юбілейнаму зборніку “Чатырохсотлецце беларускага друку”. Выхадам яго ў свет быў пакладзены пачатак сістэматычнаму і паглыбленаму вывучэнню гісторыі нацыянальнай думкі. У стварэнні кнігі прыняла ўдзел вялікая група вучоных (*У. Пічэта, У. Перцаў, М. Шчакаціхін, З. Жылуновіч, М, Піотуховіч, В. Дружчыц* і інш.). У зборніку разглядалася развіццё ВКЛ у XVI ст., даследаваўся светапогляд найбольш выдатных дзеячаў беларускай культуры таго часу. Асаблівую ўвагу аўтары артыкулаў засяродзілі на асобе Ф. Скарыны. Матэрыялы пра Скарыну былі вельмі разнастайнымі па характару. Так, гісторык *А. Ясінскі* даследаваў культурнае развіццё Чэхіі ў пачатку XVI ст., *Д. Ягораў* прывёў падрабязныя звесткі пра Падуанскі ўніверсітэт XV-XVI ст., дзе ў свой час Скарына атрымаў ступень доктара “лекарскіх навук”, *Я. Воўк-Левановіч* прааналізаваў мову скарынаўскіх выданняў Бібліі.

У артыкуле “Францішак Скарына і яго літаратурная дзейнасць”, змешчаным у зборніку, *М. Піотуховіч* характарызаваў Скарыну як выдатнага гуманіста, у працах якога выяўляюцца “яркія ўзоры нацыянальнай самасвядомасці”. Грунтоўна прааналізаваўшы прадмовы Скарыны да розных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выданняў Бібліі, ён зрабіў выснову аб крытычных адносінах асветніка да тэкстаў “Святога пісання”.

Істотны ўклад у даследаванне ветапогляду скарыны ўнёс *У. Пічэта.* У сваіх артыкулах, змешчаных у зборніку, ён грунтоўна разгледзеў шматлікія аспекты дзейнасці беларускага асветніка. Эпоху, у якую жыў і працаваў выдатны гуманіст, ахарактарызаваў як “*беларускае Адраджэнне*”. Адметнай рысай гэтага часу, на думку аўтара, быў гуманістычны рух, нацыянальны ў сваёй аснове і індывідуалістычны па свайму характару. У працы “Скарыніяна” Пічэта разгледзеў асноўныя пытанні, якія паставіла і паспрабавала вырашыць гістарыяграфія XVIII-пачатку XX ст. Да іх ліку належылі: вызначэнне часу і месца выданняў Скарыны, высвятленне крыніц, якія паслужылі асновай для яго перакладаў, вывучэнне мовы выданняў Скарыны і інш.

Скарына называў сваю мову “рускай мовай”, супрацьпастаўляючы ёй “мову славянскую*”. Я. Воўк-Левановіч*, падрабязна разгледзеўшы мову перакладу Скарынавай Бібліі, зрабіў выснову, што “жывая беларуская мова эпохі Скарыны ў большасці характэрных рыс – фанетыкі, марфалогіі і словах была такой, якой мы яе ведаем цяпер”.

Вялікую ўвагу Скарыне *ўдзяляў Я. Карскі*. У сваім фундаментальным даследаванні “Беларусы”, ён адзначаў, што ў асобе Скарыны мы маем выдатна адукаванага чалавека свайго часу, які ніколькі не ўступаў заходнееўрапейскім дзеячам, ні сваім розумам, ні энергіяй і высокімі задумамі.

Значную цікавасць у даследчыкаў выклікаў артыкул *А. Харэвіча* “Скарына і яго эпоха” (1925). Даючы характарыстыку сацыяльна-эканамічнага становішча ВКЛ у канцы XV-пачатку XVI ст., аўтар звярнуў увагу на развіццё буйнага землеўладання і звязаных з ім шляхецкіх вольнасцей, становішча гарадоў, маральны заняпад царквы. У ідэалогіі Скарыны навукоўца бачыў рэакцыю на рэлігійна-схаластычнае разуменне сярэднявечча.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускія мастацтвазнаўцы ў сваіх працах закраналі пытанне аб гравюрах і аздобах у выданнях Скарыны. Так, *М. Шчакаціхін*, першапачаткова аднёс некаторыя з гравюр пражскай Біблii Скарыны да чэшскай мастацкай традыцыі. Аднак далейшыя даследаванні дазволілі яму зрабіць выснову, што Скарына сам ілюстраваў свае выданні. Даследчык выказаў таксама цікавую гіпотэзу аб даце нараджэння самога Скарыны. Звярнуўшы ўвагу на герб Скарыны, дзе сонца напалову заслонена месяцам, ён выказаў меркаванне, што Скарына нарадзіўся менавіта тады, калі адбылося сонечнае зацьменне, бачнае ў яго родным горадзе - Полацку. Такое зацьменне, згодна з астранамічнымі дадзенымі, было зафіксавана 6 красавіка 1486 г.

Важнае месца ў першых працах беларускіх навукоўцаў адводзілася С. Буднаму. *Я. Карскі* даследаваў перапіску Буднага з праваслаўным тэолагам Арцеміем, якая данесла некаторыя звесткі аб светапоглядзе беларускага мысліцеля. З аналізу, праведзенага Карскім, вынікала, што Будны выступаў як прадстаўнік рацыянальна-натуралістычнага падыходу да рэлігійна-філасофскіх пытанняў. Тым самым ён выражаў прагрэсіўныя патрабаванні сваёй эпохі, для якой перш-наперш характэрны зварот да чалавека розуму.

Вялікі інтарэс вучоных выклікала гуманістычная трактоўка Будным сутнасці чалавека. *Пічэта*, напрыклад, лічыў, што ў вырашэнні гэтага пытання Будны ўжо адыходзіць ад боскай прадвызначальнасці і дапускае наяўнасць свабоды волі. Менавіта адсюль, лічыў Пічэта, выцякае яго абгрунтаванне права недатыкальнасці асобы, замацаванага за шляхтай і мяшчанамі адпаведнымі прававымі нормамі таго часу.

Пачатак даследаванням светапогляду К. Лышчынскага быў пакладзены артыкулам *В. Дружчыца* “Казімір Лышчынскі – беларускі бязбожнік XVII веку” (“Полымя”, 1927, №2.). Аўтар адзначаў, што ў фарміраванні светапогляду беларускага матэрыяліста і атэіста значную ролю адыграла забароненая літаратура заходнееўрапецскіх мысліцеляў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да пачатку 30-х гг. ў рэспубліцы былі дасягнуты прыкметныя поспехі ў вывучэнні філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Аднак далейшым даследаванням значна перашкодзіў вульгарны сацыялагізм, нігілістычнае стаўленне да культурнай спадчыны мінулага, якія заявілі аб сабе ў перыяд культу асобы І. Сталіна. Даволі шырокае распаўсюджанне атрымала думка аб старажытнай беларускай культуры, як амаль цалкам "рэакцыйна-феадальнай".

### 7.2.2. Пытанні гісторыі рускай філасофіі

У 20-я гг. пачынаецца вывучэнне праблем гісторыі рускай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. З'яўляюцца працы, прысвечаныя аналізу светапогляда дзекабрыстаў, М.Г. Чарнышэўскага, М.А. Дабралюбава, М.А. Бакуніна, Л.М. Талстога.

У артыкуле пад назвай "Федэрацыя ці цэнтралізацыя?", *М.В. Доўнар-Запольск*і адны*м* з першых разгледзеў погляды дзекабрыстаў аб дзяржаўнай перабудове Расіі. Ён зрабіў выснову, што ў процілегласць цэнтралізму, П. Пестэля, праект праграмы М.Мураўёва прадугледжваў перабудову расійскага грамадства на федэратыўных пачатках.

Даследаванню светапогляду і дзейнасці М.А. Бакуніна быў прысвечаны артыкул *С. Кацэнбогена*. Аўтар паказаў непаслядоўнасць і эклектычнасць яго філасофскай канцэпцыі, адзначыў уплыў філасофіі Гегеля на маладога Бакуніна. Ідэалізм гегелеўскай дыялектыкі, а таксама ідэалістычнае разуменне гістарычнага працэсу, падкрэсліваў вучоны, не дазволілі Бакуніну правільна зразумець сацыяльныя змены ў Еўропе.

Асаблівую ўвагу вучоных рэспублікі прыцягвалі ідэі рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў. Трэба адзначыць артыкул *С. Вальфсона* "Аб Чарнышэўскім – рэвалюцыянеры і мысліцелі", які паклаў пачатак дадзеным даследаванням. Прааналізаваўшы сацыялагічныя погляды Чарнышэўскага, аўтар выдзеліў у іх больш глыбокі ўзровень навуковых абагульненняў, чым у яго папярэднікаў. Разглядаючы эстэтычную канцэпцыю рэвалюцыйнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэмакрата, Вальфсон засяродзіў увагу на яго думцы аб тым, што мастацтва выклікана да жыцця рэальнымі патрэбамі чалавека, а не абстрактным імкненнем да прыгожага.

Даследаваннем светапогляду М.А. Дабралюбава ў другой палове 20-х гг. займаўся *П. Панкевіч*. У артыкуле “Гісторыка-сацыялагічныя погляды М.А. Дабралюбава” вучоны адзначае, што таго ў першую чаргу хвалявалі пытанні грамадскага развіцця, вызвалення народа з-пад гнёту і эксплуатацыі. Ён імкнуўся раскрыць той унутраны механізм, які забяспечыў бы развіццё грамадства па шляху прагрэсу.

Светапогляд В.Г. Бялінскага ў 30-я гг. даследаваў *С. Карабан*. Вынікам гэтага стала манаграфія “В.Г. Бялінскі. Яго філасофскія, эстэтычныя і крытычныя погляды” (1936). Даследчык засяродзіў увагу на такіх важных праблемах у філасофскай творчасці Бялінскага, як узаемаадносіны прыроды і грамадства, роля асобы ў гісторыі, пытанне аб ісціне. Галоўную ролю ў эстэтыцы рускага крытыка ён адводзіў ідэі рэалізму, адметнасць якой бачыў у правільным адлюстраванні рэчаіснасці.

Значнае месца ў даследаваннях беларускіх вучоных адводзілася Г.В. Пляханаву. Яму былі прысвечаны працы *С. Вальфсона, П Рубінчыка, Ф. Хрустава, І. Чымбурга*. Беларускія даследчыкі імкнуліся даць аб’ектыўную ацэнку тэарэтычнай і практычнай дзейнасці Пляханава. Істотны ўнёсак вучоныя Беларусі зрабілі ў вызначэнне яго месца і ролі ў гісторыі рускай філасофскай думкі. Аднак большасць з іх яшчэ не бачыла тых памылак, якія Пляханаў дапускаў пры аналізе грамадскага жыцця.

Шэраг артыкулаў, у якіх закранаўся той ці іншы бок творчасці Пляханава быў размешчаны ў цэнтральных рэспубліканскіх выданнях.

Працамі беларускіх філосафаў гісторыя рускай філасофскай думкі ўсталёўвалася ў Беларусі як паўнапраўная і актуальная вобласць філасофскіх даследаванняў.

### 7.2.3. Аналіз гісторыі заходнееўрапейскай філасофіі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1924 г. у Мінску выйшаў “Дыялектычны матэрыялізм” *С. Вальфсона* – першая ў Беларусі праца, ў якой аўтар спрабаваў сістэматычна прадставіць гісторыю філасофскай думкі ад антычнага часу да XIX ст. Акцэнт рабіўся на поглядах мысліцеляў у залежнасці ад таго, “у якой меры іх творчасць унесла нешта новае ў развіццё матэрыялізму”

Асаблівую ўвагу аўтар засяродзіў на поглядах Дэмакрыта, галоўную заслугу якога бачыў у тым, што ён нават мысленне аб’явіў матэрыяльным працэсам, звязаным з рухам атамаў. “Лінія Дэмакрыта” знайшла свой працяг у філасофіі Эпікура. Паводле Вальфсона, Эпікур – самастойны і арыгінальны мысліцель, які дапоўніў антычны атамізм прынцыпова новымі ідэямі. Тут беларускі даследчык абапіраўся на доктарскую дысертацыю К. Маркса “Адрозненне паміж натурфіласофіяй Дэмакрыта і натурфіласофіяй Эпікура”. Надаўшы атамам здольнасць адхіляцца ад той вертыкалі па якой яны здзяйснялі сваё падзенне, адзначаў Вальфсон, Эпікур паказаў, што гэта адхіленне ёсць праяўленне іх сутнасці.

Прасочваючы далей лёс вучэння Эпікура, Вальфсон выдзяляе выдатнага філосафа старажытнага Рыма Лукрэцыя Кара, якога лічыць найбольш таленавітым прадаўжальнікам справы свайго папярэдніка. Паэму Лукрэцыя Кара “Аб прыродзе рэчаў” ён адносіць да ліку самых выдатных твораў антычнасці.

Беларускі даследчык *У. Іваноўскі* гісторыю грэчаскай філасофскай думкі падзяляў на тры галоўных перыяды: 1). Ад першых філосафаў да сафістаў. 2). Ад Сакрата да Арыстоцеля. 3). Ад Арыстоцеля да заканчэння незалежнай грэчаскай думкі. Апошнім этапам развіцця Старажытнай Грэцыі ён лічыў “неаплатонізм, які на першы план ставіў парыў натхнення – экстаз”.

У адрозненне ад Вальфсона і Іваноўскага, *С. Кацэнбоген* засяроджваў увагу на сацыялагічных праблемех, пачынаючы свой аналіз з вучэнняў іанійскіх філосафаў. Менавіта яны, згодна Кацэнбогену, імкнуліся даць натуралістычнае тлумачэнне грамадскім з’явам. Сафісты на чале з Пратагорам, упершыню ў гісторыі сацыялогіі распрацавалі начаткі вучэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб "натуральным праве", а Платон выказаў думку аб заканамернасці змены адной формы дзяржавы другой.

У 20-я гг. у навуковым асяроддзі значную актуальнасць набылі праблемы так званага "антычнага сацыялізму і камунізму". Гэта выклікала павышаны інтарэс да сацыяльнага вучэння Платона. Беларускім даследчыкам *У. Перцавым* быў выдадзены артыкул пад назвай "Сацыяльна-палітычны светапогляд Платона". Ідэал Платона, рабіў выснову Перцаў, - аграрная дзяржава без грамадскіх кантрастаў і эканамічныз супярэчлівасцей, з усеагульнай згодай у думках і пачуццях. Антычнаму філосафу, на думку аўтара, "не хапала жыццёвага сэнсу і практычнага адчування рэчаіснасці"

Ацэньваючы дзейнасць вучоных Беларусі па даследаванню гісторыі філасофскай думкі антычнасці, трэба адзначыць, што ў першую чаргу яны засяродзілі ўвагу на вучэннях антычных матэрыялістаў (і гэта зразумела) Аднак з поля зроку быў упушчаны той факт, што развіццё матэрыялізму не можа разглядацца інакш, як у барацьбе з ідэалізмам.

Аналіз філасофскай думкі Сярэднявечча беларускія вучоныя пачынаюць з высвятлення месца феадалізму ў гісторыі грамадства. Галоўную перашкоду на шляху філасофіі яны бачаць у паралізуючым уплыве хрысціянскай рэлігіі і царквы. Аднак негледзячы на гэта, навуковыя веды прабівалі сабе дарогу. Прадвеснікам навукі Новага часу быў Р. Бэкан. Яго заслугі У. Іваноўскі бачыць у тым, што ён выступаў супраць штучнага схаластычнага метаду.

У XVI ст. у Заходняй Еўропе адбываецца далейшае развіццё навуковых ведаў, што было звязана з зараджэннем буржуазных вытворчых адносін. Геліяцэнтрычная сістэма Каперніка, працы Бруна, Галілея, дасягненні Леанарда да Вінчы – усе яны, на думку беларускіх вучоных, ламалі старыя погляды і садзейнічалі стварэнню прынцыпова новай карціны свету.

Важнае месца ў барацьбе за матэрыялістычны светапогляд беларускія даследчыкі адводзілі Ф. Бэкану, які "разглядаў філасофію як надзейны інструмент у пазнанні". Індуктыўны метад Бэкана *Б. Быхоўскі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарызаваў як “аналітычны метад на матэрыялістычнай аснове”. З яго дапамогай, падкрэсліваў даследчык, вучоны атрымлівае багаты матэрыял для шырокіх абагульненняў і вывадаў.

Адным з галоўных прадстаўнікоў філасофіі Новага часу быў Дэкарт. *У. Іваноўскі* высока ацэньваў фізіку Дэкарта, яго позірк на “свет, як на бясконцы механізм, дзе ўсё ўзнікае на аснове механістычных законаў”. Уклад Дэкарта ў гісторыю філасофскай думкі *Б. Быхоўскі* назваў “картэзіянскай рэвалюцыяй”. Сутнасць яе даследчык бачыць у тым, што яна “падрывае асновы царкоўна-схаластычнага светаразумення, расхіствае рэлігійныя дагматы і вераванні”.

Важнай з’явай у гісторыі філасофскай думкі быў французскі матэрыялізм XVIII ст. Французскіх матэрыялістаў беларускія даследчыкі характарызуюць як палымяных праціўнікаў феадальна-абсалютыстскага ладу, якія сваімі працамі рыхтавалі французскую буржуазную рэвалюцыю. У Ламетры яны бачаць “паслядоўніка абаснаванага Дэкартам механістычнага светаразумення” (*С. Вальфсон*). Філасофію Дзідро ацэньваюць як “бліскучы ўзлёт матэрыялізму на шляху яго станаўлення дыялектычным” (*Б. Быхоўскі*).

Далейшае развіццё матэрыялізму вучоныя Беларусі бачылі ў філасофіі Л. Фейербаха, які “канчаткова разбурае самую вялікую з ідэалістычных сістэм – сістэму Гегеля” (*Б. Быхоўскі*). Абгрунтаванне Фейербахам неабходнасці замены ідэалістычнай філасофіі антрапалагічным матэрыялізмам, лічылі даследчыкі, мела вялікае значэнне. Аднак вучэнне Фейербаха аб чалавеку насіла абмежаваны характар. Ён не разумеў сацыяльнай прыроды чалавека і зводзіў яго да натуральнай асновы. Крытычны ідэалізм Гегеля Фейербах таксама не змог зразумець і захаваць “рацыянальнае зерне” гегелеўскай дыялектыкі. “За кансерватыўнай сістэмай ён не бачыў рэвалюцыйнага метаду” (*С. Вальфсон*)

У сваіх даследаваннях гісторыі заходнееўрапейскай філасофіі беларускія вучоныя паказалі адзінства і пераймальнасць гісторыка-філасофскага працэсу. Яго паступальны характар. Пры гэтым асноўная ўвага надавалася матэрыялістычным і дыялектычным традыцыям мінулага. З гэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нагоды ў гісторыка-філасофскіх працах не знаходзілася належнага месца прадстаўнікам "лініі Платона"

### 7.2.4. Філасофская навука ў другой палове XX ст.

У паслеваенны час (50-60 гг.) у Беларусі значна ўзрасла колькасць прац, прысвечаных філасофіі марксізму, у прыватнасці матэрыялістычнай дыялектыцы, тэорыі пазнання, гісторыі марксісцкай філасофіі, філасофскім пытанням прыродазнаўства.

Распрацоўка дыялектычнага матэрыялізму ішла ў розных накірунках: 1) прынцыпы, законы і катэгорыі дыялектыкі ў навуковым пазнанні; 2) роля дыялектыкі ў вывучэнні біялагічных працэсаў; 3) структура і метады навуковых тэорый;

Паглыблялася вывучэнне ленінскай філасофскай спадчыны. У канцы 50-х гг. убачыла свет кніга "Аб "Філасофскіх сшытках" У.І. Леніна", падрыхтаваная беларускімі філосафамі (*К.П. Буслаў, І.Н. Лушчыцкі, П.Д. Пузікаў, В.І. Сцяпанаў* і інш.).

Шэраг праблем прадставіла калектыўная праца вучоных "Дыялектычны матэрыялізм як метадалогія прыродазнаўства" (1965). Філосафамі даследаваліся формы руху матэрыі, суадносіны агульных і спецыфічных законаў, значэнне эмпірычных і лагічных форм, роля ідэалізацыі і матэматызацыі ў навуковых даследаваннях. Асобны раздзел быў выдзелены марксісцкай крытыцы метадалогіі неапазітывізму, неатамізму і экзістэнцыялізму (*В.С. Сцёпін, Я.М. Бабосаў, І.І. Антановіч* і інш.).

У 70-я гг. з'явілася некалькі вучэбна-метадычных і тэарэтычных зборнікаў, у якіх высвятляліся пытанні дыялектычнага матэрыялізму. З пазіцый марксісцка-ленінскай "партыйнасці" вучоныя спрабавалі раскрыць ролю дыялектычнага матэрыялізму ў сучасным ім грамадскім жыцці.

Крытычны аналіз гнасеалагічнага сімвалізму філосафаў буржуазнага Захаду быў прадстаўлены *Л.У. Уваравым*. У кнізе "Сімвалізацыя ў пазнанні" (Мінск, 1971) ён прасочваў пазіцыі такіх філосафаў як А. Айер, Л.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вітгенштэйн, Б Рассел, Э. Касірэр, Р. Брэйн, Д. Уордсворт, Дж. Сантаяна і інш. Аўтар супрацьпаставіў іх поглядам канцэпцыю, заснаваную на дыялектыка-матэрыялістычнай метадалогіі.

У сярэдзіне 70-х гадоў узнік новы накірунак даследаванняў, звязаны з экалагічнай праблематыкай. Актыўны ўдзел у распрацоўцы праблем экалогіі прымаюць не толькі філосафы, але і прыродазнаўцы. У калектыўнай манаграфіі “Дынамічная раўнавага чалавека і прыроды” (1977) вучоныя даследуюць праблемы ўзаемасувязі сацыяльных і прыродных фактараў у працэсе антрапасацыягенезу.

У творчым кантакце з фізікамі *В.С. Сцёпін* аналізуе логіка-тэарэтычныя праблемы, звязаныя з гісторыяй і метадалогіяй навукі. У яго працы “Станаўленне навуковай тэорыі” (1976) быў абагульнены багаты даследчыцкі матэрыял і распрацавана арыгінальная філасофская канцэпцыя.

Гісторыка-філасофскія даследаванні беларускіх навукоўцаў значна актывізаваліся ў другой палове XX ст. Іх творчыя намаганні былі накіраваны на стварэнне больш поўнай і аб’ектыўнай карціны развіцця філасофскай думкі беларускага народа ад вытокаў да сучаснасці. Ставіліся важныя пытанні, звязаныя з неабходнасцю пераадолення вульгарна-сацыялагічных скажэнняў этапаў развіцця духоўнай культуры беларускага народа, а таксама правільнай гістарычнай ацэнкі дзейнасці прадстаўнікоў айчыннай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі.

Значнае месца у даследаванні нацыянальнай філасофіі належыць калектыўнай працы вучоных “Развіццё грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі ў эпоху феадалізму”. У ёй разглядаўся светапогляд беларускіх мысляроў XVI-XVII ст.- Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага, І. Мялешкі і інш. У кнізе былі намечаны асноўныя накірункі ў вывучэнні творчай спадчыны Скарыны і яго паслядоўнікаў.

У 70-я гады праблемы творчай спадчыны Скарыны распрацоўвалі *У.М. Конан*, які даследаваў эстэтычныя аспекты яго твораў, і *С.А Падокшын,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

засяродзіўшы увагу на філасофскіх, этычных, эстэтычных і натурфіласофскіх поглядах беларускага асветніка.

Вызначэнню мэсца філасофскага вучэння С. Буднага сярод розных плыняў рэфармацыйнага руху ў Беларусі была прысвечана кніга *Я.І. Парэцкага* "Сымон Будны" (1975). Аўтар імкнуўся разгледзіць погляды філосафа на фоне важнейшых з'яў "духоўнай гісторыі" ВКЛ у другой палове XVI ст. Ён ўключаў Буднага ў кантэкст еўрапейскай філасофскай думкі не толькі як сучасніка вялікіх "ерэтыкоў" і рэфарматараў, але таксама як папярэдніка крытыкаў Бібліі XVII-XVIII ст. – Спінозы і Вальтэра.

У працах навукоўцаў 80-90 гг. вызначылася ўстойлівая тэндэнцыя да пашырэння рамак даследаванняў філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Больш паглыблена аналізаваліся перыяды развіцця філасофіі і найбольш выдатныя яе прадстаўнікі. Асобна выдзелім манаграфію *С.А. Падокшына* "Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага" (1990). Беларускія вучоныя адкрывалі новыя імёны, прыводзілі раней невядомыя звесткі.

У 80-90 гг. філасофская думка Беларусі, якая да гэтага разглядалася пераважна як "грамадска-палітычная", намаганнямі айчынных вучоных стала раскрываць сваё багацце праз анталогію, гнасеалогію, этыку, эстэтыку, логіку, гісторыясофію, філасофію і метадалогію навукі, а таксама іншыя філасофскія накірункі. Разгарнулася навуковае выданне славутых помнікаў нацыянальнай духоўнай культуры. Убачылі свет перавыданні творчай спадчыны Ф. Скарыны, С. Полацкага, К. Каліноўскага і іншых выдатных прадстаўнікоў нацыянальнай культуры. Усё гэта дапамагло прыступіць да працы па падрыхтоўцы шматтомнай "Гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі". У 2008 г. Інстытутам філасофіі НАН Беларусі быў выдадзены першы том. Да гэтага часу выйшлі чатыры тамы, якія ахопліваюць філасофскі працэс на беларускай зямлі ад эпохі Сярэднявечча да Асветніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1. Тэмы семінарскіх заняткаў. Пытанні да семінарскіх заняткаў. Тэмы рэфератаў. Літаратура

### Тэма 1. Філасофскія і грамадска-палітычныя погляды Сярэднявечча.

1. Вытокі і асноўныя асаблівасці філасофіі Сярэднявечча. Хрысціянска-язычніцкі дуалізм.

2. Розум і вера. Гнасеалагічныя ўяўленні.

3. Сацыяльна-палітычныя погляды. Ідэя гісторыі. Тэма адзінства Русі. Праблема трагічнага ў гісторыі.

4. Філасофскія погляды К. Тураўскага. Праслаўленне мудрасці.

5. Маральна-эстэтычныя ўяўленні Сярэднявечча.

**Літаратура**


1. Беларуская міфалогія 2004 – Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік/С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск: Беларусь, 2004.- 592 с. (2-е выд., 2006 г.).

2. Беларускі народны каляндар 1993 – Беларускі народны каляндар/аўт.-уклад. А. Лозка.- Мінск, Полымя, 1993.- 205 с.

3. Беларускі фальклор 1996 – Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. Вучэб. Дапаможнік для філал. спец. ВНУ/Склад.: К.П. Кабашнікаў [і інш.].- 4-е выд. перапрац.- Мінск, Вышэйш. школа, 1996.- 856 с.

4. Богданович 1895 – Богданович, Е.А. Пережитки древняго міросозерцанія у белоруссов: Этнографический очеркъ А. Богдановича.- Гродна: Губернская Типография, 1895 – 186 с.

5. Буланин 1991 – Буланин, Д.М. Античные традиции в древнерусской литературе XI – XVI вв./Д.М. Буланин. – Munchen, 1991.

6. Ганстрем 1970 – Ганстрем, Е.Э. Почему митрополит Климент Смолятич называется философом/Е.Э. Ганстрем//ТОДРЛ. – М.; Л., 1970. – Т. XXV.

7. Гачев 2007 – Гачев, Г.Д. Космо-психо-логос: национальные образы мира/Г.Д. Гачев. – Академический проект, 2007. – 255 с.

8. Громов, Козлов 2001 – Громов, М.Н. Русская философская мысль X – XI веков/М.Н. Громов, Н.С. Козлов. – СПб. – Изд-во РХГИ, 2001.

9. Гумилев 2001 – Гумилев, Л.Н. Древняя Русь и великая степь/Л,Н. Гумилев. – М.: Айрис-Пресс: Рольф, 2001. -763 с.

10. Довнар-Запольский 2005 – Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии/М.В. Довнар-Запольский. – 2-е изд. – Минск: Беларусь, 2005. – 678 с.

11. Ермаловіч 1990 – Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяд. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 336с.

12. Жыцця адвечны лад 1998 – Жыцця адвечны лад: беларускія народныя прыкметы і павер'і/Уклад. Васілевіч. – Мінск: Выд-ва "Маст. літ.", 1998. – 606 с.

13. Зайцев 2003 – Зайцев, Д.М. Общественно-политическая и религиозно-философская мысль Беларуси, Украины и России IX – XVII вв. Учеб. пособие для уч-ся и студентов всех специальностей /А.И. Зайцев. – Минск, 2003.

14. Идейно-философское наследие Иллариона Киевского 1986 – Идейно-философское наследие Иллариона Киевского. – М., 1986. Ч. 1-2.

15. Изборник 1986 – Изборник: Повести Древней Руси/Сост. и коммент. Л.А. Дмитриева, Н.В. Понырко, вступит. ст. Д.С. Лихачева. – М.: Худож. лит., 1986. – 466 с.

16. Кніга жыцій і хаджэнняў 1994. – Кніга жыцій і хаджэнняў/уклад., прадмова і камент. А. Мельнікава. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 503 с.

17. Конан 2006 – Конан, У.М. Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэднявечча і Рэнесансу/У.М. Конан. – Мінск: БДПУ, 2006.

18. Культура Византии 1989 – Культура Византии. Вторая половина VII – XII ст. – М., 1989.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

19. Литература Древней Руси 1990 – Литература Древней Руси/под. ред. Д.С. Лихачева. – М., 1990. – 544 с.

20. Ловмянский 2003 – Ловмянский, Г. Религия славян и ее упадок (VI – XII вв.)/Г. Ловмянский/пер. с польского М.В. Ковальковой. – СПб.: Акад. Проект, 2003. – 508 с.

21. Лотман 1996 – Лотман, Ю.М. Внутри мыслящих миров. Человек – Текст – Семиосфера – История/Ю.М. Лотман. – М., 1996. – 447 с.

22. Майхрович 1997 – Майхрович, А.С. Становление нравственного сознания. Из истории духовной культуры Беларуси/А.С. Майхрович. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 2005 с.

23. Міфалогія 2003 – Міфалогія. Духоўныя вершы/А.М. Ненадавец, А.У. Марозаў, Л.М. Салавей, Т.А. Івахненка; навук рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – 469 с.

24. Отечественная общественная мысль эпохи Средневековья 1988 – Отечественная общественная мысль эпохи Средневековья. – Киев, 1988.

25. Рыбаков 1994 – Рыбаков, Б.А. Язычество древних славян/Б.А. Рыбаков. – М., 1994.

26. Филист 1988 – Филист, Г.М. Введение христианства на Руси: предпосылки, обстоятельства, последствия/Г.М. Филист. – Минск, 1988. – 252 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Прыкладныя тэмы рэфератаў**

1. Язычніцтва старажытных славян.

2. Прынящце хрысціянства на беларускай зямлі

3. Асаблівасці філасофскай культуры ўсходніх славян Кіева-Полацкага часу.

4. Маральна-этычныя погляды беларускага этнасу эпохі Сярэднявечча.

5. Грамадска-філасофскі змест фларыгелій.

6. Антрапалагізм сярэднявечнай думкі.

7. ”Слова аб законе і міласці” мітрапаліта Іларыёна.

8. Праблема агульнага дабра ў старажытнарускай літаратуры.

9. Грамадска-філасофскія погляды К. Смаляціча.

10. Маральная філасофія К. Тураўскага.

11. Эстэтычныя ўяўленні Сярэднявечча ў Беларусі.

12. Уплыў перакладной літаратуры на станаўленне айчыннай думкі Сярэднявечча.

**Тэма 2. Філасофская думка эпохі Адраджэння і Рэфармацыі.**

1. Асаблівасці айчыннай філасофскай культуры эпохі Рэнесансу. Заходняя і Ўсходняя культурныя традыцыі.

2. Філасофія і станаўленне нацыянальнай самасвядомасці.

3. Гуманістычная парадыгма ў творчасці Ф. Скарыны.

4. Ідэі прававога грамадства і свабоды асобы (Л. Сапега, А. Волан).

5. Праблема ўзаемаадносін дзяржавы і рэлігійных інстытутаў (П. Скарга, І. Пацей).

6. Матэрыялістычныя і атэістычныя ідэі (С. Лован, К. Бекеш, К. Лышчынскі).

**Літаратура**

1. Агіевіч 2002 – Агіевіч, У.У. Імя і справа Скарыны/У.У. Агіевіч. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 319 с.

2 .Ассман 2004 – Ассман, Ян. Культурная память: Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности /Ян Ассман/Пер. с нем. М.М. Сокольской. – М., 1998.

3. Багдановіч. Белорусское возрождене - Багдановіч, М. Поўны збор твораў. У 3 т./М. Багдановіч. – Мінск, 2001.- Т. 2. – С. 257-285.

4. Бортник 2008 – Бортник, И.А. Проблема толерантности в православной полемической мысли Речи Посполитой 1596-1632/И.А. Бортник//Studia Historica europae orientalis: Исследования по истории Восточной Европы. – Минск: БГУ, 2008. – С. 185-202.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Гісторыя 2006 – Гісторыя беларускай літаратурыXI – XIX ст.: У 2 т. – Мінск: Беларус. навука, 2006. – Т. 1. Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст., навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – 910 с.

6. Голенченко 1989 – Голенченко, Г.Я. Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI – середине XVII в./Голенченко – Минск: Наука и техника, 1989. – 285 с.

7. Дварчанін 1991 – Дварчанін, І.С. Францыск Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве/І.С. Дварчанін. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991.- 187 с.

8. Конан 2006 – Конан, У.М. Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэднявечча і Рэнесансу/У.М. Конан. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2006. – 176 с.

9. Левшун 2001 – Левшун, Л.В. История восточнославянского книжного слова XI – XVII вв./Л.В. Левшун. – Минск: Экономпресс, 2001. – 352 с.

10. Литвин 1994 – Литвин, Михалон. О нравах татар, литовцев, московитян/Михалон Литвин. – М., 1994.

11. Любавский 2004 – Любавский, М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно/М.К. Любавский. – М., 2004.

12. Майхрович 1997 – Майхрович, А.С. Становление нравственного сознания: Из истории духовной культуры Беларуси/А.С. Майхрович – Минск: Наука и техника, 1997. – 247 с.

13. Немировский 1990 – Немировский, Е.Л. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя/Е.Л. Немировский. – Минск: Маст літ., 1990. – 597 с.

14. Падокшын 1990 – Падокшын, С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага/С.А. Падокшын. – Мінск: Навука і тэхніка,1990. – 285 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. Падокшын 2003 – Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры/С.А. Падокшын. – Мінск: Беларус. навука,2003.- 316 с.

16. Парэцкі 1975 – Парэцкі, Я.І. Сымон Будны/Я.І. Прэцкі. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1975. – 168 с.

17.Переписка 1993 – Переписка Ивана Грозного с Андреем Курбским. – М.: Наука, 1993. – 432 с.

18.Пичета 1961 – Пичета, В.И. Белоруссия и Литва XV - XVI вв./В.И. Пичета. – М.: Изд-во Акад. Наук СССР, 1961. – 816 с.

19. Саверчанка 1992 – Саверчанка, І.В. Канцлер Вялікага княства: Леў Сапега/І.В. Саверчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 64 с.

20. Саверчанка 1993 – Саверчанка, І.В. Сымон Будны: гуманіст і рэфарматар/І.В. Саверчанка. – Мінск: Універсітэцкае выд., 1993. – 223 с.

21. Сапега 1989 – Сапега, Прадмовы/Л. Сапега//Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэкст давед. камент./Беларус. сав. энцыкл.; рэдкал.: І. Шамякін [і інш.]. – Мінск: Бел СЭ, 1989. – С. 42 – 45.

22. Скарына 2008 – Скарына, Ф. Выбраныя творы/Ф. Скарына; уклад., пер. на бел. мову І. Саверчанкі. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 110 с.

23. Скарына і яго эпоха 1990 /В.А. Чамярыцкі[і інш.]; рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.

24. Спадчына Скарыны 1986 /Зб. Матэрыялаў Першых Скарынаўскіх чытанняў//Склад. Мальдзіс А.І. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 317 с.

25.Францыск Скарына і яго час 1988 – Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. – Мінск: БелСЭ, 1988. – 608 с.

26. Чатырохсотлецце беларускага друку 1926 – Чатырохсотлецце беларускага друку. 1526 – 1925. – Менск: Інбелкульт, 1926. – 356 с.

27. Шалькевіч 2002 – Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі/В.Ф. Шалькевіч. – Мінск: Маладзёжнае навук. супольніцтва, 2002. – 248 с.

**Прыкладныя тэмы рэфератаў**

1. Асаблівасці беларускага Адраджэння.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Рэнесанс і нацыянальная самасвядомасць.

3. Праблема талерантнасці.

4. Гуманістычныя ідэі эпохі Адраджэння.

5. Філасофскія ідэі ў творчасці Ф. Скарыны.

6. Сацыяльна-этычныя погляды Ф. Скарыны.

7. Праблема “чалавек – грамадства” у Ф. Скарыны.

8. Эстэтычныя ўяўленні Ф. Скарыны.

9. Філасофскі скептыцызм С. Буднага.

10. Антытрынітарызм С. Буднага.

11. Рэфармацыя і грамадская думка Беларусі і ЛітвыXVI – XVII ст.

12. Ідэі духоўнай свабоды ў грамадскай думцы беларускагаАдраджэння.

13. Філасофска-прававыя погляды Л. Сапегі.

14. Андрэй Волан аб свабодзе асобы.

15. Пётр Скарга і беларуская культура.

16. Ідэя ўніяцтва ў творчасці І. Пацея.

17. Патрыятызм М. Гусоўскага.

18. Матэрыялізм Казіміра Лышчынскага.

**Тэма 3. Філасофская думка Беларусі ХХ ст.**

1. Мастацкая літаратура пачатку ХХ ст., як носьбіт сацыяльна-філасофскіх ідэй і сродак абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Я. Купала, Я. Колас, А. Пашкевіч (Цётка), М. Багдановіч.

2. Тэарэтычнае абгрунтаванне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. І. Абдзіраловіч.

3. Стварэнне інстытуцыйных асноў філасофскай навукі ў Беларусі. Першыя даследаванніі.

4. Філасофскія даследаванні 20-30-х гадоў.

5. Асноўныя здабыткі філасофскай навукі Беларусі ў другой палове ХХ ст.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Філасофскія накірункі і даследаванні айчынных вучоных у канцы XX - пачатку XXI ст.

**Літаратура**

1. Абдзіраловіч 1993 – Абдзіраловіч, І.Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага светапогляду/І. Абдзіраловіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. Анталёгія 2003 - Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня/уклад. і рэд.: А. Анціпенка, В. Акудовіч. – СПб.: Невский Простор, 2003. – 494 с.

3. Бабосов 1974 – Бабосов, Е.М. Научно-техническая революция и духовная культура развитого социализма/Е.М. Бабосов. – Минск, Наука и техника, 1974.

4. Беларуская думка XX стагоддзя 1998 – Беларуская думка XX стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура (Анталогія)/уклад., прадм. і апрац. Юры Гарбінскі. – Варшава: Druk-Pol, 1998. – 598 с.

5. Берков 1983 – Берков, В.Ф. Структура и генезис научной проблемы/В.Ф. Берков. – Минск, Университетское изд., 1983.

6. Вішнеўская 2008 – Вішнеўская, І.У. Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI ст.)/І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2008.- 296 с.

7. Вольфсон 1923 – Вольфсон, С.Я. Диалектический материализм/С.Я. Вольфсон. Минск, 1923.

8.Гарэцкі 1992 – Гарэцкі, М. Гісторыя беларускай літаратуры/М. Гарэцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1992. – 479 с.

9. Ігнатоўскі 1992 – Ігнатоўскі, У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі/У. Ігнатоўскі. – 5-е выд. – Мінск: Беларусь, 1992. – 190 с.

10. Каваленка 1975 – Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць: Развіццё беларускай літаратуры XIX – XX стагоддзяў/В.А. Каваленка. – Мінск, 1975.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Карский 1921 – Карский, Е.Ф. Белорусы/Е.Ф. Карский. – Пг., 1921. – Т. 3: Очерк словесности белорусского племени. – Вып. 2: Старая западно-русская письменность. – 242 с.

12. Каценбоген 1925 – Каценбоген, С.З. Марксистская социология. Курс лекций, читанных в 1924-1925 академическом году на педфакультете БГУ/С.З. Каценбоген. – Минск, 1925, ч.1.

13. Конон 1978 – Конон, В.М. Эстетическая мысль Советской Белоруссии/В.М. Конон. – Минск: Наука и техника, 1978. – 111 с.

14. Крюковский 1983 – Крюковский, Н.И. Homo pulcher. Человек прекрасный: Очерк теоретической эстетики человека./Н.И. Крюковский. - Минск, 1983.

15. Майхровіч 1998 – Майхровіч, А.С. Нацыянальная традыцыя і развіццё духоўнай культуры Беларусі/А.С. Майхровіч//Беларуская думкаХХ стагоддзя: Філасофія, рэлігія, культура (Анталогія)/уклад., прадм. і апрац. Юры Гарбінскі. – Варшава: Druk-Pol, 1998. – С. 544 – 557.

16. Майхрович 1982 – Майхрович, А.С. Янка Купала и Якуб Колас (Вопросы мировоззрения)/А.С. Майхрович. – Минск, 1982.

17. Мысліцелі і асветнікі Беларусі 1995 – Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыкл. давед./Беларус. Энцыкл.; гал. рэд. Б.І. Сачанка [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1995. – 671 с.

18. Можейко 2016 – Можейко, М.А. Современные социокультурные трансформации и философия постмодернизма: новейшие тенденции/Философские науки. – 2016. - № 7. – С. 80 – 95.

19. Развитие марксистско-ленинской философии в БССР: 20 – 70-е годы 1984 – Развитие марксистско-ленинской философии в БССР: 20 – 70-е годы/Редколлегия: Е.М. Бабосов, В.М. Конон, А.С. Майхрович [и др.]/ Минск: Наука и техника, 1984. – 336 с.

20. Стёпин, Елсуков 1974 - Стёпин, В.С. Методы научного познания/В.С. Стёпин, А.И. Елсуков. – Минск, 1974.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. Цьвікевіч 1993 – Цьвікевіч, А. “Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзскай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в./А. Цьвікевіч. Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

22. Чатырохсотлецце беларускага друку 1926 – Чатырохсотлецце беларускага друку. 1525-1925.- Менск: Інбелкульт, 1926. – 356 с.

23. Шевцов 2005 – Ю.В. Шевцов. Объединенная нация: феномен Беларуси/Ю.В. Шевцов. – М.: Европа, 2005. – 239 с.

24. Шчакаціхін 1928 – Шчакаціхін, М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва/М. Шчакаціхін. – Мінск: Інбелкульт, 1928. – Т. 1. – 278 с.

**Прыкладныя тэмы рэфератаў**

1. Сацыяльна-філасофскія ідэі ў літаратурнай творчасці Я. Купалы.

2. ”Філасофскія задуменні” Я. Коласа.

3. Філасофскае асэнсаванне ідэі нацыянальнага Адраджэння М. Багдановічам.

5. Ігнат Абдзіраловіч як філосаф.

6. Эсэ І. Абдзіраловіча “Адвечным шляхам…” і сучаснасць.

7. Мастацкая літаратура Беларусі пачаткуXX ст., як носьбіт сацыяльна-філасофскіх ідэй.

8. Філасофскія праблемы ў даследаваннях беларускіх вучоных 20-х гадоў XX ст.

9. Зборнік “Чатырохсотлецце беларускага друку” (1926), як філасофская крыніца.

10. Даследаванні культурнай спадчыны Скарыны беларускімі навукоўцамі ў 20-30-я гады XX ст.

11. Аналіз творчасці С.Буднага філосафамі Беларусі.

12. Гісторыка-філасофскія даследаванні айчыннай думкі ў другой палове XX ст.

13. Эстэтычная думка Беларусі ў савецкі час.

14. Распрацоўка пытанняў этыкі.

15. Праблемы метадалогіі ў працах беларускіх вучоных.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. Крытычны аналіз накірункаў заходнееўрапейскай філасофскай думкі.

17. Праблемы навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

18 .Сучасныя сацыякультурныя трансфармацыі і філасофія пастмадэрнізму.

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

### 4.1. Пытанні да заліку

1. Асаблівасці язычніцкага светапогляду на старажытных беларускіх землях.
2. Асноўныя перыяды гісторыі айчыннай філасофскай думкі.
3. Вытокі і галоўныя рысы філасофскай думкі Сярэднявечча ў Беларусі.
4. Грамадска-філасофскія погляды К. Смаляціча.
5. Рэлігійна-філасофская канцэпцыя К. Тураўскага.
6. Маральна-эстэтычныя погляды беларускага Сярэднявечча.
7. Ілэя гісторыі ў сацыяльна-філасофскай думцы часоў Кіеўскай Русі.
8. Асаблівасці філасофскай культуры Адраджэння ў Беларусі.
9. Сацыяльна-этычныя погляды Ф. Скарыны.
10. Праблема чалавека ў творчасці Ф. Скарыны.
11. Скарынінская ідэя патрыятызму і сучаснасць.
12. Эстэтычныя аспекты творчасці Ф. Скарыны.
13. Філасофскі скептыцызм С. Буднага.
14. Сацыяльна-палітычныя погляды С. Буднага
15. Праблема прававога грамадства і дзяржавы ў Л. Сапегі і А. Волана.
16. Матэрыялізм і атэізм К. Лышчынскага.
17. Філасофскія погляды С. Полацкага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18. Асноўныя накірункі ў грамадска-філасофскай думцы канца XVII – першай паловы XVIII ст.

19. Эклектычная філасофія (А. Скарульскі, С. Шадурскі).

20. Філасофскія погляды Б. Дабшэвіча.

21. Вучэнне Г. Каніскага.

22. Асаблівасці філасофіі Асветніцтва ў Беларусі.

23. Філасофскія погляды К. Нарбута.

24. Філасофія А. Доўгірда.

25. Філасофская думка Беларусі першай паловы XIX ст.

26. Ліберальны дэмакратызм В. Дуніна Марцінкевіча.

27. Рэвалюцыйна-дэмакратычныя погляды К. Каліноўскага.

28. Праблема чалавека і свабоды ў творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Пашкевіч (Цёткі).

29. Сацыяльна-філасофскія ідэі І. Абдзіраловіча.

30. Асноўныя філасофскія праблемы ў працах беларускіх навукоўцаў XX – пач. XXIст

**4.2. Метадычныя парады да самастойнай працы студэнтаў**

Самастойная праца арганізуецца ў адпаведнасці з палажэннем аб самастойнай працы студэнтаў, падрыхтаваным у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

Мэтай самастойнай працы студэнтаў з’яўляецца павышэнне іх канкурэнтных здольнасцей шляхам фарміравання кампетэнцый самаадукацыі.

Найбольш эфектыўнымі формамі і метадамі арганізацыі самастойнай працы з’яўляюцца:

- распрацоўка творчых заданняў з наступным напісаннем эсэ, дакладаў і рэфератаў;

- вывучэнне артыкулаў па гісторыка-філасофскім праблемам і выкананне анатацый, рэцэнзій, аналітычных запісаў і інш.;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- рашэнне філасофскіх задач, або сітуацый з прэзентаваннем вынікаў.

Асноўнымі метадамі і тэхналогіямі навучання, адпавядаючымі задачам вывучэння спецыялізаванага модулю “Станаўленне і развіццё філасофскай думкі ў Беларусі”, з’яўляюцца:

- метады праблемнага навучання (праблемнае выкладанне, часткова пошукавы і даследчы метады);

- асобасна арыентаваныя (развіваючыя) тэхналогіі, заснаваныя на актыўных (рэфлексіўна-дзейнасных) формах і метадах навучання (“мазгавы штурм”, дыскусія, вучэбныя дэбаты, круглы стол і інш.);

- інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (структураваныя электронныя прэзентацыі для лекцыйных заняткаў, выкарыстанне аудыопадтрымкі і інш.);

Пры гэтым патрэбна кіравацца праграмай курса і метадычнымі парадамі, якія дапамагаюць аблегчыць самастойную працу студэнтаў. Вывучэнне асобных тэм спецыялізаванага модулю рэкамендавана праводзіць у наступнай паслядоўнасці:

- азнаямленне са зместам тэм па рабочай праграме;

- вывучэнне літаратурных крыніц, канспектаванне матэрыялу;

- кансультацыя з выкладчыкам;

- самастойнае раскрыццё праблемы.

Выкананне пісьмовай работы (рэфэрата, эсэ) уключае наступныя этапы:

1.Выбар тэмы творчай работы (эсэ) або рэферата.

2.Падбор навуковай і вучэбнай літаратуры. Пералік асноўнай літаратуры да кожнай тэмы курса прадстаўлены ў дадзеным ВМК. Падабраць дадатковую літаратуру студэнт зможа з дапамогай бібліяграфічных каталогаў у навуковай бібліятэцы.

3.Вывучэнне літаратуры прадуглежвае выдзяленне тых раздзелаў і параграфаў, матэрыял якіх прадстаўляе асобны інтарэс для раскрыцця тэмы. Вывучэнне літаратурных крыніц таксама звязана з канспектаваннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўных палажэнняў тэксту. Варыянты канспектавання могуць быць рознымі: кароткі або разгорнуты канспект, тэзісы, падбор цытаванага матэрыялу і г. д. Вынікам павінна стаць лагічна пабудаваная сістэма звестак па сутнасці даследуемага пытання.

4.На аснове сабранага матэрыялу вызначаюць структуру, змест і аб'ём пісьмовай работы. Структура, як правіла, уключае ўводзіны, асноўную частку і заключэнне.

Пажаданай з'яўляецца такая методыка напісання работы, калі студэнт на пачатку рыхтуе яе чарнавы варыянт. Гэты тэкст уважліва перачытваецца, аналізуецца і рэдагуецца. У яго ўносяцца змены, дапаўненні і адпаведныя карэктывы.

Ва ўводзінах абасноўваецца актуальнасць выбранай тэмы, яе тэарэтычнае і практычнае значэнне. Важна таксама указаць аб'ект і прадмет даследавання, яго мэту і пералік задач, рашэнне якіх прадугледжваецца для дасягнення вызначанай мэты.

У асноўнай частцы патрэбна прадставіць аб'ектыўны і ўсебаковы аналіз даследуемай праблемы.

У заключэнні раскрываюцца асноўныя вынікі даследавання, ацэнкі і рэкамендацыі тэарэтычнага і практычнага кшталту.

У бібліяграфіі прадстаўляецца пералік крыніц па даследаванню. Пры выкарыстанні ў рабоце апублікаванага матэрыялу, абавязковай з'яўляецца спасылка на першакрыніцу. Асаблівай увагі патрабуе афармленне навуковага апарата, які павінен адпавядаць дзяржаўнаму стандарту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНЫЯ РАЗДЗЕЛ

## 5.1. Вучэбная праграма курса

**"Станаўленне і развіццё філасофскай думкі Беларусі"**

Змест вучэбнага матэрыялу

### Тэма 1. Уводзіны. Асаблівасці філасофскай культуры Беларусі

Месца філасофіі ў айчыннай культуры. Асаблівасці і складанасці рэканструкцыі гісторыі філасофскай думкі Беларусі.

Галоўныя філасофскія накірункі і праблематыка. Беларуская філасофская думка ў кантэксце еўрапейскай філасофіі.

Полістратэгічны падыход у гісторыка-філасофскім даследаванні. Гісторыя філасофіі і адзінства філасофскага досведу.

Інтэлектуальны вобраз Беларусі: метафізіка "тутэйшасці". Практыкі арганізацыі гісторыка-філасофскага пошуку.

Спадчына, ідэнтычнасць і гістарычны выбар. Праблема крыніц і даследаванняў. Інтэлектуальны вобраз Беларусі. Беларусь паміж Захадам і Ўсходам.

**Тэма 2. Філасофскія і грамадска-палітычныя погляды Сярэднявечча**

Язычніцтва як рэлігійна-міфалагічны светапогляд. Роля язычніцтва як першапачатковай спробы духоўна-практычнага засваення рэчаіснасці.

Прыняцце хрысціянства і хрысціянізацыя грамадства. Тэацэнтрызм мыслення. Розум і вера. Антрапалогія Сярэднявечча.

Асаблівасці айчыннай філасофскай культуры. Хрысціянска-язычніцкі дуалізм. Сінкрэтызм мыслення. Прыярытэт маральна-эстэтычных аспектаў над фармальна-лагічнымі.

Эстэтычныя і сацыяльна-палітычныя погляды. Уяўленні аб вышэйшых каштоўнасцях жыцця. Праслаўленне кніжных ведаў. Разуменне прызначэння філасофіі. Ідэя праўды. Ідэі духоўнага ўдасканалення і прызначэння чалавека.

Ідэя гісторыі. "Слова аб законе і міласці" мітрапаліта Іларыёна. "Аповесць временных лет", "Слова аб палку Ігаравым". Ідэя адзінства Русі. Праблема трагічнага ў гісторыі (Усяслаў Чарадзей).

Клімент Смаляціч. "Пасланне прэсвітэру Фаме". Ідэя аўтакефаліі. Сімвалізм экзагетыкі. Розум і пачуцці.

Кірыла Тураўскі. Апалагетычнасць і сімвалізм творчасці. Праблема душы і цела. Праслаўленне мудрасці і кніжных ведаў. "Прытча аб чалавечай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

душы і целе”. “Слова аб прамудрасці”. “Аповесць аб бесклапотным цары і яго мудрым дарадцы”.

Эстэтычныя ўяўленні. Бог як крыніца і найвышэйшае выражэнне прыгажосці. Духоўная і пачуццёвая прыгажосць.

**Тэма 3. Філасофская думка эпохі Адраджэння і Рэфармацыі**

Паняцце “беларускае Адраджэнне” і яго змест. Асаблівасці айчыннай філасофскай культуры эпохі Рэнесансу. Заходняя і Ўсходняя культурныя традыцыі. Прыярытэт агульнага дабра. Сацыяльна-палітычная і рэлігійна-этычная накіраванасць думкі. Кампраміс філасофіі і тэалогіі. Накірункі рэнесансна-гуманістычнай думкі: радыкальна-рэфармацыйны; памяркоўны; матэрыялістычна-атэістычны. Станаўленне нацыянальнай самасвядомасці.

Грамадска-палітычныя погляды Ф. Скарыны. Праблема інтэрпрэтацыі Свяшчэннага пісання. Магчымасць асабістых адносін да Бога і асабістай веры. Хрысціянскі гуманізм мыслення. Праблема антрапалогіі. Маральны імператыў. Праблема суадносін індывідуальнага і агульнага дабра. Ідэя патрыятызму і верацярпімасці. Эстэтызацыя мудрасці. Ідэал асобы. Ідэя натуральнага права. Закон і агульнае дабро. Сінкрэтызм мыслення і духоўна-практычны накірунак светапогляду беларускага гуманіста.

Сымон Будны. Антытрынітарнае вучэнне і яго філасофскі сэнс. Адзіны Бог як праасноваісна існасці. Гуманізм хрысталогіі мысліцеля. Прынцып сумнення. Перагляд крыніц маральнасці.

Ідэя свабоды і прававаой дзяржавы. Ідэал духоўнай свабоды. Ідэі верацярпімасці і свабоды думкі (С. Будны, М. Літвін).

Андрэй Волан. Сутнасць свабоды. Недатыкальнасць асобы.

Леў Сапега. Прыярытэт юрыдычнай свабоды. Аўтарытэт закона. Ідэя юрыдычнай роўнасці. Свабода рэлігійна-палітычнага выбару.

Грамадска-філасофскія ідэі ў палемічнай літаратуры.

П. Скарга, І. Пацей. Ідэя ўніяцтва. Антыўяніцкая публіцыстыка (М. Сматрыцкі, Х. Філалет, З. Капысценскі, А. Філіповіч. Канцэпцыя рэлігійнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свабоды. Абарона нацыянальнай культуры і традыцый. Патрыятызм М. Гусоўскага.

Матэрыялістычныя і атэістычныя ідэі С. Лован, К. Бекеш, К. Лышчынскі.

**Тэма 4. Філасофскія ідэі эпохі Новага часу ў Беларусі**

Асноўныя тэндэнцыі ў філасофскай думцы XVII-XVIII ст. Распаўсюджванне новай філасофіі. Тэндэнцыя аддзялення філасофіі ад тэалогіі (Л. Зізаній, Ф. Уяўлевіч, С. Полацкі).

С. Полацкі. Праблема існасці. Пытанні гносеалогіі. Бог і магчымасці яго пазнання. Два пачаткі існасці. Ідэя трыадзінства сусвету. Адмаўленне прыроджаных ідэй. Чалавек і “жыццёвае мора”. “Грахі розуму”. Ідэя дваістай ісціны. Разуміцельная, натуральная і маральная філасофія. Мудрасць як вышэйшая дабрачыннасць. Тэорыя грамадскай дамовы.

Барацьба ў галіне светапогляду ў канцы XVII- пач.XVIII ст. А. Белабоцкі аб праве навукі на самастойнае існаванне. Вучэнне аб “натуры”.

Уплыў на айчынную культуру заходнееўрапейскай філасофіі Новага часу. Капернікіянства ў Беларусі. Эклектычная філасофія другой паловы XVIII ст. Вучэнні С. Скарульскага і С. Шадурскага.

Філасофскія погляды Б. Дабшэвіча. Прызначэнне філасофіі. Праблема існасці. Шляхі пазнання.

Вучэнне Г. Каніскага. Гносеалагічныя погляды. Антысхаластычная тэндэнцыя. Ідэя адзінства свету. Асветніцтва.

**Тэма 5. Філасофія Асветніцтва**

Філасофія Асветніцтва і яе асаблівасці ў Беларусі (другая палова XVIII ст.-пач. XIX ст.). Ідэалы розуму, ведаў, навукі. Абсалютызацыя каштоўнасцей асветніцтва. Накіраванасць філасофскай думкі на грамадскія перабудовы. Гносеалогія, логіка, сацыяльная філасофія як асноўныя накірункі філасофскай думкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

К. Нарбут аб значэнні філасофіі і свабодзе думкі. Праблема прычыннасці. Пытанне ісціны. Грамадска-філасофскія погляды. Фізіякраты. І. Храптовіч аб ролі “натуральнага парадку”. І. Страйноўскі. Тэорыя грамадскай дамовы і натуральнага права. Прагрэс чалавечага розуму як галоўная сіла грамадскага развіцця. “Дасканалае заканадаўства” К. Багуслаўскага. Асветніцтва Я. Масальскага.

А. Доўгірд. Гісторыя філасофіі. Логіка. Тэорыя пазнання і маральная філасофія.

**Тэма 6. Філасофская і сацыяльна-палітычная думка XIX ст.**

Філаматы аб сувязі маралі і палітыкі. Роля сярэдняга класа. Выключнасць шляхты ў гістарычнай дзейнасці. Дэмакратычнае грамадства: народ як галоўная сіла вызваленчай барацьбы. Ідэі свабоды і нацыянальнай роўнасці. Маральнасць і ўсеагульнае дабро. Ф. Савіч аб сацыяльнай роўнасці. “Хрысціянская філасофія жыцця” М. Якубовіча. Палеміка 30-50 гадоў аб сутнасці і значэнні філасофіі.

Напярэдадні нацыянальнага адраджэння. В. Дунін-Марцінкевіч: прыярытэт агульнага дабрабыту народа і грамадства; ідэя салідарызму. Ідэі сацыяльнай патрыярхальнасці і асветніцтва.

Рэвалюцыйна-дэмакратычныя плыні другой паловы XIX- пачатку XX ст. Тэма народа і пошуку шляхоў яго сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення. Ідэі свабоды, братэрства і сацыяльнай справядлівасці як даміналты грамадскай думкі.

Грамадска-палітычныя погляды К. Каліноўскага. Сацыяльны крытыцызм. Праблема “мова-народ” у творчасці Ф. Багушэвіча. Ідэйна-эстэтычныя пазіцыі А. Гурыновіча і Я. Лучыны.

Абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці. Ідэя нацыянальнай дзяржавы і праблема вызвалення чалавека ў творчасці Я. Купалы. Тэмы грамадства, асобы і “філасофскае задуменне” над жыццём Я. Коласа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Пашкевіч (Цётка): ідэал барацьбы і свабоды. М. Багдановіч: пытанні нацыянальнай культуры, праблема мовы.

**Тэма 7. Філасофія Беларусі ў ХХ – пач. ХХІ ст.**

Стварэнне інстытуцыйных асноў філасофскай навукі. Першыя навуковыя ўстановы і даследчыкі філасофіі. Асноўныя накірункі дзейнасці навукоўцаў. Галоўная праблематыка першых філасофскіх прац. Юбілейны зборнік “Чатырохсотлецце беларускага друку” (1926 г.) і праблема філасофскай спадчыны.

Фундаментальнае даследаванне “Беларусы” Я. Карскага. Пытанні гісторыі, культуры і мовы. Першыя даследаванні творчасці Ф. Скарыны і іх вынікі (У. Пічэта, Я. Воўк-Леановіч, М. Шчакаціхін). С.Будны і філасофскія пошукі беларускіх навукоўцаў. “Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва” М. Шчакаціхіна.

І. Абдзіраловіч аб становішчы беларускага этнасу ў геапалітычнай прасторы паміж Усходам і Захадам. Праблема адказнай сацыяльнай творчасці.

Даследаванні гісторыі заходнееўрапейскай філасофіі. Праблемы філасофіі марксізму. Пытанні рускай філасофскай думкі.

Культ асобы І. Сталіна і перашкоды на шляху развіцця беларускай культуры і навуковых ведаў. Становішча філасофскай навукі ў 30-я – пач.40-х гадоў.

Філасофская думка Беларусі ў пасляваенны час. Гісторыка-філасофскія даследаванні. Праблемы этыкі і эстэтыкі. Сацыяльная філасофія. Філасофія і метадалогія навукі. Сучасная заходнееўрапейская філасофія.

## 5.2. Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны (для студэнтаў дзённай формы навучання)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Назва тэмы | | Колькасць аудыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінары | Самаст. работа | |
| 1. | Уводзіны. Асаблівасці філасофскай культуры Беларусі | 2 | | | Абарона рэферата |
| 2. | Філасофскія і грамадска-палітыч. погляды Сярэднявечча | 4 | 2 | | Вусны адказ |
| 3. | Філасофская думка эпохі Адраджэння і Рэфармацыі | 4 | | | Вусны адказ |
| 4. | Філасофскія ідэі эпохі Новага часу ў Беларусі | 2 | | | Абарона рэферата |
| 5. | Філасофія Асветніцтва | 2 | | | Дыскусія |
| 6. | Філасофская і сацыяльна-палітычная думка XIXст. | 4 | | | Пісьмовая работа |
| 7. | Філасофія Беларусі XX – пачатку XXI ст. | 4 | 2 | | Круглы стол |
| | Усяго | 22 | 6 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5.3. Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны**

**(для студэнтаў завочнай формы навучання)**

| Назва тэмы | | Колькасць аудыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінары | Самаст. работа | |
| 1 | Уводзіны. Асаблівасці філасофскай культуры Беларусі | 2 | | | Вусны адказ |
| 2 | Філасофскія і грамадска- | 4 | 2 | | Абарона |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | палітычныя погляды Сярэднявечча | | | | рэферата |
| 3 | Філасофская думка эпохі Адраджэння і Рэфармацыі | 4 | 2 | | Дыскусія |
| 4 | Філасофскія ідэі Новага часу ў Беларусі | 2 | | | Аналітычны запіс |
| 5 | Філасофія Асветніцтва | 2 | | | Пісьмовая работа |
| 6 | Філасофская і сацыяльна-палітычная думка XIX ст. | 4 | | | Дыскусія |
| 7 | Філасофія Беларусі XX - пачатку XXIст. | 4 | 2 | | Круглы стол |
| | Усяго | 22 | 6 | | |

**5.4. Асноўная літаратура**


1. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т./В.Б. Евароўскі [і інш.]; рэд. кал.: В.Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі.- Мінск: Беларус. навука, 2008.- Т. 1: Эпоха Сярэднявечча.- 574 с.

2. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т./С. І. Санько [і інш.]; рэд. кал.: В.Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі.- Мінск: Беларус. навука, 2010.- Т. 2: Протарэнесанс. Адраджэнне.- 840 с.

3. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т./В.Б. Евароўскі [і інш.]; рэд. кал.: В.Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі.- Мінск: Беларус. навука, 2013.- Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока.- 615с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У 6 т./Бабкоў І.М. [і інш.]; рэд. кал.: В.Б. Евароўскі [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі.- Мінск: Беларус. навука, 2017.- Т. 4: Асветніцтва.- 431 с.

5. Ермаловіч 1990 – Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Навагрудскі перыяды/М. Ермаловіч. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 366 с.

6. Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли 1977 - Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии (дооктябрьский период).- Минск: Наука и техника, 1977.- 280 с.

7. Идеи материализма и диалектики 1980 - Идеи материализма и диалектики в Белоруссии: Дооктябрьский период./А Н БССР. Ин-т философии и права; редкол.: К.П. Буслов (гл. ред.) и др.- Минск: Наука и техника, 1980.- 344 с.

8. История философии 2001 - История философии: учебник/Ч.С. Кирвель [и др.]; под ред. Ч.С. Кирвеля.- Минск: Новое знание, 2001.- 278 с.

9. Козел 2004 – Козел, А.А. Философская мысль Беларуси: учеб. пособие /А.А. Козел.- Минск: Амалфея, 2004.- 352 с.

10. Майхрович 1992 – Майхрович, А.С. Поиск истинного бытия человека: Из истории философии и культуры Беларуси/А.С. Майхрович. - Минск: Наука и техника, 1992.- 247 с.

11. Майхрович 1997 – Майхрович, А.С. Становление нравственного сознания: Из истории духовной культуры Беларуси/А.С. Майхрович.- Мінск: Беларус. Кнігазбор, 1997.- 205 с.

12. Мікуліч 1996 – Мікуліч, Т.М. Мова і этнічная самасвядомасць/Т.М. Мікуліч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – 159 с.

13. Очерки истории 1996 - Очерки истории науки и культуры Беларуси IX-нач.XX вв/А.С. Майхрович [и др.].- Минск, 1996.

14. Очерки истории 1973 - Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.)/В.М. Конон [и др.]; - Минск: Наука и техника, 1973. - 557 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. Падокшын 1990 - Падокшын, С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі/С.А. Падокшын.- Мінск: Навука і тэхніка, 1990.- 285 с.

16. Падокшын 2003 – Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры/С.А. Падокшын.- Мінск: Беларуская навука , 2003.- 316 с.

17. Піліпенка 1995 – Піліпенка, М.Ф. Паходжанне беларускага народа/М.Ф. Піліпенка. – Мінск, 1995. – 38 с.

18. Прокошина 1991 – Прокошина, Е.С. Казимир Лыщинский/Е.С. Прокошина, А.Я. Цукерман/Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в./В.В. Дубровский [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – С. 174-190.

19. Старостенко 2005 – Старостенко, В.В. Общественная и философская мысль в Беларуси X-XVII вв./В.В. Старостенко.- Могилёв: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005.- 216 с.

20. Трубачев 2003 – Трубачев, О.Н. Этногенез и культура древнейших славян: Лингвистич. исследования/О.Н. Трубачев; отв. ред. Н.И. Толстой. – 2-е изд., доп. М.: Наука, 2003. – 489 с.

21. Философская и общественно-политическая мысль 1987 - Философская и общественно-политическая мысль Беларуси и Литвы. Дооктябрьский период. - Минск: Наука и техника, 1987.- 231с.

22. Шпілеўскі 2010 – Шпілеўскі, П.М. Беларусь у абрадах і казках/П.М. Шпілеўскі//Пер. на бел. мову А. Вашчанкі. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2010. – 304 с.

23. Янин 1998 – Янин, В.Л. Новгород и Литва. Пограничные ситуации XIII – XV вв./В.Л. Янин. – М.: МГУ, 1998. – 212 с.

24. Янушкевіч 2007 – Янушкевіч, А.М. Вялікае княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558 – 1570 гг./А.М. Янушкевіч. – Мінск: Медисонт, 2007 – 356 с.

25. Яскевіч 2001 – Яскевіч, А. Падзвіжнікі і святыні: Духоўная культура Старажытнай Беларусі/А. Яскевіч. – Мінск: Полымя, 2001.- 368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5.5. Дадатковая літаратура**

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры 2005 – Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI- першая палавінаXVIII ст.: Зборнік/НАН Беларусі; Ін-т літаратуры імя Я. Купалы.- 2-е выд. выпр.- Мінск: Бел. навука, 2005.- 101 с.

2. Беларускія летапісы 1997 – Беларускія летапісы і хронікі: пер. са старажытнарускай, старабеларускай і польск./уклад. У. Арлова.- Мінск: Беларус. кнігазбор, 1997.- 432 с.

3. Из истории философской и общественно-политической мысли 1962 - Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии//Избр. произв. XVI- нач. XIXв./под общ. ред. В.А. Сербента [и др.].- Минск: Изд-во АН БССР, 1962.- 524 с.

4. Мысліцелі і асветнікі Беларусі 1995 – Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыкл. давед./Беларус. энцыкл.; гал. рэд. Б.І. Сачанка [і інш].- Мінск: Бел. Эн., 1995.- 671 с.

5. История общественной и философской мысли в Беларуси 2009 - История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха средневековья: Хрестоматия; пособие/Сост. В.В. Старостенко.- Могилёв, 2009.

6. История общественной и философской мысли в Беларуси 2010 - История общественной и философской мысли в Беларуси: раннее и развитое Возрождение: Хрестоматия; пособие/Сост. В.В. Старостенко.-
Могилёв, 2010.

7. Памятники 1991 – Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в./В.В. Дубровский [и др.]. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 319 с.

8. Статут 2002 – Статут Вялікага княства Літоўскага 1588/пер. на бел. мову А.С. Шагун. – Мінск: Беларусь, 2002. – 207 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Ширяев 1991 – Ширяев, Е.Е. Беларусь: Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах/Е.Е. Ширяев. – Минск: Наука и техника, 1991 – 119 с.

10. Этнаграфія Беларусі 1989 – Этнаграфія Беларусі: Энцыкл./Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСэ, 1989.- 575 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ